The Holy See

ЭНЦЫКЛІКА

***DILEXIT NOS***

СВЯТОГА АЙЦА

**ФРАНЦІШКА**

АБ ЧАЛАВЕЧАЙ І БОСКАЙ ЛЮБОВІ
СЭРЦА ЕЗУСА ХРЫСТА

(пераклад Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў Касцёла Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі)

1. «Палюбіў нас», – кажа св. Павел, маючы на ўвазе Хрыста (Рым 8, 37), каб мы адкрылі, што ад гэтай любові нішто «не зможа адлучыць нас» (Рым 8, 39). Павел гаворыць з упэўненасцю, бо сам Хрыстус запэўніў сваіх вучняў: «Я палюбіў вас» (Ян 15, 9.12). Ён таксама сказаў нам: «Я ж назваў сябрамі вас» (Ян 15, 15). Яго адкрытае Сэрца апярэджвае нас і чакае, не ставячы ніякіх умоў і патрабаванняў дзеля таго, каб любіць нас і прапанаваць сваё сяброўства: «Ён сам палюбіў нас» (1 Ян 4, 10). Праз Езуса «мы пазналі, і паверылі ў любоў, якую мае да нас Бог» (1 Ян 4, 16).

## І. ЗНАЧЭННЕ СЭРЦА

2. Сімвал сэрца часта выкарыстоўваецца, каб паказаць любоў Езуса Хрыста. Некаторыя задаюцца пытаннем, ці ён яшчэ мае нейкае праўдзівае значэнне ў наш час. Але менавіта цяпер, калі мы адчуваем спакусу павярхоўнага жыцця, паспешліва кідаючыся ад адной рэчы да другой, нават не ведаючы чаму, і ў выніку становімся ненасытнымі спажыўцамі, нявольнікамі механізмаў рынку, які не цікавіцца сэнсам нашага існавання, нам трэба

аднавіць важнасць і значэнне сэрца [1].

ШТО МЫ МАЕМ НА ЎВАЗЕ, КАЖУЧЫ «СЭРЦА»?

3. У класічнай грэцкай мове тэрмін *kardia* азначае ўнутраную частку чалавека, жывёл і раслін. У Гамера – гэта не толькі асяродак цела, але таксама душы, гэта духоўны цэнтр чалавека. У «Іліядзе» думкі і пачуцці нараджаюцца ў сэрцы і цесна спалучаны між сабой [2]. Сэрца выступае як цэнтр жаданняў і месца, дзе прымаюцца важныя рашэнні [3]. У Платона сэрца выконвае ў пэўнай ступені «сінтэзуючую» функцыю, злучаючы рацыянальныя і інстынктыўныя аспекты кожнага чалавека, паколькі імпульсы як вышэйшых здольнасцяў, так і пачуццёвых прыхільнасцяў перадаюцца па венах, якія сыходзяцца ў сэрцы [4]. Такім чынам, са старажытных часоў мы ўсведамлялі важнасць таго, што чалавек – не сума розных здольнасцяў, але свет душы і цела, з агульным цэнтрам, які надае сэнс і кірунак усяму, што перажывае чалавек.

4. Біблія кажа, што «слова Божае жывое і дзейснае [...], здольнае судзіць думкі і намеры сэрца» (Гбр 4, 12). Так яна распавядае пра стрыжань, сэрца, схаванае за тым, што знешняе, нават за павярхоўнымі думкамі, якія бянтэжаць нас. Вучні з Эмаус падчас свайго таямнічага падарожжа з уваскрослым Хрыстом перажывалі боль, замяшанне, адчай і расчараванне. Аднак, па-над гэтым усім і насуперак усяму, штосьці адбывалася глыбока ўнутры: «Ці не ж не палала ў нас сэрца нашае, калі Ён размаўляў з намі ў дарозе?» (Лк 24, 32).

5. Сэрца – гэта і месца шчырасці, дзе нельга ашукаць і ўвесці ў зман. Звычайна яно паказвае нашыя праўдзівыя інтэнцыі, тое, што мы на самай справе думаем, у што верым і чаго прагнем, «сакрэты», якія нікому не адкрываем, адным словам, нашую голую праўду. Тут няма таго, што бачнае або ілюзорнае, а толькі тое, што аўтэнтычнае, сапраўднае, дарэшты асабістае. Таму Даліла пыталася ў Самсона, які не адкрыў ёй сакрэт сваёй сілы: «Як можаш ты казаць, што любіш мяне, калі сэрца тваё не са мною?» (Суд 16, 15). Толькі калі ён выявіў сваю таямніцу, яна «ўбачыла, што ён адкрыў ёй усё сваё сэрца» (Суд 16, 18).

6. Гэтая праўда кожнага чалавека часта хаваецца пад вялікай колькасцю «лістоты», так што складана мець пэўнасць у пазнанні самога сябе і тым больш у пазнанні іншага чалавека: «Больш падманлівае за ўсё і невылечнае – сэрца. Хто ж пазнае яго?» (Ер 17, 9). Тады мы разумеем, чаму кніга Прыпавесцяў раіць нам: «Усялякім наглядам сцеражы сэрца сваё, бо з яго жыццё ўзнікае. Адхілі ад сябе крывадушны язык, і няхай будуць далёка ад цябе шкодныя вусны» (4, 23-24). Маскі, прытворства і падман руйнуюць і скажаюць сэрца. Шматлікіх спробы паказацца кімсьці ці зрабіць уражанне – гэта ўсё разыгрываецца ў сэрцы, у тым месцы, дзе не мае значэння, што мы дэманструем ці што ўтойваем, бо там мы з’яўляемся самімі сабой. І ў гэтым аснова любога надзейнага плана на жыццё, бо нічога сапраўднага нельга пабудаваць без сэрца. Уяўнасць і ашуканства вядуць толькі да пусткі.

7. У якасці метафары дазвольце мне нагадаць тое, што я ўжо казаў у іншым месцы: «Я памятаю, што ў дзяцінстве на запусты нашая бабуля рабіла нам хрушчы. Цеста для іх яна раскатвала вельмі тонка. Потым кідала яго ў алей, і тое цеста надзімалася, расло... А калі мы пачыналі есці, унутры яно было пустое. Тыя хрушчы на дыялекце называліся «bugie» (падманы»). І бабуля сама патлумачыла нам прычыну: «Гэтыя хрушчы – як падман, здаюцца вялікімі, а ўнутры ў іх нічога няма, няма ніякай праўды, няма нічога істотнага» [5].

8. Замест таго, каб шукаць павярхоўнага задавальнення і граць ролю перад людзьмі, лепш паразважаць над важнымі пытаннямі: хто я на самай справе, чаго шукаю, які сэнс хачу надаць свайму жыццю, выбару або дзейнасці, дзеля чаго і з якой мэтай я існую на гэтым свеце, як ацаню сваё жыццё, калі яно наблізіцца да канца, які сэнс мне хацелася б адчуваць ва ўсім, што перажываю, кім я хачу быць перад іншымі, хто я перад Богам? Гэтыя пытанні вядуць нас у сэрца.

ВЯРНУЦЦА ДА СЭРЦА

9. У гэтым «зменлівым» свеце трэба зноў гаварыць пра сэрца, каб дасягнуць таго месца, дзе кожны чалавек, любой катэгорыі і стану, стварае свой сінтэз, дзе знаходзіцца крыніца і корань усіх іншых людскіх сілаў, перакананняў, захапленняў і рашэнняў. Але мы існуём у грамадстве масавых спажыўцоў, якія жывуць з дня на дзень і падпарадкоўваюцца рытму і шуму тэхналогій, без асаблівай цярплівасці да працэсаў, неабходных для духоўнага жыцця. У сучасным грамадстве чалавек «рызыкуе страціць цэнтр – цэнтр сябе» [6]. «Сучасны чалавек, насамрэч, часта адчувае сябе разгубленым, падзеленым, амаль пазбаўленым унутранага прынцыпу, які надае адзінства і гармонію яго існаванню і дзейнасці. На жаль, вельмі распаўсюджаныя мадэлі паводзінаў абвастраюць рацыянальна-тэхналагічнае вымярэнне ці, наадварот, інстынктыўнае» [7]. Няма месца для сэрца.

10. Сёння шмат абмяркоўваецца праблема сучаснага грамадства, але дэвальвацыя ўнутранага цэнтру чалавека – сэрца – мае больш доўгую гісторыю: мы знаходзім яе ўжо ў грэцкім і дахрысціянскім рацыяналізме, у постхрысціянскім ідэалізме і ў розных формах матэрыялізму. Антрапалогія адводзіла сэрцу мала месца, а для вялікай філасофскай думкі паняцце сэрца было чужым. Перавага адддавалася іншым катэгорыям, такім як розум, воля ці свабода. Вызначэнне тэрміну сэрца недакладнае, канкрэтнага месца ў чалавечым жыцці яму не прызначана. Магчыма, па той прычыне, што яго няпроста змясціць сярод «ясных і выразных» ідэй або з-за складанасці працэсу самапазнання: здавалася б, самая блізкая нам рэчаіснасць з'яўляецца адначасова і самай невядомай. Верагодна, таму, што нават сустрэча з іншым не абавязкова з'яўляецца спосабам сустрэчы з самім сабой, паколькі ў нашых мадэлях мыслення дамінуе нездаровы індывідуалізм. Многія адчувалі сябе ў бяспецы, будуючы свае сістэмы мыслення ў больш кантраляванай сферы інтэлекту і волі. І, не знайшоўшы месца для сэрца, адрознага ад чалавечых здольнасцяў і імпульсаў, разгледжаных паасобку, не здолела развіцца ідэя асабістага цэнтра, дзе любоў – адзіная

рэчаіснасць, якая ўрэшце можа аб’яднаць усе астатнія.

11. Калі сэрца абясцэньваецца, то адначасова абясцэньваецца і тое, што значыць маўленне ад сэрца, дзеянне з сэрцам, сталенне і аздараўленне сэрца. Калі не шануем спецыфікі сэрца, то губляем адказы, якія не ў стане даць адзін толькі розум, губляем сустрэчу з іншымі, губляем паэзію. А таксама губляем гісторыю і сваё мінулае, бо сапраўдная асабістая прыгода адбываецца, пачынаючы з сэрца. У канцы жыцця толькі гэта будзе мець значэнне.

12. Важна пацвердзіць, што ў нас ёсць сэрца, што нашае сэрца суіснуе з іншымі сэрцамі, якія дапамагаюць яму быць на «Ты». Паколькі мы не можам шырока разгарнуць гэтую тэму, возьмем персанажа рамана Дастаеўскага – Мікалая Стаўрогіна [8]. Раман Гуардзіні паказвае яго як само ўвасабленне зла, таму што яго галоўнай характарыстыкай з’яўляецца адсутнасць сэрца: «У Стаўрогіна няма сэрца; таму яго дух халодны і пусты, а цела атручана лянотай і “звярынай” пачуццёвасцю. Таму ён не можа ні з кім блізка пазнаёміцца, і ніхто не сустракаецца з ім па-сапраўднаму. Бо толькі сэрца стварае шчырую, сапраўдную блізкасць паміж дзвюма істотамі. Толькі сэрца ўмее прыняць і прапанаваць гасціннасць. Глыбока асабістыя дзеянні – гэта сфера сэрца. Але Стаўрогін далёкі. […] Бясконца далёкі нават ад самога сябе, бо чалавек можа ўвайсці ў сябе толькі праз сэрца, а не розум. Не можа чалавек увайсці розумам у сваё нутро. Таму, калі сэрца не жывое, чалавек застаецца сам сабе чужым» [9].

13. Усе дзеянні трэба падпарадкаваць «палітычнаму валадарству» сэрца, каб агрэсія і апантаныя жаданні знайшлі супакой у большым дабры, якое прапануе сэрца, і ў сіле, якую яно мае супраць зла; каб нават розум і воля аддаліся яму на службу, адчуваючы і смакуючы праўду, а не прагнучы авалодаць ёй, як часта робяць некаторыя навукі; каб воля жадала большага дабра, якое ведае толькі сэрца, і каб нават уяўленне і пачуцці дазволілі б утаймаваць сябе біццём сэрца.

14. Можна сказаць, што ў канчатковым выніку «я» і ёсць маім сэрцам, бо яно вылучае мяне, фарміруе маю духоўную ідэнтычнасць і яднае з іншымі людзьмі. Алгарытм, які працуе ў лічбавым свеце, паказвае, што нашыя думкі і рашэнні волі значна больш «стандартныя», чым мы маглі б падумаць. Яны лёгка прадказальныя і імі лёгка маніпуляваць. З сэрцам усё іначай.

15. Для філасофіі і тэалогіі, якія імкнуцца дасягнуць агульнага сінтэзу, гэтае слова таксама мае вялікае значэнне. На самай справе слова «сэрца» не можа быць да канца растлумачана ні біялогіяй, ні псіхалогіяй, ні антрапалогіяй, ні любой іншай навукай. Гэта адно з тых першапатковых словаў, «якія акрэсліваюць рэчаіснасць, што датычыць чалавека ў яго цэласці як цялесна-духоўнай асобы» [10]. Такім чынам, біёлаг, які выказваецца пра сэрца, не з’яўляецца большым «рэалістам», паколькі ён бачыць толькі частку, а не цэлае, хоць і больш рэальна. Таксама і абстрактная мова не можа мець таго ж канкрэтнага і агульнага

значэння. Калі «сэрца» вядзе нас да найглыбейшага асяродка нашай асобы, яно таксама дазваляе нам распазнаць сябе цэласна, а не толькі ў нейкім адным аспекце.

16. З іншага боку, гэтая ўнікальная моц сэрца дапамагае нам зразумець, чаму кажуць, што калі сэрцам спасцігнем рэчаіснасць, то зможам спазнаць яе лепей і паўней. Гэта непазбежна вядзе нас да любові, на якую здольнае сэрца, бо «любоў – самы патаемны фактар рэчаіснасці» [11]. Для Хайдэгера, у інтэрпрэтацыі аднаго сучаснага мысляра, філасофія пачынаецца не з канцэпцыі або ўпэўненасці, а з эмацыйнага хвалявання: «Думка павінна эмацыйна ўзрушыцца перад тым, як пачне працаваць з паняццямі або падчас працы над імі. Без глыбокіх эмоцый мысленне не можа пачацца. Першым разумовым вобразам былі б мурашкі па скуры. Першае, што прымушае нас задумацца і задаваць пытанні, гэта глыбокая эмоцыя. Філасофія заўсёды ўзнікае ў фундаментальным стане духа (*Stimmung*) [12]. І тут з’яўляецца сэрца, «гаспадар душэўных станаў, дзейнічае як “вартаўнік настрою”. “Сэрца” неметафарычна прыслухоўваецца да “ціхага голасу” быцця, дазваляючы яму гартаваць і вызначаць сябе» [13].

СЭРЦА, ЯКОЕ ЯДНАЕ ФРАГМЕНТЫ

17. У той жа час сэрца робіць магчымымі ўсе сапраўдныя сувязі, бо адносіны, не сфармаваныя сэрцам, не могуць пераадолець раз’яднанасць, выкліканую індывідуалізмам. Дзве манады могуць наблізіцца адна да адной, але яны ніколі не злучацца па-сапраўднаму. Грамадства, у якім усё больш пануюць нарцысізм і эгацэнтрызм, – гэта «анты-сэрца». У рэшце рэшт, дойдзе да «страты жадання», бо, калі іншы чалавек знікае з гарызонту, мы замыкаемся ў саміх сабе, губляючы здольнасць да здаровых адносінаў [14]. У выніку мы таксама становімся няздольнымі прыняць Бога. Як сказаў бы Хайдэгер, каб прыняць тое, што боскае, нам трэба пабудаваць «дом для гасцей» [15].

18. Такім чынам, мы бачым, што ў сэрцы кожнага чалавека існуе парадаксальная сувязь паміж пачуццём уласнай годнасці і адкрытасцю на іншых, паміж сустрэчай з сабой і гатоўнасцю аддаваць сябе іншым. Чалавек становіцца сабой толькі тады, калі набывае здольнасць распазнаваць іншага і сустракаецца з іншым, які здольны распазнаць і прыняць сваю ўласную тоеснасць.

19. Сэрца таксама здольнае яднаць і гарманізаваць нашую асабістую гісторыю, якая можа здавацца безнадзейна разбітай на тысячы кавалкаў і ў якой, тым не менш, усё можа мець сэнс. Евангелле адлюстроўвае гэта ў позірку Марыі, якая глядзела сэрцам. Яна ўмела весці дыялог з каштоўнымі перажываннямі, абдумваючы іх у сэрцы, прысвячаючы ім час: разважала і захоўвала іх у памяці. Лепшы выраз таго, як думае сэрца, можна знайсці ў двух фрагментах Евангелля паводле св. Лукі пра тое, што Марыя «захоўвала (*synetérei*) усе гэтыя словы, разважаючы (*symbállousa*) у сэрцы сваім» (Лк 2, 19; пар. 2, 51). Грэцкі дзеяслоў *symbállein*, ад якога паходзіць слова «сімвал», азначае «разважаць», злучаць дзве рэчы ў

розуме і даследваць іх у дыялогу з самім сабой. У вершы Лк 2, 51 дзеяслоў *dietérei* азначае «захоўваць з клопатам», а тым, што Марыя верна захавала, была не толькі «сцэна», якую бачыла, але і тое, чаго яна яшчэ не разумела, а яно, тым не менш, існавала і жыло – у чаканні, калі ўсё будзе складзена разам у яе сэрцы.

20. У наш век штучнага інтэлекту мы не можам забываць, што паэзія і любоў неабходныя для выратавання чалавецтва. Ніякі алгарытм ніколі не здолее змясціць у сабе, напрыклад, той момант з дзяцінства, які мы ўспамінаем з пяшчотай, і які, нягледзячы на бег часу, усё яшчэ паўтараецца ў кожным кутку планеты. Я думаю пра тое, як мы ўпершыню спрабавалі зляпіць край піражкоў з дапамогай відэльца, калі гатавалі разам з мамамі ці бабулямі. Вось, той момант кулінарнага навучання, дзесьці паміж дзіцячай гульнёй і дарослым жыццём, калі мы адчулі адказнасць за працу і дапамогу іншай асобе. Поруч з відэльцам я мог бы згадаць тысячы іншых дробязяў, якія ўтвараюць біяграфію кожнага з нас: смех у адказ на нашыя жарты, малюнак на аркушы, прыкладзеным да шыбы, першы футбольны матч, згуляны з анучным мячом, чарвячкоў, назбіраных у абутковую скрынку, кветку, засушаную між кніжных старонак, клопат пра птушачку, якая выпала з гнязда, жаданне, якое мы загадалі, абрываючы пялёсткі рамонка. Усе гэтыя дробязі, звычайныя самі па сабе, але незвычайныя для нас, ніколі не будуць ахоплены алгарытмамі. Бо відэлец, жарты, акно, мяч, абутковая скрынка, кніга, птушка, кветка жывуць пяшчотай, якая захоўваецца ў памяці сэрца.

21. Ядро кожнага чалавека, яго найбольш асабісты цэнтр, – гэта не цэнтр толькі душы, але ўсяго чалавека ў яго непаўторнай ідэнтычнасці, якая складаецца з душы і цела. Усё злучана ў сэрцы, якое можа быць месцам любові з усімі духоўнымі, псіхічнымі і нават фізічнымі кампанентамі. Па сутнасці, калі ў ім пануе любоў, чалавек дасягае сваёй ідэнтычнасці поўным і ясным спосабам, бо кожны чалавек быў створаны перш за ўсё для любові. У глыбіні істоты людзі створаны, каб любіць і быць любімымі.

22. Па гэтай прычыне, гледзячы, як новыя войны пачынаюцца адна за адной, пры саўдзеле, патуранні або абыякавасці іншых краін, або з-за звыклай барацьбы за ўладу вакол асобных інтарэсаў, можна падумаць, што сусветнае грамадства губляе сэрца. Дастаткова паглядзець і паслухаць пажылых жанчын, – абодва бакі канфлікту, – якія трапілі ў няволю гэтых разбуральных канфліктаў. Разрываецца сэрца, калі бачым, як яны плачуць па сваіх забітых унуках, або слухаем, як яны хацелі б памерці, бо страцілі дом, дзе пражылі свой век. Яны так часта былі ўзорам мужнасці і трываласці ў цяжкім і самаахвярным жыцці, а цяпер, калі дасягнулі апошняга этапу свайго існавання, не атрымліваюць заслужанага спакою, але перажываюць пакуты, страх і абурэнне. Ускладанне віны на іншых не вырашае гэтай ганебнай драмы. Выгляд заплаканых бабуль, якія больш не лічыцца скандалам, з’яўляецца прыкметай бяздушнага свету.

23. Калі кожны з нас думае, шукае, медытуе над сваім быццём і тоеснасцю або аналізуе найважнейшыя пытанні, разважае пра сэнс жыцця і шукае Бога, нават калі адчувае асалоду

ад таго, што спазнаў штосьці праўдзівае, – усё гэта павінна знайсці сваю кульмінацыю ў любові. Калі чалавек любіць, то адчувае, што ведае, дзеля чаго і з якой мэтай жыве. Тады ўсё прыходзіць у стан адзінства і гармоніі. Пагэтаму ў разважаннях над таямніцай саміх сябе і свайго жыцця напэўна найбольш важным пытаннем, якое кожны можа задаць сабе, будзе: «Ці я маю сэрца»?

ПОЛЫМЯ

24. Усё вышэйсказанае мае наступствы для духоўнасці. Напрыклад, тэалогія «Духоўных практыкаванняў» св. Ігнацыя Лаёлы абапіраецца на прынцып *affectus*. Дыскурсіўнае вымярэнне будуецца на фундаментальнай волі (з усёй сілай сэрца), якая дае энергію і рэсурсы выканаць задачу рэформы жыцця. Правілы і кампазіцыі месца, якія ўводзіць Ігнацый, функцыянуюць на аснове адрознага ад іх «фундамента», інакш кажучы, невядомага сэрца. Мішэль дэ Сэрто падкрэслівае, што «рухі», пра якія кажа св. Ігнацый, – гэта ўваходжанне жадання Бога і жадання сэрца чалавека ў вызначаны парадак разважанняў. Штосьці нечаканае і да гэтай пары неспазнанае пачынае гаварыць у сэрцы чалавека, пранікае скрозь паверхню вядомага і супярэчыць яму. Гэта пачатак новага працэсу «гарманізацыі жыцця», які пачынаецца ў сэрцы. Не ідзе гаворка пра рацыянальныя дыскурсы, якія трэба ўводзіць у практыку штодзённага жыцця, быццам афектыўнасць і практыка могуць быць проста наступствамі і залежаць ад дакладных ведаў [16].

25. Там, дзе мысленне філосафа спыняецца, сэрца веруючага любіць, ушаноўвае, просіць прабачэння і прапануе служэнне у тым месцы, якое Пан дае яму выбраць, каб ісці за Ім. Тады ён разумее, што з’яўляецца Божым «ты» і што можа быць «я», паколькі Бог для яго – гэта «Ты». Сапраўды, толькі Пан прапануе стаўленне да нас на «ты» заўсёды і назаўжды. Прыняць Яго сяброўства – гэта справа сэрца, тое, што фарміруе нас як асобаў у поўным сэнсе гэтага слова.

26. Святы Банавэнтура казаў, што па вялікім рахунку трэба прасіць «не святла, але агню» [17]. Ён вучыў, што «вера ў розуме прысутнічае настолькі, што абуджае пачуцці. Напрыклад: пазнанне таго, што Хрыстус памёр за нас, не застаецца веданнем, але абавязкова нараджае прыхільнасць, любоў» [18]. У такой перспектыве св. Джон Генры Ньюман узяў за дэвіз фразу *«Cor ad cor loquitur»*, бо, па-за любой дыялектыкай, Пан збаўляе нас, прамаўляючы да нашага сэрца са свайго Найсвяцейшага Сэрца. Па той жа логіцы, для яго, выбітнага мысляра, месцам найглыбейшай сустрэчы з сабой і з Панам было не чытанне, не разважанне, але малітоўны дыялог – сэрца да сэрца – з жывым і прысутным Хрыстом. Вось чаму Ньюман знайшоў у Эўхарыстыі жывое Сэрца Езуса, здольнае вызваляць, надаваць сэнс кожнаму моманту і напаўняць чалавека сапраўдным спакоем: «Найсвяцейшае, перапоўненае любоўю Сэрца Езуса, Ты, схаванае ў святой Эўхарыстыі, увесь час б’ешся для нас. (…) Таму я праслаўляю Цябе з усёй сваёй любоўю і пашанай, з гарачай прыхільнасцю, з самай пакорнай і рашучай воляй. О, мой Божа, калі Ты дазваляеш мне

прымаць Цябе, спажываць Цябе і піць, і на нейкі час прабываеш ува мне, учыні, каб маё сэрца білася згодна з Тваім. Ачысці яго ад усяго зямнога, усяго ганарыстага і пачуццёвага, усяго жорсткага і лютага, ад усякага скажэння, усякага бязладдзя, усякай змярцвеласці. Напоўні яго Сабою настолькі, каб ні падзеі дня, ні абставіны эпохі не маглі ўстрывожыць яго, але каб у любові да Цябе і страху перад Табой яно мела спакой» [19].

27. У прысутнасці жывога Сэрца Езуса наш розум, асветлены Духам, спасцігае словы Езуса, а наша воля імкнецца здзяйсняць іх. Але ўсё ж, гэта магло б застацца формай самадастатковага маралізму. Слуханне і смакаванне Пана, а таксама шанаванне Яго – гэта справа сэрца. Толькі сэрца можа абудзіць іншыя здольнасці і схільнасці, а таксама ўсю нашую асобу да паставы глыбокай павагі і паслухмянасці Пану ў любові.

## СВЕТ МОЖА ЗМЯНІЦЦА, ПАЧЫНАЮЧЫ З СЭРЦА

28. Толькі пачынаючы з сэрца, нашыя супольнасці здолеюць аб’яднаць і супакоіць розум і волю розных людзей, каб Дух мог кіраваць намі як сеткай братоў, бо паяднанне – таксама заданне сэрца. Сэрца Хрыста – гэта «экстаз», шлях выйсця, дар і сустрэча. У Ім мы здольныя ствараць здаровыя і шчаслівыя адносіны і будаваць Валадарства любові і справядлівасці ў гэтым свеце. Нашае сэрца, з’яднанае з сэрцам Хрыста, здольнае на гэты сацыяльны цуд.

29. Сур’ёзнае стаўленне да сэрца мае сацыяльныя наступствы. Як вучыць Другі Ватыканскі Сабор, «кожны з нас, маючы перад вачыма ўвесь свет і заданні, якія можам разам выканаць дзеля таго, каб чалавецтва накіроўвалася сёння да лепшага, павінен змяніць сваё сэрца» [20]. Таму што «разлад, ад якога пакутуе сучасны свет, звязаны з больш глыбокім разладам, які караніцца ў сэрцы чалавека» [21]. Сутыкнуўшыся з драмамі свету, Сабор запрашае нас вярнуцца да сэрца. Тлумачыць, што «чалавек не памыляецца, калі лічыць сябе вышэйшым за цялесныя рэчы (…). Сваім унутраным светам чалавек пераўзыходзіць увесь свет рэчаў, а дасягае гэтай унутранай глыбіні, калі звяртаецца да свайго сэрца, дзе яго чакае Бог, які даследуе сэрца (пар. 1 Сам 16, 17; Ер 1, 10), і дзе ён сам перад вачыма Бога вырашае ўласны лёс» [22].

30. Сутнасць не ў тым, каб празмерна спадзявацца на сябе. Будзем асцярожныя: заўважым, што нашае сэрца не самадастатковае; яно крохкае і зраненае. Яно мае анталагічную годнасць, але ў той жа час змушана шукаць больш годнага жыцця [23]. Другі Ватыканскі Сабор таксама кажа, што «евангельская закваска абуджала і абуджае ў сэрцы чалавека неўтаймаванае патрабаванне годнасці» [24], але, каб жыць у адпаведнасці з гэтай годнасцю, нам недастаткова ведаць Евангелле або механічна выконваць тое, што яно кажа. Нам патрэбна дапамога Божай любові. Звернемся да Сэрца Хрыста, цэнтра Яго істоты, гэтай распаленай печы Божай і чалавечай любові і найбольшай паўнаты, якую можа дасягнуць чалавек. Там, у гэтым Сэрцы, мы нарэшце пазнаём сябе і вучымся любіць.

31. У рэшце рэшт, менавіта Найсвяцейшае Сэрца з’яўляецца тым прынцыпам, які яднае рэчаіснасць, бо «Хрыстус – сэрца свету; Яго Пасха смерці і ўваскрасення з’яўляецца цэнтрам гісторыі, якая дзякуючы Яму становіцца гісторыяй збаўлення» [25]. Усе стварэнні «з намі і праз нас ідуць да канчатковай мэты, якой ёсць Бог у трансцэндэнтнай паўнаце, дзе ўваскрослы Хрыстус усё ахоплівае і асвятляе» [26]. Стоячы перад Сэрцам Хрыста, прашу Пана, каб зноў зліціваўся над гэтай параненай зямлёй, на якой Ён пажадаў пасяліцца як адзін з нас. Няхай Ён пральле скарбы свайго святла і любові, каб наш свет, ідучы наперад, нягледзячы на войны, сацыяльна-эканамічную няроўнасць, спажывецтва і антычалавечае выкарыстанне тэхналогій, мог аднавіць самае важнае і неабходнае – сэрца.

## II. ЖЭСТЫ І СЛОВЫ ЛЮБОВІ

32. Сэрца Хрыста, як сімвал самай глыбокай і асабістай крыніцы Ягонай любові да нас, з’яўляецца жывым ядром першапачатковага абвяшчэння Евангелля, вытокам нашай веры, крыніцай, якая напаўняе жыццём хрысціянскія перакананні.

### ЖЭСТЫ, ЯКІЯ АДЛЮСТРОЎВАЮЦЬ СЭРЦА

33. Хрыстус не вельмі хацеў тлумачыць, як Ён любіць нас, але паказваў сваімі жэстамі. Назіраючы за Ягонымі дзеяннямі, мы можам даведацца, як Ён ставіцца да кожнага з нас, нават калі разуменне даецца цяжка. Пойдзем і паглядзім, дзе нашая вера можа распазнаць Яго: у Евангеллі.

34. Евангелле кажа, што Езус «прыйшоў да сваіх» (Ян 1, 11). Мы Ягоныя, бо Ён не лічыць нас чужымі. Ён лічыць нас сваёй уласнасцю, якой апякуецца з клопатам і любоўю. Ён ставіцца да нас як да сваіх. Гэта не азначае, што мы Ягоныя нявольнікі, і Ён сам гэта адмаўляе: «Я ўжо не называю вас слугамі» (Ян 15, 15). Хутчэй Ён прапануе ўзаемнае сяброўства. Ён прыйшоў, пераадолеў усе адлегласці, стаў такім блізкім да нас, як самыя простыя і штодзённыя рэчы. На самай справе, у Яго ёсць іншае імя – «Эмануэль», што азначае «Бог з намі», Бог – частка нашага жыцця, які жыве сярод нас. Сын Божы ўцелавіўся і «выракся самога сябе, прыняўшы постаць слугі» (Флп 2, 7).

35. Гэта яшчэ больш відавочна, калі паглядзець на Езуса ў дзеянні. Ён шукае людзей, набліжаецца да іх, заўсёды адкрыты на сустрэчы. Мы сузіраем Яго, калі Ён спыняецца, каб паразмаўляць з самаранкай каля студні, да якой яна хадзіла па ваду (пар. Ян 4, 5-7). Мы бачым, як цёмнай ноччу Ён сустракаецца з Нікадэмам, які баяўся быць заўважаным побач з Езусам днём (пар. Ян 3, 1-2). Дзівімся, калі Ён не бянтэжыцца і дазваляе чужаложніцы абмыць Яму ногі (пар. Лк 7, 36-50); калі кажа чужаложніцы наўпрост: «Я не асуджаю цябе» (Ян 8, 11); або калі сутыкаецца з абыякавасцю вучняў і ласкава пытаецца ў сляпога пры

дарозе: «Што хочаш, каб Я зрабіў табе?» (Мк 10, 51). Хрыстус паказвае, што Бог – гэта блізкасць, спачуванне і пяшчота.

36. Калі Ён кагосьці аздараўляў, то імкнуўся падысці бліжэй: «Езус працягнуў руку, дакрануўся да яго» (Мц 8, 3), «дакрануўся да яе рукі» (Мц 8, 15), «дакрануўся да іхніх вачэй» (Мц 9, 29). І нават спыняўся, каб аздаравіць хворых сваёй слінай (пар. Мк 7, 33), як маці, каб яны не лічылі Яго чужым. Таму што «Пан ведае цудоўную навуку пяшчоты. Пяшчота Бога: Ён любіць нас не на словах, Ён набліжаецца і праз блізкасць адорвае нас любоўю з усёй магчымай пяшчотай» [27].

37. Паколькі нам цяжка даецца давер, бо мы спазналі столькі хлусні, агрэсіі і расчараванняў, Ён шэпча нам на вуха: «Будзь адважным, сыне» (Мц 9, 2); «Будзь адважнай, дачка» (Мц 9, 22). Ён заахвочвае нас пераадолець страх і ўсвядоміць, што з Ім мы нічога не страцім. Недаверліваму Пятру «Езус адразу ж працягнуў руку, схапіў яго і сказаў: […] "Чаму засумняваўся ты?" (Мц 14, 31). Не бойся. Дазволь Яму падысці бліжэй і сесці побач. Мы можам сумнявацца ў людзях, але не ў Ім. І не спыняйся з-за сваіх грахоў. Памятай, што многія грэшнікі «занялі месца за сталом з Ім» (Мц 9, 10), а Ён не абураўся ніводным. Рэлігійныя эліты наракалі і ставіліся да Яго як да «абжоры і п'яніцы, прыяцеля мытнікаў і грэшнікаў» (Мц 11, 19). Калі фарысеі крытыкавалі Яго за блізкасць да людзей, якіх лічылі нікчэмнымі або грэшнымі, Езус адказаў: «Міласэрнасці хачу, а не ахвяры» (Мц 9, 13).

38. Той самы Езус сёння чакае, што ты дасі Яму магчымасць асвятліць тваё жыццё, падняць цябе, напоўніць Божай моцай. Перад смерцю Ён сказаў вучням: «Не пакіну вас сіротамі, прыйду да вас. Яшчэ крыху і свет ужо не ўбачыць Мяне. Вы ж бачыце Мяне» (Ян 14, 18-19). Ён заўсёды знаходзіць нейкі спосаб аб'явіцца ў тваім жыцці, каб ты мог з Ім сустрэцца.

ПОЗІРК

39. Евангелле распавядае, як да Езуса прыйшоў багаты чалавек, поўны ідэалаў, але бяссільны змяніць сваё жыццё. І «Езус паглядзеў на яго з любоўю» (Мк 10, 21). Ці можаш уявіць сабе той момант, тую сустрэчу вачэй гэтага чалавека і Езуса? Калі Ён кліча цябе, калі запрашае на місію, то спачатку глядзіць на цябе, пранікае ў найбольшую глыбіню, бачыць і ведае ўсё, што ў табе ёсць, спыняе на табе позірк: «Калі Езус праходзіў каля Галілейскага мора, Ён убачыў двух братоў […]. Калі адтуль пайшоў далей, убачыў іншых двух братоў» (Мц 4, 18.21).

40. Многія евангельскія тэксты паказваюць нам Езуса, які ўсю сваю ўвагу прысвячае людзям, іх клопатам і пакутам. Напрыклад: «Убачыўшы натоўпы людзей, Ён змілаваўся над імі, бо яны былі знясіленыя і пакінутыя» (Мц 9, 36). Кожны раз, калі нам здаецца, што ўсе нас ігнаруюць, нікога не хвалюе, што з намі адбываецца, і ні для кога мы нічога не значым, Ён працягвае ставіцца да нас з вялікай увагай. Менавіта пра гэта Ён кажа самотнаму і

задуменнаму Натанаэлю: «Перш чым Філіп паклікаў цябе, Я бачыў цябе, калі ты быў пад смакоўніцаю» (Ян 1, 48).

41. Менавіта таму, што Ён уважлівы да нас, Ён здольны распазнаць кожны добры намер, кожны маленькі добры ўчынак. Евангелле распавядае, што Ён убачыў «адну бедную удаву, якая кідала туды [у скарбонку святыні] дзве лепты» (Лк 21, 2), і адразу ж звярнуў на яе ўвагу апосталаў. Гэтак Езус шануе дабро, якое бачыць у нас. Калі сотнік даверліва выказаў сваю просьбу, «пачуўшы гэта, Езус здзівіўся» (Мц 8, 10). Як цудоўна ведаць, што калі іншыя ігнаруюць нашыя добрыя намеры або ўчынкі, Езус не прапускае іх і нават захапляецца імі.

42. Па-чалавечы Ён навучыўся гэтаму ад Марыі, сваёй Маці. Тая, якая ўсё ўважліва разважала і «захоўвала ў сэрцы сваім» (пар. Лк 2, 19.51), разам са св. Юзафам змалку вучыла Яго быць уважлівым.

СЛОВЫ

43. Хаця ў Святым Пісанні ёсць Ягонае слова, заўсёды жывое і актуальнае, але часам Езус вядзе з намі ўнутраны дыялог, кліча і вядзе ў найлепшае месца. А найлепшае месца – гэта Ягонае Сэрца. Ён заахвочвае нас увайсці туды, дзе мы можам аднавіць сілы і спакой: «Прыйдзіце да Мяне, усе спрацаваныя і абцяжараныя, і Я супакою вас» (Мц 11, 28). Таму Ён прасіў сваіх вучняў: «Заставайцеся ўва Мне» (Ян 15, 4).

44. Словы Езуса сведчаць, што Ягоная святасць не выключала пачуццяў. У тых ці іншых абставінах словы былі выразам гарачай любові, якая церпіць за нас, узрушваецца, сумуе і нават плача. Відавочна, што Ён не заставаўся абыякавым да штодзённых клопатаў і трывог людзей, да стомленасці і голаду: «Шкада мне людзей, [...] і не маюць чаго есці [...], яны аслабнуць у дарозе, бо некаторыя з іх прыйшлі здалёк» (Мк 8, 2-3).

45. Евангелле не хавае пачуццяў Езуса да Ерузалема, умілаванага горада: «Калі Ён наблізіўся і ўбачыў горад, заплакаў над ім» (Лк 19, 41) і выказаў сваё найбольшае жаданне: «Калі б і ты ў гэты дзень пазнаў, што служыць для спакою твайго!» (19, 42). Евангелісты, часам паказваючы Яго ў моцы і славе, пішуць і пра Ягоныя глыбокія пачуцці перад абліччам смерці і болю сяброў. Перш чым сказаць, што каля магілы Лазара «Езус заплакаў» (Ян 11, 35), Евангелле спыняецца на словах, што Езус «любіў Марту, яе сястру і Лазара» (Ян 11, 5) і, убачыўшы слёзы Марыі і тых, хто прыйшоў з ёй, «сам глыбока ўзрушыўся і ўсхваляваўся» (пар. Ян 11, 33). Аповед не пакідае сумнення, што гэта быў шчыры плач, выраз унутранага хвалявання. Евангелісты таксама не хацелі ўтойваць страх Езуса перад гвалтоўнай смерцю ад рук тых, каго Ён так любіў: «ахапіў Яго страх і трывога» (Мк 14, 33), і нават сказаў ім: «Засмучана душа мая аж да смерці» (Мк 14, 34). Гэтае ўнутранае ўзрушэнне з усёй моцай выяўляецца ў крыку Укрыжаванага: «Божа Мой, Божа Мой, чаму Ты Мяне пакінуў?» (Мк 15, 34).

46. Усё сказанае, калі глядзець павярхоўна, можа здацца звычайным рэлігійным рамантызмам. Аднак тут ідзе гаворка пра самае сур’ёзнае і самае вырашальнае, што знаходзіць найбольшае выяўленне ў Хрысце, прыбітым да крыжа. Гэта найбольш вымоўнае слова любові. Не абалонка, не чысты сентымент, не духоўныя ўцёкі. Гэта любоў. Таму св. Павел, шукаючы адпаведных словаў, каб апісаць свае адносіны з Хрыстом, сказаў: «Жыву вераю ў Сына Божага, які палюбіў мяне і аддаў сябе за мяне» (Гал 2, 20). Найвялікшым перакананнем было веданне, што Бог яго любіць. Ахвяра Хрыста на крыжы гняла яго, але мела сэнс толькі таму, што было нешта яшчэ большае за тую ахвяру: «Палюбіў мяне». У той час, калі многія шукалі збаўлення, дабрабыту або бяспекі ў іншых рэлігійных прапановах, Павел, пад натхненнем Духа, здолеў зазірнуць далей і здзівіцца праўдзе найбольшай і найважнейшай: «Палюбіў мяне».

47. Цяпер, пасля сузірання Хрыста, калі мы ўбачылі, як Ягоныя дзеянні і словы дапамагаюць нам зразумець Сэрца, звернемся да разважанняў Касцёла над святой таямніцай Сэрца Пана.

## III. ВОСЬ СЭРЦА, ЯКОЕ ТАК МОЦНА ПАЛЮБІЛА

48. Набажэнства да Сэрца Хрыста не з’яўляецца пакланеннем органу, аддзеленаму ад Асобы Езуса. Мы сузіраем і ўшаноўваем усяго Езуса Хрыста, Сына Божага, які стаўся чалавекам, і гэта Ён прадстаўлены на абразах, дзе вылучана Найсвяцейшае Сэрца. Цялеснае сэрца ў дадзеным выпадку разглядаецца як прывілеяваны вобраз або знак найбольш асабістага цэнтра ўцелаўлёнага Сына і Ягонай любові, боскай і чалавечай, таму што больш, чым любая іншая частка Ягонага цела, сэрца ўяўляе сабой «натуральны знак або сімвал бязмернай любові» [28].

### АДАРАЦЫЯ ХРЫСТА

49. Вельмі важна ўсведамляць, што мы будуем адносіны з Асобай Езуса Хрыста, у сяброўстве і адарацыі, прыцягнутыя любоўю, якая прадстаўлена ў вобразе Ягонага Сэрца. Мы ўшаноўваем Яго на гэтай выяве, але адаруем толькі жывога Хрыста, у боскасці і ў чалавечнасці, каб Ягоная чалавечая і Боская любоў ахапіла нас.

50. Якой бы ні была выява, зразумела, што не яна, а жывое Сэрца Хрыста з’яўляецца аб’ектам пакланення як частка найсвяцейшага і ўваскрослага Цела, неаддзельнага ад Сына Божага, які прыняў яго назаўсёды. Сэрца адаруюць, «паколькі гэта Сэрца Асобы Слова, з якім яно непарыўна злучана» [29]. Мы не ўшаноўваем яго асобна, але падчас гэтай адарацыі Сэрца ўшаноўваем самога ўцелаўлёнага Сына, які жыве, любіць і прымае нашу любоў. Таму кожны акт любові або праслаўлення Ягонага Сэрца фактычна «сапраўды і на

самай справе адносіцца да Хрыста» [30], бо спантанна кіруецца да Яго і з’яўляецца «сімвалам і яскравым вобразам бясконцай любові Езуса Хрыста» [31].

51. Таму ніхто не павінен думаць, што гэтае набажэнства можа адлучыць або адцягнуць нас ад Езуса Хрыста і Ягонай любові. Ён спантанна і непасрэдна вядзе нас да Сябе і толькі да Сябе, заклікае да каштоўнага сяброўства, якое складаецца з дыялогу, пачуццяў, даверу і адарацыі. Хрыстус з прабітым і палаючым сэрцам – гэта той самы, хто з любові нарадзіўся ў Бэтлееме, хадзіў па Галілеі, аздараўляючы, выказваючы чуласць і міласэрнасць; гэта той, хто палюбіў нас да канца, раскрыўшы абдымкі на крыжы. У рэшце рэшт, гэта той самы, які ўваскрос і жыве сярод нас у хвале.

УШАНАВАННЕ ЯГОНАГА ВОБРАЗА

52. Варта адзначыць, што выява Хрыста з Сэрцам, хоць і не з’яўляецца аб’ектам адарацыі, але не адна з магчымых, якую мы маглі б выбраць. Яна не была выдумана за пісьмовым сталом і яе не распрацаваў мастак, гэта «сімвал, не ўяўны, а сапраўдны, які паказвае цэнтр, крыніцу, з якой выплыла збаўленне для ўсяго чалавецтва» [32].

53. Існуе ўніверсальны чалавечы досвед, які робіць гэты вобраз унікальным. Бо, несумненна, на працягу гісторыі і ў розных частках свету сэрца сталася сімвалам найбольш асабістых пачуццяў, эмоцый і здольнасці любіць. Па-за любым навуковым тлумачэннем далонь, прыкладзеная сябрам да сэрца, выказвае асаблівую прыхільнасць; калі хтосьці закахаўся і знаходзіцца побач з каханай асобай, сэрца б’ецца хутчэй; калі хтосьці пакутуе ад растання або здрады з боку каханага чалавека, сэрца сціскаецца. А дзеля таго, каб пацвердзіць шчырасць словаў і іх сапраўдную глыбіню, людзі гавораць: «Я кажу гэта ад сэрца». Паэтычная мова не можа ігнараваць сілу гэтых перажыванняў. Такім чынам, на працягу гісторыі сэрца набыло ўнікальную сімвалічную вартасць, не толькі ўмоўную.

54. Цалкам зразумела, чаму Касцёл выбраў вобраз сэрца, каб паказаць чалавечую і Божую любоў Езуса Хрыста і самую глыбокую сутнасць Яго асобы. Аднак, хоць выява сэрца з полымем агню можа быць красамоўным сімвалам, які нагадвае пра любоў Езуса Хрыста, мэтазгодна, каб гэтае сэрца было часткай постаці Езуса Хрыста. Тады Ягоны заклік да асабістых адносінаў, сустрэчы і дыялогу набывае яшчэ большай вагі [33]. На тым шанаваным абразе, дзе Хрыстус трымае палаючае любоўю Сэрца, ёсць таксама і Ягоны позірк, які кліча да сустрэчы, дыялогу, даверу; у Езуса моцныя рукі, здольныя падтрымаць нас; Ён мае вусны, якія да кожнага прамаўляюць непаўторна і асабіста.

55. Перавага сэрца ў тым, што яно можа ўспрымацца не толькі ў сэнсе асобнага органа, але ў якасці асабістага цэнтра, у якім усё злучаецца, і выражае цэласнасць асобы, чаго не адбываецца з іншымі органамі чалавечага цела. Калі гэта асабісты цэнтр цэласнасці асобы і, такім чынам, частка, якая прадстаўляе цэлае, нескладана памыліцца ў яго разуменні, калі

сузіраць асобна ад Пана. Выява Сэрца мае скіроўваць нас да паўнаты Езуса Хрыста ў Ягоным цэнтры, і адначасова, пачынаючы з гэтага цэнтра, мае весці нас да сузірання Хрыста ва ўсёй прыгажосці і багацці Яго чалавечнасці і боскасці.

56. Якія б асаблівыя эстэтычныя якасці мы ні прыпісвалі розным выявам Сэрца Хрыста, сутнасць нашай малітвы перад імі не ў тым, каб «нешта прасіць у іх або спадзявацца на вобразы, як рабілі ў старажытнасці язычнікі», але ў тым, што «праз вобразы, якія цалуем, перад якімі кленчым і адкрываем галаву, мы пакланяемся Хрысту» [34].

57. Больш за тое, некаторыя з гэтых вобразаў могуць здавацца нам непрывабнымі і не вельмі натхняюць нас любіць і маліцца. Гэта другаснае, бо вобраз – толькі матывуючая фігура, і, як кажа ўсходняя прымаўка, не варта ўзірацца ў палец, які паказвае на месяц. У той час як Эўхарыстыя з’яўляецца рэальнай прысутнасцю, якую належыць адараваць, у дадзеным выпадку ідзе гаворка толькі пра вобраз, які, хоць і благаслаўлёны, запрашае нас пайсці далей, каб мы ўзнялі сэрца да Сэрца жывога Хрыста і з’ядналі сваё сэрца з Ягоным. Шанаваны абраз Найсвяцейшага Сэрца заклікае, наказвае, пабуджае прысвяць час на сустрэчу з Хрыстом і пакланенне ў той форме, якую лічым найлепшай. Такім чынам, гледзячы на абраз, мы стаім перад Хрыстом, а перад Ім «любоў спыняецца, сузірае таямніцу, смакуе яе ў маўчанні» [35].

58. Разам з тым мы не павінны забываць, што гэты вобраз сэрца гаворыць нам пра чалавечае цела, пра зямлю, а значыць, таксама пра Бога, які хацеў увайсці ў наш гістарычны стан, стацца гісторыяй і падзяліць нашае зямное вандраванне. Больш абстрактная або стылізаваная форма пабожнасці неабавязкова будзе больш адпавядаць Евангеллю, паколькі ў гэтым далікатным і даступным знаку праяўляецца спосаб, якім Бог хацеў аб’явіцца і стаць блізкім.

## АДЧУВАЛЬНАЯ ЛЮБОЎ

59. Любоў і сэрца неабавязкова ідуць поруч, бо ў сэрцы чалавека можа панаваць нянавісць, абыякавасць і эгаізм. Але мы не дасягнем паўнаты сваёй чалавечнасці, калі не пакінем сябе, і не станем цалкам самімі сабой, калі не будзем любіць. Такім чынам, унутраны цэнтр нашай асобы, створаны для любові, толькі тады выканае Божую задуму, калі будзе любіць. Такім чынам, сімвал сэрца адначасова сімвалізуе любоў.

60. Спрадвечны Сын Божы, які мяне бязмежна пераўзыходзіць, хацеў палюбіць мяне чалавечым сэрцам. Чалавечыя пачуцці ў Ім становяцца сакрамэнтам бясконцай і канчатковай любові. У такім выпадку Сэрца – не фізічны сімвал, які выражае толькі духоўную рэальнасць, аддзеленую ад матэрыі. Гледзячы на Сэрца Пана, мы кантэмплюем фізічную рэчаіснасць, чалавечае цела, дзякуючы якому Хрыстус можа мець чалавечыя эмоцыі і пачуцці, цалкам перамененыя Боскай любоўю. Нашая пабожнасць павінна ўзыходзіць да

бясконцай любові Асобы Сына Божага, але мы павінны ўсвядоміць, што яе нельга аддзяліць ад Яго чалавечай любові, а вобраз Яго цялеснага сэрца ў гэтым нам дапамагае.

61. Паколькі сэрца па-ранейшаму лічыцца ў народнай свядомасці цэнтрам пачуццяў кожнага чалавека, яно застаецца найлепшым сімвалам Боскай любові Хрыста, назаўжды і непарыўна злучанай цалкам з чалавечай любоўю. Пій XII адзначыў, што Евангелле, кажучы пра любоў сэрца Хрыста, гаворыць «не толькі пра Божую любоў, але таксама пра чалавечую любоў (…). Сэрца Езуса, гіпастасна з’яднанае з Боскай Асобай Слова, несумненна, пульсавала любоўю, а таксама іншымі пачуццямі» [36].

62. У Айцоў Касцёла, у адрозненне ад тых, хто адмаўляў або рэлятывізаваў сапраўдную чалавечую натуру Хрыста, мы знаходзім моцнае пацвярджэнне канкрэтнай і адчувальнай рэчаіснасці чалавечай любові Пана. Так, св. Базыль падкрэсліваў, што ўцелаўленне Пана не было чымсьці выдуманым: «Пан меў натуральныя адчуванні» [37]. А св. Ян Залатавусны прапанаваў наступны прыклад: «Калі б Ён не меў нашай натуры, то не смуткаваў бы зноў і зноў» [38]. Святы Амброзій сцвярджаў: «Паколькі Ён узяў чалавечую душу, узяў і яе пачуцці» [39]. На думку св. Аўгустына, чалавечыя пачуцці – гэта рэчаіснасць, аднойчы прынятая Хрыстом і таму больш не чужая жыццю ласкі: «Пан Езус узяў на сябе ўсе гэтыя наступствы чалавечай слабасці (як і цялесную смерць) не з навязанай Яму неабходнасці, але з волі міласэрнасці. [...] Таму той, каму давялося тужыць і пакутаваць сярод чалавечых спакусаў, не павінен лічыць сябе пакінутым ласкай Хрыста» [40]. Нарэшце, св. Ян Дамаскін лічыў, што сапраўдны пачуццёвы досвед Хрыста ў Яго чалавечнасці з’яўляецца доказам таго, што Ён прыняў нашую натуру цалкам, а не часткова, каб усю яе адкупіць і перамяніць: Хрыстус, такім чынам, узяў на сябе ўсе элементы, якія складаюць чалавечую натуру, каб усе яны маглі быць асвячаны [41].

63. Тут варта спаслацца на разважанні тэолага, які прызнае, што «пад уплывам грэцкай думкі тэалогія на працягу доўгага часу адносіла цела і пачуцці да сферы дачалавечага, недачалавечага або нечалавечага, але тое, што тэалогія не вырашыла ў тэорыі, духоўнасць вырашыла на практыцы. Духоўнасць і народная рэлігійнасць захавалі сувязь з саматычным, псіхалагічным і гістарычным аспектамі Езуса. Крыжовы шлях, набажэнства да Ягоных ранаў, духоўнасць каштоўнай крыві, культ Сэрца Езуса, эўхарыстычныя практыкі […] – гэтыя элементы запоўнілі прабелы ў тэалогіі, сілкуючы нашае ўяўленне і сэрца, любоў і пяшчоту да Хрыста, надзею і памяць, прагу і тугу. Розум і логіка пайшлі іншымі шляхамі» [42].

ПАТРОЙНАЯ ЛЮБОЎ

64. Не будзем затрымлівацца толькі на чалавечых пачуццях Пана, якімі б прыгожымі і хвалюючымі яны ні былі, таму што, сузіраючы Сэрца Хрыста, мы таксама пазнаём, як у Ягоных высакародных і здаровых пачуццях, у пяшчоце, у трымценні чалавечай любові аб’яўляецца ўся праўда бясконцай Божай любові. Бэнэдыкт XVI выказаў гэта наступным

чынам: «З бясконцага гарызонту сваёй любові Бог пажадаў увайсці ў межы гісторыі і чалавечага стану, прыняўшы цела і сэрца, каб мы маглі ўглядацца і знаходзіць бясконцае ў канечным, нябачную і невыказную таямніцу ў чалавечым Сэрцы Езуса з Назарэта» [43].

65. Насамрэч у вобразе Сэрца Пана існуе патройная любоў, якая ўражвае нас. Перш за ўсё, бясконцая Божая любоў, якую мы знаходзім у Хрысце. Але звернем увагу і на духоўнае вымярэнне чалавечнасці Пана. З гэтага пункту гледжання сэрца «з'яўляецца сімвалам палымянай любові, якая, улітая ў душу Хрыста, узбагачае Ягоную волю». І ўрэшце з'яўляецца «сімвалам Ягонай чулай любові» [44].

66. Гэтыя тры любові – не асобныя здольнасці, якія дзейнічаюць паралельна або незалежна, хутчэй яны дзейнічаюць і выяўляюцца разам, у няспыннай плыні жыцця: «У святле веры, што чалавечая і боская натура злучаюцца ў Асобе Хрыста, мы можам бачыць вельмі цесныя сувязі паміж чулай любоўю фізічнага сэрца Езуса і Яго падвойнай духоўнай любоўю, чалавечай і боскай» [45].

67. Такім чынам, уваходзячы ў Сэрца Хрыста, мы адчуваем сябе любімымі чалавечым сэрцам, поўным пяшчоты і пачуццяў, падобных да нашых. Чалавечая воля Езуса свабодна жадае любіць нас. Гэтая духоўная воля цалкам асветлена ласкай і любоўю. Калі мы дасягаем глыбіні Сэрца, нас ахінае бязмерная хвала бясконцай любові спрадвечнага Сына, якую мы больш не можам аддзяліць ад Яго чалавечай любові. Менавіта ў чалавечай любові, а не здалёк ад яе, мы знаходзім Яго Боскую любоў, знаходзім «бясконцае ў канечным» [46].

68. Касцёл увесь час і выразна вучыць, што нашая адарацыя Асобы Хрыста з'яўляецца адзінай і непадзельна ўключае ў сябе як Боскую, так і чалавечую натуру. Са старажытнасці Касцёл вучыў, што мы павінны «пакланяцца аднаму і таму ж Хрысту, Сыну Божаму і Чалавечаму, у дзвюх неад'емных і непадзельных натурах» [47], прытым «адным пакланеннем […] паводле таго, як Слова сталася целам» [48]. Ні ў якім разе Хрысту не «пакланяюцца ў дзвюх натурах, з якіх узнікаюць дзве адарацыі», але хутчэй «у адной адарацыі ўцелаўлёнага Бога, Слова, разам з Ягоным целам» [49].

69. Святы Ян ад Крыжа імкнуўся выказаць, што ў містычным досведзе бязмерная любоў уваскрослага Хрыста не ўспрымаецца як чужая для нас. Бясконцасць нейкім чынам зніжаецца, каб праз адкрытае Сэрца Хрыста мы маглі сустрэць і перажыць сапраўдную ўзаемную любоў: «праўдападобна, што птушка нізкага палёту можа захапіць каралеўскага арла з вышыняў, калі гэты арол зніжаецца з жаданнем быць схопленым» [50]. І ён тлумачыць, што жаніх, «бачачы, што нявеста паранена любоўю, з прычыны яе стагнанняў і ён паранены любоўю да яе, бо для закаханых рана аднаго з'яўляецца ранай і другога, і абодва адчуваюць тое самае» [51]. Гэты містык разумее вобраз параненага боку Хрыста як заклік да поўнай еднасці з Панам. Ён – паранены алень, паранены, калі мы яшчэ не дазваляем Ягонай любові дакрануцца да нас; алень, які спускаецца да патокаў вады, каб

наталіць смагу, і кожны раз знаходзіць суцяшэнне, калі мы вяртаемся да Яго:

«Вярніся, галубка,

Бо алень паранены

Выходзіць з ценю на ўзгорак

На павеў твайго палёту,

шукаючы прахалоды» [52].

ТРЫНІТАРНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

70. Набажэнства да Сэрца Езуса мае выразна хрысталагічны характар; непасрэднае сузіранне Хрыста запрашае нас з’яднацца з Ім. Падставы мы можам знайсці ў заахвочванні з Паслання да Габрэяў: «[...] цярпліва бегчы ў прызначаным для нас змаганні, гледзячы на Езуса» (пар. 12, 2). Аднак нельга абмінуць і таго, што Езус адначасова называе сябе дарогай да Айца: «Я – дарога [...]. Ніхто не прыходзіць да Айца інакш, як толькі праз Мяне» (Ян 14, 6). Ён хоча прывесці нас да Айца. Вось чаму навучанне Касцёла ад самага пачатку не затрымлівае нас на Езусе Хрысце, але вядзе да Айца. У выніку, менавіта Ён як крыніца паўнаты мае быць праслаўлены [53].

71. Возьмем, напрыклад, Пасланне да Эфесцаў, у якім можна ясна і выразна ўбачыць, наколькі нашая адарацыя скіравана на Айца: «Я схіляю калені мае перад Айцом» (Эф 3, 14); «ёсць адзін Бог і Айцец усіх, які над усімі і праз усіх, і ва ўсіх» (Эф 4, 6); «дзякуйце заўсёды за ўсё Богу і Айцу» (Эф 5, 20). Айцец – гэта той, для каго мы існуём (пар. 1 Кар 8, 6). Таму св. Ян Павел II казаў, што «ўсё хрысціянскае жыццё падобна да вялікай пілігрымкі ў дом Айца» [54]. Гэта адчуў св. Ігнацый з Антыёхіі на шляху да мучаніцтва: «Ёсць ува мне вада жывая, якая прамаўляе і кліча знутры: “Прыйдзі да Айца”» [55].

72. Перадусім Ён Айцец Езуса Хрыста: «Благаслаўлёны Бог, Айцец Пана нашага Езуса Хрыста» (Эф 1, 3). Ён – «Бог Пана нашага Езуса Хрыста, Айцец славы» (Эф 1, 17). Калі Сын стаўся чалавекам, усе жаданні і памкненні Ягонага чалавечага сэрца былі скіраваны да Айца. Калі засяродзім увагу на тым, як Хрыстус звяртаўся да Айца, то ўбачым сардэчнае захапленне, дасканалую і пастаянную арыентаванасць на Айца [56]. Зямное жыццё было падарожжам, падчас якога Ён адчуваў у сваім чалавечым сэрцы няспынны заклік ісці да Айца [57].

73. Мы ведаем, што Езус у звароце да Айца выкарыстоўваў арамейскае слова, якое гучала «*Abba*», што азначае «Тата», «Татачка». У тыя часы некаторых бянтэжыла такая

фамільярнасць (пар. Ян 5, 18). Гэты зварот ужыў Езус, калі размаўляў з Айцом у трывожную гадзіну перад смерцю: «Абба, Ойча! Ты ўсё можаш. Адхілі ад Мяне гэты келіх; але не чаго Я хачу, а чаго Ты» (Мк 14, 36). Ён заўсёды адчуваў, што Айцец любіць Яго: «палюбіў Мяне перад заснаваннем свету» (Ян 17, 24). І ўсім сваім чалавечым сэрцам Ён цешыўся, пачуўшы словы Айца: «Ты Сын Мой умілаваны, Цябе ўпадабаў Я» (Мк 1, 11).

74. Чацвёртае Евангелле кажа, што спрадвечны Сын Айца заўсёды быў «ва ўлонні Айца» (Ян 1, 18) [58]. Святы Ірэнэй сцвярджае, што «Сын Божы заўсёды існуе ў Айца» [59]. І Арыген кажа, што Сын трывае «ў няспынным сузіранні глыбіні Айца» [60]. Таму, стаўшы чалавекам, Ён праводзіў цэлыя ночы ў размовах з умілаваным Айцом на вяршыні гары (пар. Лк 6, 12). Ён казаў: «Мне трэба быць у тым, што належыць Айцу Майму» (Лк 2, 49). Узносіў хвалу: «Езус узрадаваўся ў духу і сказаў: “Праслаўляю Цябе, Ойча, Пане неба і зямлі!”» (Лк 10, 21). І апошнімі словамі, поўнымі даверу, былі: «Ойча, у рукі Твае аддаю дух Мой» (Лк 23, 46).

75. А цяпер звернем позірк на Духа Святога, які напаўняе Сэрца Хрыста і гарыць у Ім. Як казаў св. Ян Павел II, Сэрца Хрыста з’яўляецца «шэдэўрам Духа Святога» [61]. Гэта не мінулае, бо і цяпер «Сэрца Хрыста жыве дзеяннем Духа Святога, якога Езус называў натхняльнікам сваёй місіі (пар. Лк 4, 18; Іс 61, 1) і чыё спасланне было абяцана падчас Апошняй вячэры. Дух дапамагае спасцігнуць багацце, схаванае ў знаку прабітага боку Хрыста, з якога нарадзіўся Касцёл (пар. Канст. *Sacrosanctum Concilium*, 5)» [62]. Інакш, «толькі Дух Святы можа адкрыць перад намі паўнату «ўнутранага чалавека», якая знаходзіцца ў Сэрцы Хрыста. Толькі Ён можа зрабіць так, каб нашыя чалавечыя сэрцы паступова набіраліся сілы ад гэтай паўнаты» [63].

76. Калі мы паспрабуем паглыбіцца ў таямніцу дзеяння Духа, то ўбачым, што Ён стогне ў нас і кліча «Абба»: «А паколькі вы сыны, Бог паслаў у вашыя сэрцы Духа Сына свайго, які усклікае: Абба, Ойча!» (Гал 4, 6). Бо «гэты самы Дух сведчыць духу нашаму, што мы дзеці Божыя» (Рым 8, 16). Дзеянне Духа Святога ў чалавечым сэрцы Хрыста нястомна прыцягвае Яго да Айца. І калі праз ласку яднае нас з пачуццямі Хрыста, то робіць нас саўдзельнікамі адносінаў Сына з Айцом, бо менавіта Дух Святы – гэта «Дух усынаўлення, у якім мы клічам: Абба, Ойча!» (Рым 8, 15).

77. Нарэшце, і нашая сувязь з Сэрцам Хрыста перамяняецца пад уплывам імпульсу Духа, які вядзе нас да Айца, крыніцы жыцця і канчатковай крыніцы ласкі. Сам Хрыстус не хоча, каб мы спыняліся толькі на Ім. Любоў Хрыста – гэта «адкрыццё міласэрнасці Айца» [64]. Ён прагне, каб мы, падахвочаныя Духам, які выплывае з Ягонага Сэрца, «з Ім і ў Ім» крочылі да Айца. Хвала ўзносіцца Айцу «праз» Хрыста [65], «з» Хрыстом [66] і «ў» Хрысце [67]. Святы Ян Павел II вучыў, што «Сэрца Збаўцы запрашае нас вярнуцца да любові Айца, які з’яўляецца крыніцай усёй сапраўднай любові» [68]. Дух Святы імкнецца ўмацоўваць гэта ў нашых сэрцах, сыходзячы да нас з Сэрца Хрыста. Таму Літургія пад жыватворным дзеяннем

Духа заўсёды звяртаецца да Айца з Сэрца уваскрослага Хрыста.

## АПОШНІЯ ДАКТРЫНАЛЬНЫЯ ВЫКАЗВАННІ КАСЦЁЛА

78. Рознымі спосабамі Сэрца Хрыста заўсёды прысутнічала ў гісторыі хрысціянскай духоўнасці. У Бібліі і ў першыя стагоддзі Касцёла яно праяўлялася ў вобразе параненага боку Пана, а таксама як крыніца ласкі або як заклік да асабістай сустрэчы з любоўю. Падобным чынам яно выступала ў сведчаннях многіх святых аж да сённяшняга дня. У апошнія стагоддзі гэтая духоўнасць перарасла ў сапраўдны культ Сэрца Пана.

79. Некалькі маіх папярэднікаў узгадвалі пра Сэрца Хрыста і самымі разнастайнымі сапобамі заахвочвалі з'яднацца з Ім. У канцы XIX ст. Леў XIII заклікаў нас прысвяціць сябе Сэрцу Хрыста і ў сваёй прапанове спалучыў і заклік да еднасці з Хрыстом, і захапленне бляскам Яго бясконцай любові [69]. Прыкладна праз трыццаць гадоў Пій XI прадставіў гэтае набажэнства як «суму» досведу хрысціянскай веры [70]. Акрамя таго, Пій XII сцвярджаў, што культ Найсвяцейшага Сэрца – як узнёслы сінтэз – дасканала адлюстроўвае наш культ Езуса Хрыста [71].

80. Не так даўно св. Ян Павел II прадставіў развіццё гэтага культу ў мінулыя стагоддзі як адказ на рост рыгарыстычных і адарваных ад рэчаіснасці формаў духоўнасці, якія забыліся пра міласэрнасць Пана, а таксама як актуальны заклік да свету, што спрабуе будавацца без Бога: «Культ Найсвяцейшага Сэрца, які развіўся ў Еўропе два стагоддзі таму пад уплывам містычнага досведу св. Маргарыты Марыі Алякок, быў адказам на рыгарызм янсенізму, які недацэньваў бясконцую міласэрнасць Бога. (…) Чалавеку 2000 года патрэбна Сэрца Хрыста, каб пазнаць Бога і самога сябе; патрэбен Бог, каб будаваць цывілізацыю любові» [72].

81. Бэнэдыкт XVI заахвоціў нас распазнаваць Сэрца Хрыста ў кожным жыцці як асабістую і штодзённую прысутнасць: «Кожны чалавек павінен мець «цэнтр» свайго жыцця, крыніцу праўды і дабра, з якой можна чэрпаць у віры падзей, сітуацый і стомленасці паўсядзённага існавання. Кожны з нас, злавіўшы момант цішыні, мае патрэбу не толькі ў тым, каб адчуць біццё свайго сэрца, але таксама, каб яшчэ глыбей, адчуць пульсацыю годнай даверу прысутнасці, якая ўспрымаецца пачуццём веры, але значна больш рэальнай: прысутнасці Хрыста, сэрца свету» [73].

## ПАГЛЫБЛЕННЕ І АКТУАЛЬНАСЦЬ

82. Выразны і сімвалічны вобраз Сэрца Хрыста – не адзіны сродак, які Дух Святы дае нам, каб знайсці любоў Хрыста. Яго заўсёды трэба ўзбагачаць, асвятляць, абнаўляць праз разважанне, чытанне Евангелля і духоўнае развіццё. Ужо Пій XII выразна зазначаў, што Касцёл не сцвярджае, што «мы павінны сузіраць і ўшаноўваць “фармальны” вобраз, гэта

значыць дасканалы і абсалютны знак Яго Божай любові, бо яе найглыбейшую сутнасць ніколі не зможа адпаведным чынам прадставіць ніводзін створаны вобраз» [74].

83. Набажэства да Сэрца Хрыста з’яўляецца істотным для самога хрысціянскага жыцця ў той ступені, у якой акрэслівае нашу поўную веры і пакланення адкрытасць перад таямніцай Боскай і чалавечай любові Пана, каб мы маглі яшчэ раз падкрэсліць, што Найсвяцейшае Сэрца з’яўляецца сінтэзам Евангелля [75]. Неабходна памятаць, што візіі і містычныя аб’яўленні, пра што распавядаюць некаторыя святыя, якія горача распаўсюджвалі набажэнства да Сэрца Хрыста, не з’яўляюцца чымсьці такім, у што вернікі абавязаны верыць, як у Божае слова [76]. Яны з’яўляюцца прыгожымі натхненнямі, якія могуць матываваць і несці шмат дабра, хоць ніхто не павінен адчуваць сябе змушаным прымаць іх, калі не бачыць, што яны дапамагаюць яму на духоўным шляху. Больш за тое, важна ўсвядоміць, як сцвярджаў Пій XII, што нельга сказаць, быццам гэты культ «абавязаны сваім паходжаннем прыватным аб’яўленням» [77].

84. Напрыклад, прапанова прымаць святую Камунію ў першую пятніцу кожнага месяца была моцным пасланнем у той час, калі многія людзі перасталі прымаць Камунію, таму што не верылі ў Божае прабачэнне, у Божую міласэрнасць і лічылі Камунію відам узнагароды для дасканалых. У тагачасным янсеніцкім кантэксце пашырэнне гэтай практыкі прынесла вялікую карысць, дапамагаючы распазнаць у Эўхарыстыі міласэрную і непахісную любоў Хрыстовага Сэрца, якое заклікае да еднасці з Ім. Мы можам сцвердзіць, што сёння гэта таксама прынесла б шмат дабра, але па іншай прычыне: у віры сучаснага свету, у нашай апантанасці вольным часам, спажывальніцтвам і забавай, тэлефонамі і сацыяльнымі сеткамі, мы забываемся карміць сваё жыццё моцай Эўхарыстыі.

85. Таксама ніхто не павінен адчуваць сябе абавязаным удзельнічаць у гадзіннай адарацыі па чацвяргах. Але як мы можам яе не рэкамендаваць? Калі хтосьці разам з многімі братамі шчыра жыве гэтай практыкай і знаходзіць у Эўхарыстыі ўсю любоў Сэрца Хрыста, «ён разам з Касцёлам праслаўляе сімвал і след Божай любові, якая зайшла так далёка, што нават Сэрцам Уцелаўлёнага Слова палюбіла чалавечы род» [78].

86. Многія янсеністы з цяжкасцю маглі гэта зразумець і з пагардай глядзелі на ўсё, што было чалавечым, пачуццёвым, цялесным і таму рабілі выснову, што гэтая пабожнасць аддаляе нас ад найчысцейшага пакланення Найвышэйшаму Богу. Пій XII назваў «ілжывым містыцызмам» [79] гэты элітарны падыход некаторых груп, якія бачылі Бога настолькі ўзнёслым, адасобленым і далёкім, што лічылі чулыя формы народнай пабожнасці небяспечнымі і што за імі патрэбны касцёльны кантроль.

87. Можна сцвярджаць, што сёння замест янсенізма мы сутыкаемся з моцным прагрэсам секулярызацыі, якая імкнецца пабудаваць свет, свабодны ад Бога. У дадатак у грамадстве памнажаюцца розныя формы рэлігійнасці без згадкі пра асабістую сувязь з Богам любові,

будучы новымі праявамі «духоўнасці без цела». Гэта праўда. Аднак трэба папярэдзіць, што ў самім Касцёле шкодны янсеніцкі дуалізм адрадзіўся з новымі тварамі. У апошнія дзесяцігоддзі ён набыў моц. Гэта праява таго гнастыцызму, які ўжо нанёс шкоду духоўнасці ў першыя стагоддзі хрысціянства, ігнаруючы праўду аб «збаўленні цела». Таму я скіроўваю свой позірк на Сэрца Хрыста і запрашаю вас аднавіць гэтае набажэнства. Я спадзяюся, што яно таксама можа быць прывабным для сучаснага ўспрыняцця і такім чынам дапаможа нам супрацьстаяць гэтым старым і новым дуалізмам, на якія дае адэкватны адказ.

88. Я хацеў бы дадаць, што Сэрца Хрыста адначасова вызваляе нас і ад іншага дуалізму: дуалізму, які датычыць супольнасцяў і душпастыраў, засяроджаных толькі на знешняй дзейнасці, структурных рэформах, пазбаўленых Евангелля, апантаных планамі рэарганізацый, свецкіх праектах, секулярызаваных рэфлексій і розных прапаноў, пададзеных як патрабаванні, якія часам спрабуюць навязаць усім. З гэтага часта вынікае хрысціянства, якое забылася пра пяшчоту веры, радасць адданага служэння, місійны запал, захапленне прыгажосцю Хрыста, глыбокую ўдзячнасць за сяброўства, якое Ён прапануе, і за канчатковы сэнс, які надае нашаму жыццю. Гэта яшчэ адна праява падманлівага трансцэндэнталізму, зноў жа бесцялеснага.

89. Падхапіўшы гэтыя хваробы, так шырока распаўсюджаныя ў наш час, мы нават не адчуваем жадання вылечыцца. Таму я хачу прапанаваць усяму Касцёлу новае паглыбленае разважанне пра любоў Хрыста, якая выявілася праз Яго Найсвяцейшае Сэрца. Там мы можам знайсці ўсё Евангелле, сінтэз праўдаў веры, усё, што мы праслаўляем і шукаем у веры, усё, што нам найбольш патрэбна.

90. Углядаючыся ў Сэрца Хрыста, можна вярнуцца да ўцелаўлёнага сінтэзу Евангелля і жыць тым, што я не так даўно прапанаваў, прыгадваючы ўмілаваную св. Тэрэзу ад Дзіцятка Езус: «Найбольш адпаведнай паставай з’яўляецца давер не да сябе, а да бясконцай міласэрнасці Бога, які любіць без межаў і які аддаў усё на крыжы Езуса» [80]. Яна перажывала гэта так інтэнсіўна, таму што адкрыла ў Сэрцы Хрыста тое, што Бог ёсць любоў: «Ён даў мне сваю бясконцую міласэрнасць, і скрозь яе я сузіраю і адарую іншыя Божыя дасканаласці!» [81]. Таму самая папулярная малітва, скіраваная як страла ў Сэрца Хрыста, гучыць проста: «Давяраю Табе» [82]. Іншых словаў не трэба.

91. У наступных раздзелах мы разгледзім два асноўныя аспекты, якія сёння павінна ў сабе спалучаць набажэнства да Найсвяцейшага Сэрца, каб надалей карміць нас і набліжаць да Евангелля: па-першае, асабісты духоўны досвед, і па-другое, супольнасны і місійны ўдзел.

## IV. ЛЮБОЎ, ЯКАЯ ДАЕ ПІЦЬ

92. Вернемся да Святога Пісання, да натхнёных тэкстаў, у якіх мы найбольш пэўна знаходзім Аб'яўленне. У іх і ў жывой Традыцыі Касцёла ёсць тое, што сам Пан хацеў сказаць нам на працягу ўсёй гісторыі. Пачнём з некаторых тэкстаў Старога і Новага Запаветаў і засяродзімся на пэўных праявах дзеяння Слова падчас вялікай духоўнай пілігрымкі Божага народу.

БОЖАЯ ПРАГА ЛЮБОВІ

93. Біблія паказвае, што людзям, якія ішлі праз пустыню і чакалі вызвалення, было абвешчана багацце жыватворнай вады: «З радасцю будзеце чэрпаць ваду з крыніцаў збаўлення» (Іс 12, 3). Прароцтвы пра Месію паступова набылі вобраз патока ачышчальнай вады: «І акраплю вас вадою чыстаю, і будзеце ачышчаны ад ўсяго бруду вашага […]. І дам вам сэрца новае і дух новы ў нутро вашае» (Эзх 36, 25-26). Менавіта вада верне людзям паўнавартаснае існаванне, як крыніца, што выцякае са святыні і разлівае на сваім шляху жыццё і здароўе: «Я бачыў, на беразе патоку было вельмі шмат дрэваў з гэтага і з таго боку. […] І кожная жывая істота, якая кішыць там, куды ўвойдзе паток, будзе жыць […], бо куды ўвойдзе гэтая вада, усё аздаравіцца. І там, куды ўвойдзе гэты паток, будзе жывым усё» (Езх 47, 7.9).

94. Юдэйскае свята Шатроў (*Сукот*) з нагоды саракагадовага знаходжання Ізраэля ў пустыні паступова ўзяло сімвал вады ў якасці цэнтральнага элемента. Святкаванне прадугледжвала, што кожную раніцу здзяйсняўся рытуал ахвяравання вады, найбольш урачысты ў апошні дзень: людзі ў вялікай працэсіі ішлі да святыні, дзе сем разоў абыходзілі вакол ахвярніка, а затым з гучнымі крыкамі радасці ахвяроўвалі Богу ваду [83].

95. Прароцтва аб надыходзе месіянскіх часоў выкарыстоўвала вобраз адчыненай людзям крыніцы: «Я выллю на дом Давіда і на жыхароў Ерузалема дух ласкі і малітваў, і яны будуць глядзець на таго […], каго прабілі […]. У той дзень адчыніцца крыніца для дому Давіда і жыхароў Ерузалема, каб абмыць грэх і нячыстасць» (Зах 12, 10; 13, 1).

96. Прабіты чалавек, адчыненая крыніца, дух ласкі і малітвы. Першыя хрысціяне ясна бачылі спаўненне гэтага абяцання ў прабітым баку Хрыста – крыніцы, з якой выцякае новае жыццё. У Евангеллі паводле Яна мы бачым, як гэтае прароцтва споўнілася ў Хрысце. Мы сузіраем Яго адкрыты бок, з якога выцекла вада Духа: «Адзін з жаўнераў прабіў дзідаю Ягоны бок, і адразу выцекла кроў і вада» (Ян 19, 34). Затым евангеліст дадае: «Будуць глядзець на таго, каго прабілі» (Ян 19, 37). Такім чынам, ён спасылаецца на прарока, які абяцаў людзям адчыненую крыніцу ў Ерузалеме, калі яны будуць глядзець на прабітага (пар. Зах 12, 10). Адчыненая крыніца – гэта прабіты бок Хрыста.

97. Звернем увагу на сам евангельскі ўрывак пра гэты святы момант, а менавіта пра «апошні вялікі дзень свята» Шатроў (Ян 7, 37). Езус гучна ўсклікнуў да людзей, якія ішлі ў

вялікай святочнай працэсіі: «Калі хто прагне, няхай прыйдзе да Мяне і п’е […], з улоння пацякуць рэкі вады жывой» (Ян 7, 37-38). Каб гэта сталася, павінна была прыйсці Яго «гадзіна», бо Езус «яшчэ не быў услаўлены» (Ян 7, 39). Усё здзейснілася на крыжы, у крыві і вадзе, якія пацяклі з Хрыстовага сэрца.

98. У кнізе Апакаліпсіса Ён з’яўляецца зноў як Прабіты: «Яго ўбачаць усе тыя, хто працяў Яго» (Ап 1, 7), і як адкрытая крыніца: «Хто прагне, няхай прыйдзе, і хто хоча, няхай возьме ваду жыцця дарма» (Ап 22, 17).

99. Прабіты бок адначасова з’яўляецца месцам любові, любові, якую Бог выказаў свайму народу настолькі рознымі словамі, што варта іх нагадаць:

«Паколькі дарагім ты стаўся ў вачах Маіх і слаўным, Я люблю цябе» (Іс 43, 4).

«Ці можа жанчына забыцца пра сваё дзіця, каб не пашкадаваць дзіцяці ўлоння свайго? А калі нават яна забудзе, Я не забуду пра цябе! Вось, Я запісаў цябе на далонях Маіх» (Іс 49, 15-16)

«Горы адступяцца ды ўзгоркі затрасуцца, але міласэрнасць Мая не адступіцца ад цябе і не захістаецца Мой запавет спакою» (Іс 54, 10).

«Я палюбіў цябе любоўю вечнаю, дзеля таго прыгарнуў цябе з міласэрнасцю» (Ер 31, 3).

«Пан, твой Бог, пасярод цябе, Ён, магутны, збавіць цябе; будзе цешыцца табою; узнясе вокліч радасці» (Саф 3, 17).

100. Прарок Осія гаворыць пра сэрца Бога, які «прыцягваў яго повязямі чалавечнасці, повязямі любові» (Ос 11, 4). Калі ж людзі пагарджалі гэтай любоўю, Ён мог сказаць: «Узварухнулася ўва Мне сэрца Маё і распаліўся жаль Мой» (Ос 11, 8). Але заўсёды перамагае міласэрнасць (пар. Ос 11, 9), якая асягне найвыйшэйшы выраз у Хрысце, канчатковым Слове любові.

101. У прабітым Сэрцы Хрыста сканцэнтраваны, запісаныя ў целе, усе праявы любові, якія ёсць у Святым Пісанні. Не ідзе гаворка пра любоў, якая проста дэкларуецца – Ягоны адкрыты бок з’яўляецца крыніцай жыцця для тых, каго Ён палюбіў, крыніцай, якая спаталяе смагу Ягонага народу. Як вучыў св. Ян Павел II, «істотныя элементы гэтага набажэнства нязменна належаць да духоўнасці Касцёла на працягу ўсёй яго гісторыі; бо ад пачатку Касцёл кіраваў свой позірк на Сэрца Хрыста, прабітае на крыжы» [84].

## РЭХА СЛОВА Ў ГІСТОРЫІ

102. Давайце разгледзім некаторыя плёны гэтага Божага слова ў гісторыі хрысціянскай веры. Некаторыя Айцы Касцёла, асабліва з Малой Азіі, згадвалі рану на баку Езуса як крыніцу вады Духа – Слова, Ягоных ласкаў і сакрамэнтаў, якія яе перадаюць. Моц мучанікаў паходзіць з «нябеснай крыніцы жывой вады, якая цячэ з Хрыста» [85], або, як тлумачыць Руфін, з «нябесных і вечных крыніцаў, якія струменяць з сэрца Хрыста» [86]. Мы, вернікі, адроджаныя з Духа, паходзім з пячоры ў скале, «вычасаныя з сэрца Хрыста» [87]. Прабіты бок, які мы ўспрымаем як Сэрца, напоўнены Духам Святым, які адтуль цячэ да нас, быццам рэкі жывой вады: «Крыніца Духа цалкам у Хрысце» [88]. Але Дух, якога мы атрымліваем, не аддаляе нас ад уваскрослага Пана, але напаўняе нас Ім, таму што, п’ючы Духа, мы п’ём самога Хрыста: «Піце Хрыста, бо Ён – скала, з якой ліецца вада. Піце Хрыста, бо Ён – крыніца жыцця. Піце Хрыста, бо Ён – рака, патокі якой цешаць горад Божы. Піце Хрыста, бо Ён – супакой. Піце Хрыста, бо з Ягонага Сэрца бруіць жывая вада» [89].

103. Святы Аўгустын праклаў шлях набажэнству да Найсвяцейшага Сэрца як у прастору асабістай сустрэчы з Панам. На яго думку, прабіты бок Хрыста – не толькі крыніца ласкі і сакрамэнтаў, але сімвал цеснай еднасці з Хрыстом, месца сустрэчы, напоўненай любоўю. Адтуль бярэ пачатак найкаштоўнейшая мудрасць, якой ёсць пазнанне Пана. Па сутнасці, Аўгустын піша, што Ян, умілаваны вучань, паклаўшы галаву на грудзі Езуса падчас Апошняй вячэры, наблізіўся да святыні мудрасці [90]. Мы маем тут справу не проста з абстрактным сузіраннем тэалагічнай праўды. Святы Геранім тлумачыў, што чалавек, здольны сузіраць, «не захапляецца прыгажосцю струменя вады, але п’е жывую ваду, якая цячэ з боку Пана» [91].

104. Святы Бэрнард звярнуўся да сімвалізму прабітага боку Пана і разумеў яго як аб’яўленне і дар любові Ягонага Сэрца. Праз рану Хрыстус робіць яго дасяжным, і дзякуючы ёй мы можам прыняць вялікую таямніцу любові і міласэрнасці: «З даверам шукаю ў глыбінях сэрца Збаўцы тое, чаго мне не хапае, бо яно перапоўнена міласэрнасцю, і не стае ран на Ягоным Найсвяцейшым Целе, з якіх яна магла б праліцца. Прабілі Яму рукі і ногі, працялі дзідаю бок; праз гэтыя шчыліны я магу піць мёд са скалы і алей з самага цвёрдага каменя, а гэта значыць магу пакаштаваць і ўбачыць, які добры ёсць Пан. […[ Жалеза пранізала Ягоную душу і параніла сэрца, каб Ён сапраўды ўмеў спачуваць маім слабасцям. Таямніца Ягонага сэрца бачная праз раны цела; цяпер мы можам сузіраць гэтую найвялікшую таямніцу бясконцай міласэрнасці нашага Бога» [92].

105. Гэтую тэму асаблівым чынам можна прасачыць у Вільгельма з Сан-Цьеры, які запрашае ўвайсці ў Сэрца Езуса, які корміць нас сваімі грудзьмі [93]. Нядзіўна, калі ўспомнім, што для гэтага аўтара «мастацтва мастацтваў – гэта мастацтва любові […]. Любоў абуджаецца Стварыцелем і з’яўляецца сілай душы, якая вядзе, нібы сваёй натуральнай сілай гравітацыі, да належнага месца і да мэты» [94]. Месцам, дзе пануе паўната любові, з’яўляецца Сэрца Хрыста: «Куды, Пане, вядзеш тых, каго абдымаеш і прыціскаеш да сябе, як не да свайго Сэрца? Тваё Сэрца – салодкая манна Тваёй боскасці, якую Ты захоўваеш у

сабе, Езу, у залатой пасудзіне Сваёй душы (пар. Гбр 9, 4), і гэта пераўзыходзіць усе веды. Шчаслівыя тыя, каго вядуць туды Твае абдымкі. Шчаслівыя занураныя ў тых глыбінях і схаваныя ў таямніцы Твайго сэрца» [95].

106. Святы Банавэнтура аб’ядноўвае дзве духоўныя лініі вакол Сэрца Хрыста: прадстаўляючы яго як крыніцу сакрамэнтаў і ласкі, ён прапануе, каб сузіранне стала сяброўскімі адносінамі, асабістай сустрэчай любові.

107. Спачатку Банавентура дапамагае нам распазнаць прыгажосць ласкі і сакрамэнтаў, якія выцякаюць з той крыніцы жыцця, якой з’яўляецца паранены бок Пана: «Каб з боку Хрыста, які спіць на крыжы, утварыўся Касцёл і споўнілася Пісанне, якое кажа: “будуць глядзець на таго, каго прабілі”, адзін з жаўнераў ударыў Яго дзідай і раскрыў Яму бок. З дазволу Божага Провіду, кроў і вада, што выцеклі з гэтай раны, сталіся платай за нашае збаўленне. Выцякаючы з самой крыніцы, з Сэрца Хрыста, яны далі сакрамэнтам Касцёла моц удзяляць жыццё ласкі, а тым, хто ўжо жыве ў Хрысце, яны сталіся напоем з “крыніцы, якая цячэ ў жыццё вечнае”» [96].

108. Затым Банавентура запрашае зрабіць яшчэ адзін крок, каб доступ да ласкі не стаў чымсьці магічным або свайго роду неаплатанічнай эманацыяй, але непасрэднымі адносінамі з Хрыстом, жыллём у Ягоным Сэрцы, бо той, хто п’е, з’яўляецца сябрам Хрыста, сэрцам, якое любіць: «Устань жа, душа, умілаваная сяброўка Хрыста, і будзь галубкай, што гняздуецца ў расколіне скалы, будзь вераб’ём, які знайшоў дом і не перастае яго ахоўваць; будзь туркаўкай, якая хавае птушанят сваёй чыстай любові ў гэтай самай святой расколіне» [97].

## РАСПАЎСЮДЖАННЕ НАБАЖЭНСТВА ДА СЭРЦА ХРЫСТА

109. Паступова паранены бок, дзе прабывае любоў Хрыста, з якога, у сваю чаргу, выцякае жыццё ласкі, прымае постаць сэрца, прытым асабліва выразна – у манаскім жыцці. Мы ведаем, што на працягу гісторыі культ Сэрца Хрыста не заставаўся аднастайным і што сучасныя аспекты яго развіцця, звязаныя з розным духоўным досведам, нельга пераносіць і параўноўваць і спалучаць з сярэднявечнымі формамі, а тым больш з біблійнымі формамі, у якіх мы бачым зародкі гэтага культу. Тым не менш, Касцёл сёння не пагарджае ніводным з дабротаў, якія Дух Святы даваў нам на працягу стагоддзяў, і ведае, што заўсёды можна распазнаць больш яснае і поўнае значэнне некаторых дэталяў культу або зразумець і адкрыць для сябе яго новыя аспекты.

110. Некалькі святых жанчынаў распавялі пра свой досвед сустрэчы з Хрыстом. Характэрнай рысай гэтага досведу з’яўляецца адпачынак у Сэрцы Пана, крыніцы жыцця і ўнутранага супакою. Так адбывалася са св. Лютгардай, св. Мехтыльдай з Хакеборна, св. Анэляй з Фаліньё, Юльянай з Норвіча і іншымі. Святая Гертруда з Хельфты, манахіня-

цыстэрцыянка, апавядала пра малітву, падчас якой яна паклала галаву на Сэрца Хрыста і слухала біццё Ягонага сэрца. У размове са св. Янам Евангелістам яна спыталася, чаму ў сваім Евангеллі ён не сказаў, што адчуў тое ж самае на грудзях Езуса. Гертруда сцвярджае, што «салодкі гук гэтых удараў сэрца захаваны для сучаснасці, каб, слухаючы іх, састарэлы і цёплы ў любові да Бога свет зноў стаўся гарачым» [98]. Ці можам мы палічыць яе словы пасланнем нашаму часу, заклікам прызнаць, наколькі «састарэў» гэты свет, які ўсцяж мае патрэбу прыняць новае пасланне Хрыстовай любові? Аднымі з «найбольш блізкіх давераных асобаў Найсвяцейшага Сэрца» лічыліся св. Гертруда і св. Мехтыльда [99].

111. Картузы, заахвочаныя перадусім Людольфам з Саксоніі, знайшлі ў пабожнасці да Найсвяцейшага Сэрца спосаб напоўніць адносіны з Езусам Хрыстом любоўю і блізкасцю. Хто ўваходзіць праз рану Ягонага Сэрца, той разгараецца любоўю. Святая Кацярына Сіенская пісала, што цярпенні, якія перанёс Пан, мы не можам бачыць, але адкрытае Сэрца Хрыста з’яўляецца для нас магчымасцю жывой і асабістай сустрэчы з такой вялікай любоўю: «Вось чаму Я хацеў адкрыць табе таямніцу Свайго Сэрца, дазваляючы табе ўбачыць яго адчыненым, каб ты магла зразумець, што Я люблю цябе нашмат больш, чым мог паказаць перажытымі цярпеннямі» [100].

112. Набажэнства да Сэрца Хрыста паступова выходзіць за межы манаскага жыцця і напаўняе духоўнасць святых настаўнікаў, прапаведнікаў і заснавальнікаў законніцкіх кангрэгацый, якія распаўсюджваюць яго ў самых аддаленых кутках свету [101].

113. Асаблівую цікавасць выклікала ініцыятыва св. Яна Эда, які «пасля вельмі гарачай місіі ў Рэне са сваімі місіянерамі здолеў атрымаць згоду біскупа гэтай дыяцэзіі на цэлебрацыю ўрачыстасці Найсвяцейшага Сэрца Пана нашага Езуса Хрыста. Тады ўпершыню гэтае свята было афіцыйна зацверджана Касцёлам. Пазней, у перыяд з 1670 па 1671 гг., біскупы Кутанса, Эўрэ, Байё, Лізьё і Руана таксама дазволілі адзначаць гэтае свята і ў сваіх дыяцэзіях [102].

## СВЯТЫ ФРАНЦІШАК САЛЬСКІ

114. У нашы дні заслугоўвае ўвагі ўнёсак св. Францішка Сальскага. Ён часта кантэмпляваў адкрытае Сэрца Хрыста, якое запрашае нас пасяліцца ў Ім праз асабістыя адносіны любові, у якіх асвятляюцца таямніцы жыцця. У разважаннях гэтага святога доктара можна заўважыць, як перад абліччам строгай маралі або рэлігійнасці, заснаванай толькі на прытрымліванні запаведзяў, Сэрца Хрыста явілася яму як запрашэнне дарэшты даверыцца таямнічаму дзеянню Яго ласкі. У лісце да баранесы дэ Шанталь ён піша: «Я ўпэўнены, што мы больш не застанёмся ў сабе [...] мы будзем вечна жыць у прабітым боку Збаўцы, таму што без Яго мы не толькі не можам, але нават калі б маглі, то не хацелі б “нічога не зрабіць”» [103].

115. Для св. Францішка Сальскага сапраўднае набажэнства не мела нічога агульнага з забабонамі або павярхоўнай пабожнасцю, паколькі прадугледжвала асабістыя адносіны, у якіх кожны адчувае сябе перад Хрыстом ўнікальным чалавекам, распазнаным у сваёй непаўторнай рэальнасці, кожны ведае, што Хрыстус памятае пра яго і ставіцца непасрэдным і выключным чынам: «Гэта найцудоўнейшае і наймілейшае сэрца нашага Настаўніка, палаючае любоўю, якую Ён вызнае нам, сэрца, у якім мы бачым запісанымі ўсе нашыя імёны […]. Безумоўна, ёсць вялікае суцяшэнне ў тым, што наш Пан так моцна нас любіць і заўсёды носіць у сваім Сэрцы» [104]. Праз вобраз уласнага імя, запісанага ў Сэрцы Хрыста, св. Францішак Сальскі спрабаваў сімвалічна паказаць, да якой ступені любоў Хрыста да кожнага чалавека не з'яўляецца абстрактнай ані агульнай, але персаналізаванай, дзякуючы якой веруючы адчувае сябе ацэненым і прызнаным: «Якое прыгожае неба цяпер, калі Збаўца – ягонае сонца, а Яго грудзі – крыніца любові, з якой благаслаўлёныя п’юць уволю. Кожны ідзе кантэмпляваць Яго і бачыць сваё імя, напісанае знакамі любові, якія можа прачытаць толькі сапраўдная любоў і якія толькі сапраўдная любоў здольная запісаць. Ах, мая дарагая Дачка, а нашыя ці будуць там? Так, яны будуць, без сумневу, бо хоць у нашым сэрцы яшчэ няма поўнай любові, у ім ёсць прагненне любові і яе пачатак» [105].

116. Ён лічыў гэты досвед фундаментальным для духоўнага жыцця, ставіць гэтае перакананне ў шэраг вялікіх праўдаў веры: «Так, мая дарагая Дачка, Ён думае пра цябе, і не толькі пра цябе, але і пра найменшы волас на тваёй галаве. Гэта праўда веры, і ні ў якім разе нельга ў ёй сумнявацца» [106]. У выніку, вернік атрымлівае здольнасць поўнасцю прысвяціць сябе Сэрцу Хрыста, у якім ён знаходзіць супакой, суцяшэнне і моц: «О Божа! Якое шчасце быць вось так у абдымках і на грудзях [Збаўцы]. […] Заставайся так, дарагая Дачка, будзь яшчэ адным маленькім св. Янам: пакуль іншыя спажываюць розныя стравы за сталом Збаўцы, адпачывай і проста даверліва пакладзі сваю галаву, душу, свой дух на любячых грудзях дарагога Пана» [107]. «Спадзяюся, што духам ты знаходзішся ў пячоры галубкі і ў прабітым баку нашага дарагога Збаўцы. […] Які добры Пан, мая дарагая Дачка! Якое добрае Ягонае Сэрца! Застанемся тут, у Ягоным святым жыллі» [108].

117. Але, верны свайму навучанню на тэму святасці ў штодзённым жыцці, ён прапануе, каб асвячэнне перажывалася сярод спраў, заданняў і абавязкаў штодзённага жыцця: «Пытаешся ў мяне, як душы, прыцягнутыя ў малітве да гэтай святой прастаты і дасканалай адданасці Богу, павінны паводзіць сябе ва ўсіх сваіх дзеяннях? Я адказваю, што не толькі ў малітве, але і ў звычайным жыцці яны павінны нязменна крочыць у духу прастаты, прысвячаць і аддаваць волі Божай усю душу, учынкі і дасягненні з дасканалай любоўю і абсалютным даверам, аддаючыся ласцы і апецы вечнай любові, якую Божы Провід мае да іх» [109].

118. Разважаючы пра сімвал, які мог бы абагульніць яго прапанову духоўнага жыцця, ён заканчвае: «Я падумаў, дарагая Маці, калі ты пагодзішся, узяць у якасці герба пранізанае дзвюма стрэламі сэрца ў цярновым вянку» [110].

119. Пад жыватворным уплывам духоўнасці св. Францішка Сальскага напрыканцы XVII ст. адбыліся пэўныя падзеі ў Парэ-ле-Маніяль. Святая Маргарыта Марыя Алякок распавяла пра важныя аб’яўленні з канца снежня 1673 да чэрвеня 1675 года. Галоўнай з’яўляецца дэкларацыя любові, якая прагучала ў першым вялікім аб’яўленні. Езус кажа: «Маё Божае Сэрца так распалілася любоўю да людзей, і асабліва да цябе, што ўжо не мае магчымасці больш стрымліваць у сабе полымя гэтай гарачай любові, хоча выліць яе праз цябе і аб’явіць людзям, узбагаціць іх каштоўнымі дарамі, якія цяпер Я адкрываю табе» [111].

120. Святая Маргарыта Марыя выказваецца пра сваё бачанне моцна і палымяна: «Ён адкрыў перада мной усе цуды сваёй любові і неспасцігальныя таямніцы Найсвяцейшага Сэрца, якія да таго часу заўсёды былі схаваныя ад мяне. Тут Ён адкрыў мне іх упершыню; але так рэальна і адчувальна, што, мяркуючы па наступствах, якія выклікала ўва мне гэтая ласка, Ён не пакінуў прычынаў для сумневу» [112]. У наступных аб’яўленнях прыгажосць гэтага паслання яшчэ раз пацвярджаецца: «Ён адкрыў мне невымоўныя цуды сваёй чыстай любові і да якой празмернасці прывяла Яго любоў да людзей» [113].

121. Гэтае моцнае ўсведамленне любові Езуса Хрыста, якое нам пакінула ў спадчыну св. Маргарыта Марыя, можа стаць каштоўным стымулам для нашай еднасці з Ім. Мы не павінны адчуваць сябе абавязанымі прыняць або засвоіць усе дэталі яе духоўнага перажывання, у якім, як гэта часта здараецца, чалавечыя элементы, спалучаныя з нашымі ўласнымі жаданнямі, клопатамі і ўнутранымі вобразамі, змешваюцца з боскім дзеяннем [114]. Падобную духоўную прапанову трэба заўсёды перачытваць у святле Евангелля і ўсёй багатай духоўнай традыцыі Касцёла, адначасова разумеючы, колькі дабра яна прынесла многім братам і сёстрам. Мы можам распазнаць дары Духа Святога ў гэтым вопыце веры і любові. Больш важным за дэталі з’яўляецца сутнасць паслання, якое перадаецца нам і якое можна абагульніць словамі, якія пачула св. Маргарыта: «Вось Сэрца, якое так моцна палюбіла людзей, што ні ў чым не шкадавала сябе, цалкам вычарпалася і ахвяравалася, каб паказаць ім сваю любоў» [115].

122. Гэтае аб’яўленне запрашае нас узрастаць у сустрэчы з Хрыстом, бязмежна давяраючы Ягонай любові, пакуль мы не дасягнём поўнага і канчатковага з’яднання: «Неабходна, каб Божае Сэрца Езуса настолькі замяніла нашае, каб Ён адзіны жыў і дзейнічаў у нас і для нас; каб Ягоная воля […] магла дзейнічаць без ніякага супраціву з нашага боку; і, нарэшце, каб Ягоныя пачуцці, думкі і жаданні занялі месцы нашых і перш за ўсё Ягоная любоў, якая будзе любіць Яго ў нас і дзеля нас. І вось такім Сэрцам, якое з’яўляецца нашым усім ва ўсім, мы зможам сказаць разам са св. Паўлам, што жывём ужо не мы, але Ён жыве ў нас» [116].

123. Насамрэч, у першым атрыманым пасланні св. Маргарыта Марыя прадставіла гэты досвед больш асабіста і канкрэтна, з палымянасцю і пяшчотай: «Тады Ён пажадаў майго

сэрца, і я прасіла ўзяць яго. Ён узяў яго і занурыў у сваё цудоўнае Сэрца, у якім паказаў маё сэрца, як маленькі атам, які згарэў у гэтай распаленай печы» [117].

124. У іншым месцы заўважаем, што тым, хто дае нам сябе, з'яўляецца ўваскрослы Хрыстус, поўны хвалы, поўны жыцця і святла. Нягледзячы на тое, што Ён неаднойчы гаворыць пра пакуты, якія перанёс дзеля нас, пра няўдзячнасць, з якой сутыкаецца, вылучаюцца не кроў і балючыя раны, але святло і агонь Жывога Пана. Раны Мукі, якія не знікаюць, цяпер перамененыя. Такім чынам, Пасхальная таямніца абʼяўляецца ва ўсёй паўнаце: «У адну з пятніц, калі быў выстаўлены Найсвяцейшы Сакрамэнт [...], мне з'явіўся Езус Хрыстус, мой любы Настаўнік, увесь у ззянні славы, з пяццю ранамі, якія свяціліся, быццам пяць сонцаў, і полымя вырывалася з Ягонай найсвяцейшай чалавечнасці ва ўсіх накірунках, асабліва з цудоўных грудзей, падобных да распаленай печы. Калі яны раскрыліся, я ўбачыла Яго Сэрца, якое ўсіх ахінае любоўю і само вартае ўсялякай любові. Яно было жывой крыніцай гэтага полымя. Менавіта тады Ён разгарнуў перада мною невыказныя цуды сваёй чыстай любові і паказаў, як моцна палюбіў нас, людзей, хоць мы адплачваем Яму толькі няўдзячнасцю і пагардай» [118].

СВЯТЫ КЛОД ДЭ ЛЯ КАЛАМБʼЕР

125. Калі св. Клод дэ ля Каламбʼер даведаўся пра досвед св. Маргарыты, ён адразу ж стаў яе абаронцам і пачаў пашыраць змест абʼяўленняў, якія яна атрымала. Ён адыграў асаблівую ролю ў разуменні і распаўсюджванні набажэнства да Найсвяцейшага Сэрца, а таксама ў яго інтэрпрэтацыі ў святле Евангелля.

126. Хоць некаторыя выразы св. Маргарыты, няправільна зразуметыя, могуць прывесці да празмернай упэўненасці ва ўласных актах прысвячэння і ахвярах, св. Клод паказвае, што сузіранне Сэрца Хрыста, калі яно сапраўднае, не выклікае ні самазадаволенасці, ні пыхі адносна досведу і чалавечых высілкаў, але неапісальную зануранасць у Хрыста, якая напаўняе жыццё супакоем, бяспекай і рашучасцю. Ён вельмі добра выказаў гэты бязмежны давер у знакамітай малітве:

«Мой Божа, я перакананы, што Ты апякуешся ўсімі, хто на Цябе спадзяецца, і што ні ў чым не мае нястачы той, хто ўсяго чакае ад Цябе. Таму пастанаўляю з гэтага часу жыць без аніякіх турботаў і ўсе свае трывогі ўскласці на Цябе […].Я ніколі не страчу надзеі, наадварот, захаваю яе да апошняга моманту жыцця, і намаганні ўсіх дэманаў пекла вырваць яе ў мяне будуць марнымі […]. Няхай іншыя шукаюць шчасця ў багацці або ў талентах; няхай іншыя абапіраюцца на нявіннасць свайго жыцця або на суровасць свайго пакаяння, на колькасць сваёй міласціны або на палкасць сваіх малітваў; што тычыцца мяне, Пане, давер да Цябе – адзінае маё спадзяванне. Такі давер яшчэ нікога не падводзіў. […] Таму я ўпэўнены, што буду навекі шчаслівы, бо цвёрда на гэта спадзяюся, бо менавіта ад Цябе, мой Божа, паходзіць уся мая надзея» [119].

127. У студзені 1677 г. св. Клод пакінуў нататку, у якой, адзначыўшы ўпэўненасць, якую адчуваў адносна сваёй місіі, напісаў далей: «Я зразумеў, што Бог жадае, каб я служыў Яму, стараючыся споўніць Ягоныя жаданні адносна набажэнства, якое Ён прапанаваў пэўнай асобе, з якой Ён размаўляе вельмі канфідэнцыйна, і для дабра якой хацеў выкарыстаць маю слабасць» [120].

128. Важна адзначыць, што ў духоўнасці Каламб’ера існуе цудоўны сінтэз паміж багатым і прыгожым духоўным досведам св. Маргарыты і вельмі канкрэтным сузіраннем ігнацыянскіх практыкаванняў. Ён пісаў на пачатку Трэцяга тыдня 30-дзённых практыкаванняў: «Дзве рэчы надзвычай мяне ўзрушылі. Першая – гэта настрой, з якім Езус Хрыстус выходзіць насустрач тым, хто Яго шукае. Ягонае сэрца патанае ў моры горычы: усе пачуцці ўзрушаныя, уся натура ў трывозе, аднак пасярод усёй гэтай бязладзіцы і ўсіх гэтых спакусаў Сэрца скіравана наўпрост да Бога; Ён без ваганняў выбірае тое, што прапануе цнота, прычым найвышэйшая з цнотаў […]. Другая рэч – пастава таго ж Сэрца ў адносінах да Юды, які здрадзіў Яго; да Апосталаў, якія баязліва пакінулі Яго; да святароў ды іншых адказных за пераслед, які Ён цярпеў, – нічога не здолела выклікаць у Ім ані найменшага пачуцця нянавісці ці абурэння […]. Так што я ўяўляю гэтае Сэрца без горычы, без злосці, поўным сапраўднай пяшчоты да сваіх ворагаў» [121].

## СВ. ШАРЛЬ ДЭ ФУКО І СВ. ТЭРЭЗА АД ДЗІЦЯТКА ЕЗУС

129. Святы Шарль дэ Фуко і св. Тэрэза ад Дзіцятка Езус, самі таго не жадаючы, змянілі некаторыя элементы набажэнства да Сэрца Хрыста, спрыяючы больш вернаму разуменню Евангелля. Варта звярнуць увагу на тое, як гэтае набажэнства праявілася ў іх жыцці. У наступным раздзеле мы разгледзім арыгінальнасць місійнага вымярэння, якое гэтыя святыя развівалі па-свойму.

### *Iesus Caritas*

130. У горадзе Луі св. Шарль дэ Фуко наведваў Найсвяцейшы Сакрамэнт са сваёй стрыечнай сястрой мадам дэ Бондзі, і аднойчы яна паказала абраз Найсвяцейшага Сэрца [122]. Яна, па словах самога Шарля, адыграла галоўную ролю ў яго навяртанні: «Паколькі Бог зрабіў цябе першай прыладай Сваёй міласэрнасці да мяне, з цябе пачалося ўсё астатняе. Калі б ты не навярнула мяне, не прывяла да Езуса і не вучыла крок па кроку, слова за словам, усяму святому і добраму, ці быў бы я сёння там, дзе я ёсць?» [123]. А тым, што яна ў ім абудзіла, было гарачае ўсведамленне любові Езуса, якое змяшчала ў сабе ўсё і значыла найбольш. І сканцэнтравалася яно ў набажэнстве да Сэрца Хрыста, дзе Шарль знайшоў бязмежную міласэрнасць: «Будзем спадзявацца на бясконцую міласэрнасць таго, чыё сэрца ты дала мне спазнаць» [124].

131. Пазней духоўны настаўнік, абат Анры Гувелін, дапамог яму паглыбіць разуменне гэтай

каштоўнай таямніцы: «Гэтае благаслаўлёнае сэрца, пра якое ты мне столькі разоў казаў» [125]. Шарль прысвяціў сябе 6 чэрвеня 1889 г. Найсвяцейшаму Сэрцу, у якім знайшоў абсалютную любоў. Ён кажа Хрысту: «Ты асыпаў мяне такімі дабротамі, што мне здаецца няўдзячнасцю да Твайго сэрца не верыць, што яно гатова асыпаць мяне ўсялякім дабром, нават самым найбольшым, і што Твая любоў і шчодрасць не маюць меры» [126]. Ён будзе пустэльнікам «пад іменем сэрца Езуса» [127].

132. У той самы дзень, 17 мая 1906 г., калі брат Шарль больш не можа адзін цэлебраваць св. Імшу, ён напісаў, што абяцае «дазволіць сэрцу Езуса жыць ува мне, каб жыў не я, а Сэрца Езуса жыло ўва мне, як Ён жыў у Назарэце» [128]. У сяброўстве з Езусам, ад сэрца да сэрца, не было нічога падобнага да асабістай пабожнасці. Яно натхнялася суровым назарэтанскім жыццём, праз якое Шарль хацеў наследаваць Хрыста і быць падобным да Яго. Гэтае чулае набажэнства да Сэрца Хрыста вельмі выразна паўплывала на лад жыцця. «Назарэт» Шарля жывіўся гэтымі асабістымі адносінамі з Сэрцам Хрыста.

*Св. Тэрэза ад Дзіцятка Езус*

133. Як і св. Шарль дэ Фуко, св. Тэрэза ад Дзіцятка Езус натхнялася вялікай пабожнасцю, якая ахапіла Францыю ў XIX стагоддзі. Айцец Альмірэ Пішон быў духоўным кіраўніком яе сям’і і лічыўся вялікім апосталам Найсвяцейшага Сэрца. Адна з сясцёр узяла законніцкае імя «Марыя ад Найсвяцейшага Сэрца», а кляштар, у які ўступіла св. Тэрэза, быў прысвечаны Найсвяцейшаму Сэрцу. Тым не менш, яе адданасць набыла некаторыя адметныя рысы ў параўнанні са звычайнай пабожнасцю таго часу.

134. Ва ўзросце пятнаццаці гадоў яна падсумавала свае адносіны з Езусам такім чынам: «Той, чыё Сэрца б’ецца ва ўнісон з маім» [129]. Праз два гады, калі з ёй гаварылі пра Сэрца, укаранаванае цернем, яна дадала ў лісце: «Ты добра ведаеш, што я не гляджу на Найсвяцейшае Сэрца, як усе. Я думаю, што сэрца майго Умілаванага належыць толькі мне, гэтак жа як маё – толькі Яму, і тады я гавару з Ім у гэтай цудоўнай адзіноце сэрцам да сэрца, чакаючы моманту, калі змагу сузіраць Яго тварам у твар!» [130].

135. У адным з вершаў яна выказала значэнне сваёй пабожнасці, заснаванай больш на сяброўстве і даверы, чым на ўпэўненасці ў сваім адрачэнні:

«Мне патрэбна Сэрца, якое гарыць пяшчотай,

Якое вечна будзе мне апорай,

Якое любіць ува мне ўсё, нават маю слабасць...

І не пакіне мяне ні ўдзень, ні ўночы...

Я павінна мецьБога, які апрануты ў маю чалавечую прыроду

І становіцца мне братам, і церпіць!...

Ах! Я добра ведаю, што ўся наша справядлівасць

У тваіх боскіх вачах нічога не варта…

Так што я сваім чыстцам

Абіраю Тваю палаючую любоў, о Сэрца майго Бога!» [131]

136. Магчыма, самым важным тэкстам для разумення значэння набажэнства св. Тэрэзы да Сэрца Хрыста з'яўляецца ліст, які яна напісала за тры месяцы да смерці свайму сябру Морысу Бельеру: «Калі я бачу, як Магдалена выходзіць наперад, у прысутнасці шматлікіх гасцей, і палівае сваімі слязамі ногі свайго дарагога Настаўніка, да якога яна дакранаецца ўпершыню, то адчуваю, што сэрцам яна спасцігла бяздонныя глыбіні любові і міласэрнасці Хрыстовага сэрца і, якой бы вялікай грэшніцай яна не была, гэтае любячае Сэрца прагне не толькі яе прабачыць, але нават адарыць ласкамі сваёй боскай блізкасці і ўзняць да самых высокіх вяршынь сузірання. Дарагі маленькі брат, паколькі мне таксама было дадзена зразумець любоў сэрца Езуса, я прызнаюся, што яна выгнала ўсялякі страх з майго сэрца. Памяць пра мае недахопы ўпакорвае мяне і прымушае ніколі не спадзявацца на ўласныя сілы, бо яны з'яўляюцца толькі слабасцю; але больш за ўсё гэтая памяць кажа мне пра міласэрнасць і любоў» [132].

137. Маралізатары, якія імкнуцца трымаць у цуглях міласэрнасць і ласку, маглі б заявіць, што яна выказалася так, бо была святой, але грэшны чалавек не мог бы гэтага пацвердзіць. Такім чынам яны прыбіраюць з духоўнасці св. Тэрэзы ад Дзіцятка Езуса яе цудоўную навізну, якая адлюстроўвае сутнасць Евангелля. На жаль, у некаторых хрысціянскіх колах мы часта сутыкаемся са спробай замкнуць Духа Святога ў пэўную схему, якая дазваляе трымаць усё пад сваім наглядам. Аднак св. Тэрэза, мудры доктар Касцёла, прымушае іх замаўчаць і выразна супярэчыць такой рэдуктыўнай інтэрпрэтацыі: «Нават калі б я здзейсніла ўсе магчымыя злачынствы, то заўсёды мела б той самы давер; я адчуваю, што ўсё гэтае мноства правінаў было б толькі кропляй вады, укінутай у распаленую печ» [133].

138. Сястры Марыі, якая хваліла яе за велікадушную любоў да Бога і гатоўнасць да мучаніцкай смерці, Тэрэза напісала падрабязны адказ, які на сённяшні дзень з'яўляецца адной з вялікіх вех у гісторыі духоўнасці. Гэты тэкст варты тысячаразовага прачытання за сваю глыбіню, яснасць і прыгажосць. Ліст заахвочвае сястру «ад Найсвяцейшага Сэрца» не засяроджваць гэтае набажэства на аспекце пакутаў, бо некаторыя разумелі ўміласціўленне перадусім як назапашванне ахвяр або добрых учынкаў. А Тэрэза, наадварот, толькі давер

лічыць найлепшай ахвярай, мілай Сэрцу Хрыста: «Мае жаданні мучаніцтва нішто, не яны даюць мне той бязмежны давер, які адчуваю ў сэрцы. Па праўдзе кажучы, духоўныя багацці робяць чалавека несправядлівым, калі ён самазадаволена спадзяецца на іх і лічыць нечым вялікім. […] Яму прыемна бачыць, як я люблю сваю маленькасць і сваю беднасць, Яму падабаецца мая сляпая надзея на Яго міласэрнасць… Гэта мой адзіны скарб […] Калі б ты хацела адчуць радасць або схільнасць да цярпення, то шукала б свайго суцяшэння […]. Зразумей, што для таго, каб любіць Езуса, каб быць Ягонай ахвярай любові, – чым хтосьці слабейшы, без жаданняў і цнотаў, тым больш паддаецца дзеянню гэтай паглынальнай і перамяняючай Любові. […] О, як я хацела б даць табе зразумець, што я адчуваю…! Гэта давер і нічога, акрамя даверу, мае весці нас да Любові» [134].

139. У многіх сваіх тэкстах яна звяртае ўвагу на барацьбу з формамі духоўнасці, якія занадта сканцэнтраваны на чалавечых намаганнях, уласных заслугах, ахвяраванні адрачэнняў, на тых ці іншых практыках, каб «заслужыць неба». Для яе «заслуга заключаецца не ў тым, каб шмат рабіць і даваць, а ў тым, каб атрымліваць» [135]. Яшчэ раз перачытаем некаторыя вельмі важныя тэксты, дзе яна настойвае на гэтым шляху, які з’яўляецца простым і хуткім спосабам здабыць Пана праз сэрца.

140. Так яна піша сваёй сястры Леані: «Запэўніваю цябе, што Бог значна лепшы, чым ты думаеш. Ён задавольваецца адным позіркам, адным уздыхам любові... І я думаю, што дасканаласць вельмі лёгка практыкаваць, бо я зразумела, што трэба толькі здабыць Езуса сэрцам... Паглядзі на малое дзіця, якое толькі што раззлавала сваю маці […]. Калі яно прыйдзе, працягне свае маленькія ручкі, усміхнецца і скажа: «Пацалуй мяне, матуля, я больш не буду так рабіць», хіба маці не абдыме яго пяшчотна і не забудзе ўсе дзіцячыя свавольствы? Насамрэч яна добра ведае, што яе малое пры першай магчымасці вернецца да ранейшага; але гэта не бяда: калі дзіця зноў здабудзе яе сэрца, то ніколі не будзе пакаранае» [136].

141. У лісце а. Адольфу Рулану яна піша: «Мой шлях – давер і любоў, і я не разумею душ, якія баяцца такога пяшчотнага Сябра. Часам, калі чытаю некаторыя духоўныя трактаты, у якіх дасканаласць аточана тысячай перашкод і мноствам ілюзій, мой бедны малы розум хутка стамляецца, я зачыняю вучоную кнігу, якая распірае мне галаву і сушыць сэрца, і бяру ў рукі Святое Пісанне. Тады ўсё нібы напаўняецца святлом, адно слова адкрывае перад маёй душой бясконцыя гарызонты, дасканаласць здаецца мне лёгкай: я бачу, што дастаткова прызнаць сваю нікчэмнасць і кінуцца, як дзіця, у абдымкі Бога» [137].

142. Звяртаючыся да а. Морыса Бельера, яна згадвае бацьку адной сям’і і піша: «Я не веру, што сэрца гэтага шчаслівага бацькі можа супрацьстаяць сыноўняму даверу дзіцяці, шчырасць і любоў якога ён ведае. Аднак усведамляе, што сын яшчэ не раз упадзе ў тыя ж правіны, але гатовы заўсёды прабачыць, калі сын зноў возьме яго за сэрца» [138].

УПЛЫЎ НА ТАВАРЫСТВА ЕЗУСА

143. Мы ўбачылі, як св. Клод дэ ля Каламб’ер аб’яднаў духоўны досвед св. Маргарыты са зместам «Духоўных практыкаванняў». Лічу, што месца Найсвяцейшага Сэрца ў гісторыі Таварыства Езуса заслугоўвае некалькіх кароткіх словаў.

144. Духоўнасць Таварыства Езуса заўсёды прапаноўвала «глыбокае пазнанне Пана […], каб я больш Яго любіў і больш рашуча ішоў следам за Ім» [139]. Святы Ігнацый у сваіх «Духоўных практыкаваннях» запрашае нас затрымацца над Евангеллем, якое кажа, што быў «паранены дзідай Ягоны бок, і выцекла вада і кроў» [140]. Калі чалавек, які робіць духоўныя практыкаванні, стаіць перад прабітым бокам Пана, Ігнацый прапануе яму ўвайсці ў Сэрца Хрыста. Так нашыя сэрцы могуць пасталець пад апекай таго, хто быў «настаўнікам пачуццяў», як назваў св. Ігнацыя ў адным з лістоў да яго св. Пётр Фабэр [141]. Езуіт Хуан Альфонса дэ Паланка ў біяграфіі св. Ігнацыя таксама піша, што «кардынал Кантарыні знайшоў у асобе айца Ігнацыя настаўніка пачуццяў». Размовы з Панам, якія прапануе св. Ігнацый у духоўных практыкаваннях, з’яўляюцца істотнай часткай выхавання сэрца, таму што мы перажываем і смакуем сэрцам евангельскае пасланне і абмяркоўваем яго з Панам. Святы Ігнацый кажа, што мы можам перадаць свае справы Пану і прасіць у Яго парады. Любы ўдзельнік рэкалекцый можа прызнаць, што ў Практыкаваннях адбываецца дыялог сэрца з сэрцам.

145. У канцы медытацыі св. Ігнацый запрашае таго, хто робіць духоўныя практыкаванні, стаць ля падножжа Крыжа і з вялікай любоўю звярнуцца да ўкрыжаванага Пана, пытаючы Яго, «як адзін сябар размаўляе з другім або як слуга размаўляе са сваім гаспадаром», што ён мае зрабіць для Яго [143]. Увесь шлях практыкаванняў завяршаецца «сузіраннем, каб дасягнуць любові», з якой нараджаецца ўдзячнасць і ахвяраванне «памяці, розуму і волі» Сэрцу, якое з’яўляецца крыніцай і пачаткам усялякага дабра [144]. Такое ўнутранае пазнанне Пана не выпрацоўваецца нашымі здольнасцямі і намаганнямі, але выпрошваецца як дар.

146. Гэты ж досвед суправаджае доўгі шэраг святароў езуітаў, якія выразна спасылаліся на Сэрца Езуса, такіх як св. Францішак Борджа, св. Пётр Фабэр, св. Альфонс Радрыгес, айцец Альварэс дэ Пас, айцец Вінчэнца Карафа, айцец Каспэр Дружбіцкі і многія іншыя. У 1883 г. езуіты абвясцілі, што «Таварыства Езуса з духам, перапоўненым радасцю і ўдзячнасцю, прымае і бярэ лёгкі цяжар, які Пан наш Езус Хрыстус даручыў яму, каб практыкаваць, падтрымліваць і распаўсюджваць набажэнства да Яго Найсвяцейшага Сэрца» [145]. У снежні 1871 г. айцец Пітэр Ян Бэкс прысвяціў Таварыства Найсвяцейшаму Сэрцу Езуса, і ў знак таго, што па-ранейшаму гэта застаецца часткай жыцця Таварыства, а. Пэдра Арупэ ў 1972 г. аднавіў прысвячэнне з упэўненасцю, якую патлумачыў наступнымі словамі: «Я хачу сказаць Таварыству тое, аб чым, на мой погляд, не варта маўчаць. З часоў навіцыяту я заўсёды быў перакананы, што гэтак званае «Набажэнства да Найсвяцейшага Сэрца» ўяўляе

сабой сімвалічны выраз найглыбейшага ігнацыянскага духу і мае незвычайную эфектыўнасць – *ultra quam speraverint* – як для асабістай дасканаласці, так і для апостальскай плённасці. І гэтае перакананне ў мяне захавалася. (…) У гэтым набажэнстве я знаходжу адну з найглыбейшых крыніцаў свайго духоўнага жыцця» [146].

147. Калі св. Ян Павел ІІ заклікаў «усіх членаў Таварыства з яшчэ большым запалам пашыраць гэтую пабожнасць, якая больш чым калі-небудзь адпавядае спадзяванням нашага часу», ён зрабіў гэта таму, што бачыў цесную сувязь, якая існуе паміж набажэнствам да Сэрца Хрыста і ігнацыянскай духоўнасцю, бо жаданне «глыбока пазнаваць Пана» і «размаўляць» з Ім, сэрца да сэрца, – дзякуючы «Духоўным практыкаванням» – з’яўляецца характэрнай рысай ігнацыянскага духоўнага і апостальскага дынамізму, цалкам і поўнасцю адданага служэнню любові Божага Сэрца» [147].

ШЫРОКАЯ ПЛЫНЬ ДУХОЎНАГА ЖЫЦЦЯ

148. Набажэнства да Сэрца Хрыста прысутнічае на духоўным шляху многіх вельмі розных святых, і ў кожным з іх гэтае набажэнства набывае новыя аспекты. Напрыклад, св. Вінцэнт дэ Поль казаў, што Бог прагне сэрца: «Бог перадусім просіць нашага сэрца – нашага сэрца – і гэта галоўнае. Чаму так ёсць, што чалавек, які не мае багацця, будзе мець большую заслугу, чым той, хто мае вялікую маёмасць і адмаўляецца ад яе? Таму што той, хто нічога не мае, больш любіць Бога. А гэтага Бог жадае асаблівым чынам» [148]. Гаворка ідзе пра згоду злучыць сваё сэрца з сэрцам Хрыста. «Штосьці неверагоднае! Сястра робіць усё магчымае, каб падрыхтаваць сэрца да з’яднання з сэрцам нашага Пана (...), колькі ж благаслаўленняў яна можа чакаць ад Бога!» [149].

149. Здараецца, мы адчуваем спакусу разглядаць гэтую таямніцу любові як цудоўную рэч мінулага, як прыгожую духоўнасць з іншых часоў, таму трэба зноў і зноў прыгадваць сабе, як казаў святы місіянер, што «гэтае Божае Сэрца, якое дазволіла прабіць сябе варожай дзідай, каб выліць са святой раны сакрамэнты, дзякуючы якім быў утвораны Касцёл, ні ў якім разе не перастала любіць» [150]. Больш сучасныя святыя, такія як св. Піо з П’етрэльчыны, св. Тэрэза з Калькуты і многія іншыя са шчырай адданасцю гавораць пра Сэрца Хрыста. Я хацеў бы таксама ўзгадаць досвед св. Фаўстыны Кавальскай, праз які яна аднаўляе набажэнства да Сэрца Хрыста з моцным акцэнтам на хвалебным жыцці Уваскрослага Пана і Божай міласэрнасці. Фактычна, пад уплывам яе досведу і абапіраючыся на духоўную спадчыну св. біскупа Юзафа Себасцьяна Пельчара (1842-1924) [151], св. Ян Павел ІІ спалучыў сваё разважанне аб міласэрнасці з набажэнствам да Сэрца Хрыста: «Здаецца, Касцёл асаблівым чынам вызнае Божую міласэрнасць і ўшаноўвае яе, звяртаючыся да Сэрца Хрыста. Сапраўды, менавіта набліжэнне да Хрыста ў таямніцы Ягонага Сэрца дазваляе нам затрымацца ў гэтым пункце (…) аб’яўлення міласэрнай любові Айца, якая ўтварае цэнтральнае ядро месіянскай місіі Сына Чалавечага» [152]. Сам св. Ян Павел ІІ, маючы на ўвазе Найсвяцейшае Сэрца, зрабіў вельмі асабістае прызнанне: «Яно

прамаўляла да мяне з самага юнацтва» [153].

150. Актуальнасць набажэнства да Сэрца Хрыста асабліва відавочная ў евангелізацыйнай і адукацыйнай дзейнасці шматлікіх жаночых і мужчынскіх кангрэгацый, якія з самага пачатку былі пазначаны гэтым хрысталагічным духоўным досведам. Згадваць іх усіх можна было б бясконца. Разгледзім усяго два прыклады, узятыя наўздагад: «Заснавальнік [св. Даніэль Камбоні] знайшоў у таямніцы Сэрца Езуса сілу для сваёй місійнай дзейнасці» [154]. «Ахінутыя любоўю Сэрца Езуса, мы імкнёмся да ўзрастання людзей у іх чалавечай годнасці і ў годнасці Божых сыноў і дачок, абапіраючыся на Евангелле і яго патрабаванні любові, прабачэння, справядлівасці і салідарнасці з беднымі і адкінутымі» [155]. Падобным чынам і размешчаныя па ўсім свеце санктуарыі, прысвечаныя Сэрцу Хрыста, з'яўляюцца захапляльнай крыніцай духоўнасці і руплівасці. Усім, хто нейкім чынам удзельнічае ў дзейнасці гэтых месцаў веры і міласэрнасці, удзяляю сваё айцоўскае благаслаўленне.

## НАБАЖЭНСТВА СУЦЯШЭННЯ

151. Рана ў баку Уваскрослага, з якой цячэ жывая вада, застаецца адкрытай. Вялікая рана ад дзіды, а таксама раны ад цярновага вянка, якія часта можна заўважыць на выявах Найсвяцейшага Сэрца, з'яўляюцца неад'емнай часткай набажэнства, паколькі ў іх мы сузіраем любоў Езуса Хрыста, які склаў сябе ў ахвяру да канца. Сэрца Уваскрослага захоўвае гэтыя знакі поўнай ахвяры, спалучанай з велізарным цярпеннем дзеля нас. Таму ў пэўным сэнсе непазбежна, што вернік захоча адгукнуцца не толькі на бязмерную любоў, але і на боль, які Хрыстус пагадзіўся вытрымаць з прычыны такой вялікай любові.

### *З Ім на крыжы*

152. Варта ўспомніць асобны аспект духоўнасці, якая склалася вакол Сэрца Хрыста: унутранае жаданне суцешыць Яго. Зараз я не буду разглядаць практыку «ўміласціўлення», бо я лічу больш адпаведным разгледзець яе ў кантэксце сацыяльнага вымярэння гэтай пабожнасці, што і зраблю ў наступным раздзеле. Тут я хацеў бы толькі засяродзіцца на жаданні, якое часта ўзнікае ў напоўненым любоўю сэрцы верніка, калі ён сузірае таямніцу Мукі Хрыста і перажывае яе не проста як таямніцу, якая захоўваецца ў памяці, але якая моцай ласкі робіцца прысутнай для нас, ці яшчэ лепш, дае нам магчымасць містычна прысутнічаць у моманце нашага адкуплення. Калі Умілаваны па-сапраўднаму нам дарагі, то як жа можам не захацець суцешыць Яго?

153. Папа Пій XI імкнуўся даць аснову гэтаму досведу і заахвочваў прызнаць, што таямніца Адкуплення праз Муку Хрыста, дзякуючы Божай ласцы, выходзіць за межы часу і прасторы. На крыжы Ён аддаў сябе за ўсе грахі, у тым ліку за тыя, што яшчэ не былі здзейсены, – нашыя грахі. Падобным чынам нашыя ўчынкі, якія мы ахвяруем сёння дзеля Яго суцяшэння, выходзяць за межы часу і дасягаюць Ягонага параненага сэрца: «Калі з-за нашых грахоў,

хоць бы і будучых, аднак ужо прадбачаных, душа Езуса засмучалася аж да смерці, несумненна, Ён атрымаў не меншае суцяшэнне ад нашага ўміласціўлення, таксама будучай, але прадбачанай, у момант, калі «з’явіўся Яму анёл з неба» (Лк 22, 43), каб суцешыць Сэрца, прыгнечанае смуткам і болем. І таму нават цяпер – цудоўным, але праўдзівым спосабам – мы можам і павінны суцяшаць Найсвяцейшае Сэрца, якое няспынна раняць грахамі няўдзячныя людзі» [156].

*З прычыны сэрца*

154. Можа здацца, што гэты выраз пабожнасці не мае дастатковага тэалагічнага абгрунтавання, аднак сэрца мае свае прычыны. *Sensus fidelium* адчувае, што тут ёсць нешта таямнічае, за межамі нашай чалавечай логікі, і што Мука Хрыста – гэта не проста факт мінулага: мы можам удзельнічаць у ёй праз веру. Для пабожнасці вернікаў разважанне над ахвярай Хрыста на крыжы з’яўляецца нечым большым, чым успамінам пра падзею мінулага. Гэтае перакананне мае трывалую тэалагічную аснову [157]. Мы можам яшчэ дадаць усведамленне нашых уласных грахоў, якія Ён нёс на сваіх зраненых плячах, і сваёй недасканаласці перад абліччам такой вялікай любові, якая заўсёды бясконца пераўзыходзіць нас.

155. У любым выпадку, мы задаёмся пытаннем, як можна звяртацца да жывога, уваскрослага, поўнасцю шчаслівага Хрыста і ў той жа час суцяшаць Яго ў цярпенні. Прымем да ўвагі той факт, што ўваскрослае Сэрца захоўвае сваю рану як пастаянную памяць і што дзеянне ласкі дае магчымасць выявіцца досведу, які не цалкам змяшчаецца ў храналагічным моманце. Гэтыя два перакананні дазваляюць нам прызнаць, што мы стаім перад містычным шляхам, які пераўзыходзіць здольнасці розуму і выражае рэчаіснасць, падказаную самім Божым словам. «Але, – піша Папа Пій XI, – як гэтыя акты ўміласціўлення і могуць суцешыць Хрыста, які шчасліва валадарыць у нябёсах? Мы адказваем словамі св. Аўгустына: “Дай мне сэрца, якое любіць, і яно зразумее, што я кажу” (*In Ioannis Evangelium tract.* XXIV, 4). Калі той, хто моцна любіць Бога, глядзіць у мінулае, то бачыць Езуса Хрыста, які дзейнічае дзеля чалавека, зносіць боль, церпіць вельмі жорсткія катаванні “за нас, людзей, і дзеля нашага збаўлення”, амаль знішчаны смуткам, трывогай, прыніжэннем і ўрэшце “раздаўлены за нашыя правіны” (Іс 53, 5), аздараўляе нас сваімі ранамі. Чым больш пабожныя душы разважаюць гэтыя рэчы, тым ясней бачаць, што грахі людзей, калі б не былі ўчыненыя, сталіся прычынай таго, што Сын Божы быў выданы на смерць» [158].

156. Гэтае вучэнне Пія XI заслугоўвае ўвагі. Бо калі Святое Пісанне сцвярджае, што вернікі, якія не жывуць згодна са сваёй верай, «крыжуюць у сабе Сына Божага» (Гбр 6, 6), або калі цярпеннямі за іншых «дапаўняю недахоп у маім целе пакутаў Хрыста» (Клс 1, 24), або што Хрыстус падчас Мукі маліўся не толькі за сваіх тагачасных вучняў, але і «за тых, хто паверыць у Мяне паводле слова іхняга» (Ян 17, 20), то разбурае нашыя абмежаваныя схемы. Пісанне паказвае таксама, што немагчыма цалкам аддзяліць мінулае ад сучаснасці,

нават калі розум не можа гэтага растлумачыць. Ва ўсім сваім багацці Евангелле было напісана не толькі для малітоўнага разважання і памяці, але і для перажывання любові, як ва ўчынках, так і ў духоўным  жыцці. Безумоўна, гэта асабліва датычыць таямніцы смерці і ўваскрасення Хрыста. Часовыя падзелы, якімі карыстаецца наш розум, здаецца, няздольныя ахапіць паўнату гэтага досведу веры, у якім еднасць з церпячым Хрыстом спалучаецца з моцай, суцяшэннем і сяброўствам, ад якіх мы атрымліваем асалоду разам з Уваскрослым.

157. Цяпер мы бачым еднасць Пасхальнай таямніцы ў двух яе непадзельных аспектах, якія ўзаемна асвятляюцца. Гэтая унікальная таямніца, прысутная праз ласкў у сваіх двух вымярэннях, азначае, што ў любы час, калі мы спрабуем ахвяраваць Хрысту нашыя пакуты дзеля Яго суцяшэння, яны асвятляюцца і перамяняюцца пасхальным святлом любові. Мы ўдзельнічаем у гэтай таямніцы ў сваім жыцці, таму што сам Хрыстус найперш захацеў удзельнічаць у гэтым жыцці, Ён хацеў загадзя перажыць як Галава тое, што спазнае цела Касцёла, як у ранах, так і ў суцяшэннях. Калі мы жывем у ласцы Божай, гэты ўзаемны ўдзел становіцца для нас духоўным досведам. Карацей кажучы, гэта Уваскрослы праз дзеянне сваёй ласкі дазваляе таямнічым чынам з’яднацца з Мукай. Веруючыя сэрцы, якія жывуць радасцю ўваскрасення, ведаюць гэта, але адначасова жадаюць удзельнічаць у лёсе свайго Пана. Яны гатовыя прыняць удзел у болю, стомленасці, расчараваннях і страхах, якія з’яўляюцца часткай жыцця. Яны не перажываюць такой таямніцы ў адзіноце, бо гэтыя раны ў роўнай ступені з’яўляюцца ўдзелам у лёсе Містычнага цела Хрыста, святога пілігрымуючага Божага народу, і падзяляюць лёс Хрыста ў кожным часе і месцы гісторыі. Пабожнасць суцяшэння не з’яўляецца пазагістарычнай ані абстрактнай, а становіцца целам і крывёй на шляху Касцёла.

*Скруха*

158. Нястрымнае жаданне суцешыць Хрыста, якое нараджаецца падчас балеснага сузірання таго, што Ён выцерпеў за нас, узрастае па меры шчырага прызнання сваіх дрэнных звычак, прывязанасцяў, адсутнасці радасці ў веры, марных памкненняў і, акрамя канкрэтных грахоў, неадпаведнасці нашага сэрца Яго любові і задуме. Усведамленне гэтага ачышчае нас, бо любоў патрабуе ачышчэння праз слёзы, пасля якіх мы больш прагнем Бога і менш апантаныя самім сабой.

159. Такім чынам, жаданне суцешыць Пана паглыбляецца па меры паглыблення скрухі і жалю ў сэрцы веруючага. Жаль за грахі – «гэта не пачуццё віны, якое збівае з ног, не скрупулёзнасць, якая паралізуе, але дабратворнае джала, якое пячэ нутро і ацаляе, таму што сэрца, калі бачыць сваё зло і прызнае сябе грэшнікам, раскрываецца і прымае дзеянне Духа Святога, жывой вады, якая ўзрушвае і выклікае слёзы на вачах […]. Гэта не азначае шкадаваць сябе, такую спакусу мы часта адчуваем […]. Плакаць над сабой азначае сур’ёзна раскайвацца ў тым, што засмуцілі Бога грахом; прызнаць, што мы заўсёды ў даўгах і ніколі

не з’яўляемся крэдыторамі […]. Як кропля точыць камень, так слёзы павольна точаць зацвярдзелыя сэрцы. І мы становімся сведкамі цуду смутку, добрага смутку, які вядзе да супакою. […] Жаль не з’яўляецца плёнам нашай працы, бо ён, хутчэй, ласка, і менавіта як ласку, трэба выпрошваць яго ў малітве» [159]: «прасіць аб журбе разам з Хрыстом журботным, аб цярпенні (сэрца) з Хрыстом церпячым, аб слязах і ўнутраным болю з-за такой вялікай мукі, якую Хрыстус выцерпеў дзеля мяне» [160].

160. Таму прашу, каб ніхто не высмейваў праявы гарачай веры святога і вернага Божага народа, які ў сваёй народнай пабожнасці стараецца суцешыць Хрыста. І я запрашаю кожнага спытаць сябе, ці няма больш рацыянальнасці, больш праўды і больш мудрасці ў пэўных праявах гэтай любові, якая імкнецца суцешыць Пана, чым у халодных, безуважных, разлічаных і намінальных актах любові, на якія здольныя мы, сцвярджаючы, што маем веру больш рэфлексійную, развітую і сталую.

*Суцешаныя, каб суцяшаць*

161. У сузіранні Хрыстовага Сэрца, якое аддаецца без рэшты, мы знахозім суцяшэнне. Боль у сэрцы саступае месца поўнаму даверу, і ўрэшце застаецца ўдзячнасць, пяшчота, спакой, Яго любоў запаўняе жыццё. Скруха «не робіць балюча, а вызваляе душу ад цяжару, бо ўздзейнічае на рану граху, рыхтуючы нас прыняць ласку Пана» [161]. А наша цярпенне яднаецца з цярпеннем Хрыста на крыжы, бо калі мы кажам, што ласка дазваляе нам пераадольваць усе адлегласці, то і Хрыстус у час цярпення быў з’яднаны з усімі цярпеннямі сваіх вучняў на працягу ўсёй гісторыі. Такім чынам, у сваім цярпенні мы можам адчуць духоўнае суцяшэнне, ведаючы, што сам Хрыстус церпіць з намі. Шукаючы магчымасці суцешыць Яго, мы будзем суцешаныя.

162. Аднак у пэўны момант гэтага сузірання мы павінны пачуць пільны вокліч Пана: «Суцешце, суцешце народ Мой!» (Іс 40, 1). Прыгадваюцца словы св. Паўла, які падкрэслівае, што Бог нас суцяшае, «каб мы маглі суцяшаць усіх засмучаных тым суцяшэннем, якім Бог суцяшае нас саміх» (2 Кар 1, 4).

163. Гэтыя словы заахвочваюць нас паспрабаваць цяпер паглыбіць супольнаснае, сацыяльнае і місійнае вымярэнне кожнага сапраўднага набажэнства да Сэрца Хрыста. Бо калі Сэрца Хрыста вядзе нас да Айца, то адначасова пасылае да братоў. У пладах служэння, братэрства і місіі, якія прыносіць праз нас Сэрца Хрыста, спаўняецца воля Айца. Такім чынам кола замыкаецца: «Гэтым будзе ўслаўлены Айцец Мой, калі вы прынясеце багаты плён» (Ян 15, 8).

## V. ЛЮБОЎ ДЛЯ ЛЮБОВІ

164. У духоўным досведзе св. Маргарыты Марыі разам з палымяным вызнаннем любові да Езуса Хрыста мы знаходзім таксама глыбока асабістае і хвалюючае запрашэнне даверыць Яму сваё жыццё. Усведамленне таго, што нас любяць, і наш поўны давер да гэтай любові зусім не перакрэсліваюць жадання быць шчодрымі ў адказ, нягледзячы на нашую крохкасць і шматлікія недахопы.

ПЛАЧ І ПРОСЬБА

165. Пачынаючы з другога вялікага аб’яўлення св. Маргарыце, Езус выказвае сум з-за таго, што Ягоная вялікая любоў да людзей «не атрымала ўзамен нічога, акрамя няўдзячнасці і абыякавасці», «холаду і пагарды». «Гэта мне баліць больш, – кажа Пан, – чым усё, што Я выцерпеў падчас Мукі» [162].

166. Езус кажа пра сваю прагу быць любімым, паказвае нам, што Ягонаму Сэрцу не ўсё роўна, як мы адказваем на Ягонае жаданне: «Я прагну, але гэта такая пякучая прага быць любімым людзьмі ў Найсвяцейшым Сакрамэнце, што яна паліць Мяне; і Я не знаходжу нікога, хто прыкладае намаганні, згодна з Маім жаданнем, каб патушыць Маю прагу, адказваючы ўзаемнасцю на Маю любоў» [163]. Езус просіць любові, і як толькі веруючае сэрца ўсведамляе гэта, у адказ спантанна нараджаецца любоў, а не імкненне памнажаць адрачэнні ці проста выконваць цяжкі абавязак: «Я атрымала ад Бога шчодрыя ласкі Ягонай любові і адчула ў сабе гарачае жаданне адказаць на некаторыя з іх – адказаць любоўю на любоў» [164]. Як адзначыў мой папярэднік Леў XIII, праз вобраз Найсвяцейшага Сэрца любоў Хрыста «заахвочвае нас аддаваць любоў за любоў» [165].

БЫЦЬ ПРАЦЯГАМ ЯГО ЛЮБОВІ ПРАЗ ЛЮБОЎ ДА НАШЫХ БРАТОЎ

167. Нам трэба вярнуцца да Божага слова, каб зразумець, што найлепшы адказ на любоў Ягонага Сэрца гэта любоў да братоў; няма большага жэсту, які мы можам прапанаваць, каб адказаць любоўю на любоў. Божае слова кажа пра гэта з поўнай яснасцю:

«Сапраўды кажу вам: тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі» (Мц 25, 40).

«Увесь Закон спаўняецца ў адным: любі бліжняга свайго, як самога сябе» (Гал 5, 14).

«Мы ведаем, што перайшлі ад смерці да жыцця, таму што любім братоў. Хто не любіць, застаецца ў смерці» (1 Ян 3, 14).

«Хто не любіць свайго брата, якога бачыць, не можа любіць Бога, якога не бачыць» (1 Ян 4, 20).

168. Любоў да братоў не ўзнікае сама па сабе, не з’яўляецца вынікам нашых натуральных намаганняў, яна патрабуе перамены эгаістычнага сэрца. Тады спантанна нараджаецца знакамітая просьба: «Езу, учыні сэрцы нашыя да Твайго падобнымі». Менавіта таму св. Павел заахвочваў не проста «старацца рабіць добрыя справы». Яго запрашэнне было больш дакладным: «Няхай вашыя думкі будуць такімі, як у Хрысце Езусе» (Флп 2,5).

169. Варта ўзгадаць, што ў Рымскай імперыі многія беднякі, чужынцы і іншыя адрынутыя знаходзілі павагу, зычлівасць і апеку ў хрысціянаў. Таму мы можам лепш зразумець думку імператара-адступніка Юліяна, які задаваўся пытаннем, чаму хрысціяне карыстаюцца такой павагай і падтрымкай, і лічыў, што адной з прычын была дапамога бедным і чужынцам, бо Імперыя ігнаравала і пагарджала імі. Імператар не мог пагадзіцца з тым, што беднякі атрымлівалі дапамогу не ад яго, і што ненавісныя хрысціяне «апроч сваіх, кармілі яшчэ і нашых» [166]. У сваім лісце ён асабліва падкрэслівае неабходнасць стварэння дабрачынных устаноў, каб канкураваць з хрысціянамі і заваяваць павагу грамадства: «Адчыняй у кожным горадзе шматлікія прытулкі, каб чужынцы маглі карыстацца нашай чалавечнасцю […]. Прывучай элінаў да ўчынкаў міласэрнасці» [167]. Аднак ён не дасягнуў сваёй мэты, верагодна, па той прычыне, што за гэтымі справамі не было нічога падобнага да хрысціянскай любові, якая шануе непаўторную годнасць кожнага чалавека.

170. Яднаючыся з тымі, хто знаходзіцца на ніжэйшых узроўнях сацыяльнай ступені (пар. Мц 25, 31-46), «Езус прынёс вялікую навізну прызнання годнасці кожнай асобы, а таксама (і перш за ўсё) тых людзей, якія кваліфікаваліся як “нягодныя”. Гэты новы ў гісторыі чалавецтва прынцып, паводле якога чалавек тым больш “годны” павагі і любові, чым больш ён слабы, няшчасны і церпячы, аж да страты самой чалавечай «постаці», змяніў аблічча свету, стаўшы пачаткам узнікнення ўстаноў, якія апякуюцца людзьмі ў цяжкіх умовах: пакінутымі немаўлятамі, сіротамі, адзінокімі старымі, псіхічна хворымі, людзьмі з невылечнымі хваробамі або з сур’ёзнымі дэфармацыямі, і тымі, якія жывуць на вуліцы» [168].

171. Праз прызму раны Ягонага Сэрца позірк на Пана, які «ўзяў на сябе нашую слабасць і панёс нашыя хваробы» (Мц 8, 17), дапамагае нам звярнуць больш увагі на пакуты і патрэбы іншых, робіць нас дастаткова моцнымі для ўдзелу ў Ягонай збаўчай справе ў якасці прылады для пашырэння Ягонай любові [169]. Калі мы разважаем пра ахвяру Хрыста, прынесеную за ўсіх людзей, то непазбежна апынаемся перад пытаннем, чаму мы не здольныя аддаць жыццё за іншых: «Па гэтым пазналі мы любоў, што Ён аддаў за нас сваё жыццё. І мы павінны аддаць жыццё сваё за братоў» (1 Ян 3, 16).

## РЭЗАНАНС У ГІСТОРЫІ ДУХОЎНАСЦІ

172. Гэты саюз паміж набажэнствам да Сэрца Езуса і адданасцю братам праходзіць праз усю гісторыю хрысціянскай духоўнасці. Разгледзім некалькі прыкладаў.

*Быць крыніцай для іншых*

173. Пачынаючы з Арыгена, некалькі Айцоў Касцёла ў сваіх разважаннях пра тэкст Яна 7, 38 – «з улоння пацякуць рэкі вады жывой» – адзначалі, што гэтыя словы адносяцца да веруючага, хоць “рэкі вады жывой” цякуць тады калі ён сам выпіў Хрыста. Такім чынам, еднасць з Хрыстом не толькі наталяе смагу, але і чыніць нас крыніцамі жывой вады для іншых. Арыген пісаў, што Хрыстус выконвае сваё абяцанне і робіць так, што з нас струменяць патокі вады: «Душа чалавека, створаная паводле Божага вобраза, можа змяшчаць і выліваць студні, крыніцы і рэкі» [170].

174. Святы Амброзій раіў піць з Хрыста, «каб біла ўнутры вас крыніца вады, што цячэ ў вечнае жыццё» [171]. А Марыё Віктарын сцвярджаў, што Дух Святы даецца ў такой колькасці, што «той, хто Яго прымае, стаецца ўлоннем, якое вылівае рэкі жывой вады» [172]. Святы Аўгустын казаў, што гэтай ракой, якая выцякае з веруючага, ёсць добразычлівасць [173]. Святы Тамаш Аквінскі таксама сцвярджаў, што калі хтосьці «спяшаецца перадаць іншым розныя дары ласкі, якую атрымаў ад Бога, з яго ўлоння цячэ жывая вада» [174].

175. Хоць «крыжовая ахвяра, прынесеная з любоўю і паслухмянасцю сэрца, з’яўляецца надзвычай багатай і бясконцай сатысфакцыяй за грахі роду чалавечага» [175], Касцёл, народжаны з Сэрца Хрыста, пашырае і ва ўсе часы паўсюдна перадае плады гэтай адзінай збаўчай Мукі, якая вядзе людзей да непасрэднай еднасці з Панам.

176. Унутры Касцёла пасрэдніцтва Марыі, Заступніцы і Маці, можна зразумець толькі «як удзел у гэтай адзінай крыніцы, якой з’яўляецца пасрэдніцтва самога Хрыста» [176], адзінага Адкупіцеля, і «Касцёл без вагання вызнае такую падпарадкаваную ролю Марыі» [177]. Набажэнства да Сэрца Марыі не мае на мэце аслабіць тую выключную адарацыю, якая належыць Сэрцу Хрыста, але хутчэй паглыбіць яе: «Мацярынская роля Марыі ў дачыненні да людзей ніякім чынам не закрывае і не прыніжае гэтага адзінага пасрэдніцтва Хрыста, але наадварот паказвае яго моц» [178]. Дзякуючы невычэрпнай крыніцы з адкрытага боку Хрыста, Касцёл, Марыя і ўсе вернікі па-свойму становяцца каналамі жывой вады. Такім чынам сам Хрыстус паказвае сваю хвалу ў нашай нікчэмнасці.

*Братэрства і містыка*

177. Святы Бэрнард, запрашаючы нас з’яднацца з Сэрцам Хрыста, карыстаецца багаццем гэтага набажэнства, каб заклікаць да навяртання, заснаванага на любові. Ён верыў, што нашыя пачуцці, зняволеныя асалодамі, усё ж могуць перамяніцца і вызваліцца – не праз сляпую паслухмянасць загаду, але ў адказ на слодыч любові Хрыста. Зло перамагаецца дабром. Зло перамагаецца ўзрастаннем любові: «Таму любі Пана, Бога твайго, з усёй любоўю сэрца; любі Яго з усёй мудрасцю і пільнасцю розуму; любі Яго з усіх сіл, каб нават не баяцца памерці з любові да Яго [...]. Няхай Пан Езус будзе салодкі і лагодны для твайго

сэрца, насуперак падманным прыемнасцям цялеснага жыцця: няхай Ягоная слодыч перамагае другую, як цвік выбівае цвік» [179].

178. Святы Францішак Сальскі быў асабліва ўражаны просьбай Езуса: «Навучыцеся ад Мяне, бо Я ціхі і пакорны сэрцам» (Мц 11, 29). Менавіта так, на яго думку, праз самыя простыя і звычайныя рэчы мы «крадзём» сэрца Пана: «Тыя, хто жадае служыць Яму належным чынам, павінны зважаць не толькі на ўзнёслыя і важныя рэчы, але і на малыя і дробныя, бо аднымі і другімі аднолькава мы можам заваяваць Яго сэрца праз любоў […] Я маю на ўвазе штодзённыя ахвяры, боль галавы, зубны боль ці іншая хвароба, дакучлівыя звычкі мужа ці жонкі, разбітая шклянка, нечая пагарда ці надзьмутасць, страта пальчатак, пярсцёнка, насоўкі, намаганне рана класціся спаць і ўставаць на досвітку дзеля малітвы ці святой Камуніі, нязначная сарамлівасць, якую некаторыя людзі адчуваюць пры публічным выкананні рэлігійных абавязкаў… Будзьце пэўныя, што ўсе гэтыя дробныя прыкрасці, прынятыя з любоўю, найбольш падабаюцца дабрыні Божай» [180]. Але, у рэшце рэшт, ключом да нашага адказу на любоў Сэрца Хрыста з'яўляецца любоў да бліжняга: «цвёрдая, пастаянная, нязменная любоў, якая, не спыняючыся ні на дробязях, ні на якасцях або стане людзей, не падлягае зменам або варожасці […]. Наш Пан любіць нас няспынна […], цярпліва зносіць нашыя недахопы і недасканаласці, таму неабходна, каб мы рабілі тое самае ў адносінах да нашых братоў, ніколі не стамляючыся іх цярпець» [181].

179. Святы Шарль дэ Фуко хацеў наследаваць Езуса Хрыста, жыць як Ён, дзейнічаць, як Ён, заўсёды рабіць тое, што рабіў бы Езус на яго месцы. Каб цалкам дасягнуць гэтай мэты, ён мусіў мець тыя ж пачуцці, што і Сэрца Хрыста. У яго словах мы зноў сустракаем выраз «любоў за любоў»: «Жаданне цярпець, каб на любоў адказаць любоўю, наследаваць Яго, (...) прыняць удзел у Ягонай працы, разам з Ім аддаць сябе, нягледзячы на нікчэмнасць, якой я з'яўляюся, як прынашэнне, як ахвяру для асвячэння людзей» [182]. Жаданне несці любоў Езуса, місійная дзейнасць сярод самых бедных і забытых на зямлі людзей натхніла яго ўзяць сваім дэвізам словы «*Iesus Caritas*», а сімвалам – Сэрца Хрыста, увенчанае крыжам [183]. Ягонае рашэнне не было павярхоўным: «З усіх сілаў я стараюся паказаць і даказаць гэтым бедным згубленым братам, што наша рэлігія – гэта абсалютная міласэрнасць, абсалютнае братэрства, што яе сімвал – Сэрца» [184]. Ён вырашыў пасяліцца з іншымі братамі «ў Марока ў імя Сэрца Езуса» [185]. Менавіта так іх евангелізацыйная справа мела б заззяць: «Любоў павінна выпраменьвацца з братэрства, як выпраменьваецца з сэрца Езуса» [186]. Гэтае жаданне паступова зрабіла яго «братам для кожнага», таму што, дазваляючы Сэрцу Хрыста фармаваць сябе, ён жадаў прытуліць у сваім братэрскім сэрцы ўсё церпячае чалавецтва: «Нашае сэрца, як і сэрца Касцёла, як і Езус, павінна агарнуць усіх людзей» [187]. «Любоў Сэрца Езуса да людзей, любоў, якую Ён паказаў у сваёй Муцы, трэба мець нам да ўсіх людзей» [188].

180. Ксёндз Анры Гувелін, духоўны кіраўнік св. Шарля дэ Фуко, казаў, што «калі наш Пан жыве ў сэрцы, то дае яму такія пачуцці, і гэтае сэрца адкрываецца для малых. Такой была

пастава сэрца Вінцэнта дэ Поля [...]. Калі наш Пан жыве ў душы святара, Ён схіляе яе да бедных» [189]. Важна адзначыць, што гэтае прысвячэнне св. Вінцэнта, якое апісвае кс. Гувелін, таксама жывілася набажэнствам да Сэрца Хрыста. Святы Вінцэнт заклікаў нас «узяць з сэрца нашага Пана некалькі слоў суцяшэння» [190] для беднага хворага. Для таго, каб гэта ажыццявілася, неабходна, каб уласнае сэрца было пераменена любоўю і лагоднасцю Сэрца Хрыста. Святы Вінцэнт часта паўтараў гэтае перакананне ў сваіх казаннях і парадах, аж да таго, што яно стала заўважальным аспектам Канстытуцыі ягонай кангрэгацыі: «Няхай кожны прыкладзе таксама ўсе намаганні, каб засвоіць гэты ўрок, які даў нам Езус Хрыстус: “Навучыцеся ад Мяне, бо Я ціхі і пакорны сэрцам”; будзем памятаць, што, як Ён сам кажа, лагодныя атрымаюць у спадчыеу зямлю; практыкуючы гэтую цноту, будзем здабываць сэрцы людзей, каб навярнуць іх да Бога, чаго не могуць дасягнуць тыя, хто паводзіць сябе ў адносінах да бліжніх жорстка і сурова» [191].

*Уміласціўленне: будаванне на руінах*

181. Усё вышэйсказанае дазваляе зразумець у святле Божага слова, якое значэнне мы павінны надаваць «уміласціўленню» Сэрца Хрыста і якой «ахвяры» Пан, з дапамогай Сваёй ласкі, насамрэч чакае ад нас. Пра гэта вялося шмат дыскусій, але св. Ян Павел II даў ясны адказ, каб мы, хрысціяне, пайшлі ў кірунку духу ўміласціўлення ў большай гармоніі з Евангеллем.

*Сацыяльны сэнс уміласціўлення Сэрца Хрыста*

182. Святы Ян Павел II патлумачыў, што праз поўнае адданне Сэрцу Хрыста, «на руінах, якія пакінулі пасля сябе нянавісць і насілле, можа быць пабудавана жаданая цывілізацыя любові, Валадарства Сэрца Хрыста». Несумненна, гэта азначае, што мы здольныя «паяднаць сыноўнюю любоў да Бога з любоўю да бліжняга», і такім чынам, «гэта і ёсць сапраўднае ўміласціўленне, аб якім просіць Сэрца Збаўцы» [192]. Мы пакліканыя да таго, каб разам з Хрыстом будаваць новую цывілізацыю любові на руінах, якія праз свой грэх пакідаем у гэтым свеце. Вось уміласціўленне, якога чакае ад нас Сэрца Хрыста. Сярод знішчэння, якое пакінула зло, Сэрца Хрыста пажадала запатрабаваць нашага супрацоўніцтва для аднаўлення дабра і прыгажосці ў свеце.

183. Сапраўды, кожны грэх наносіць шкоду Касцёлу і грамадству, таму «кожнаму граху можна прыпісаць характар сацыяльнага граху», хоць гэта асабліва датычыць некаторых грахоў, якія «па сваёй сутнасці з’яўляюцца прамым нападам на свайго бліжняга» [193]. Святы Ян Павел II патлумачыў, што паўтарэнне гэтых грахоў супраць іншых часта прыводзіць да ўмацавання «структуры граху», якая ўплывае на развіццё народаў [194]. Часта гэта становіцца элементам дамінуючай ментальнасці, якая лічыць нармальным або рацыянальным тое, што на самай справе ёсць эгаізмам і абыякавасцю. Гэтую з’яву можна вызначыць як «сацыяльнае адчужэнне»: «Адчужаным з’яўляецца грамадства, якое праз

формы сацыяльнай арганізацыі, вытворчасці і спажывання ўскладняе як рэалізацыю гэтага дару, так і будаванне салідарнасці між людзьмі» [195]. Не толькі маральная норма падштурхоўвае нас супраціўляцца гэтым адчужаным сацыяльным структурам, выяўляць іх і падтрымліваць сацыяльны дынамізм, які аднаўляе і будуе дабро, але тое самае «навяртанне сэрца», якое «накладае абавязак» [196] выправіць гэтыя структуры. Гэта наш адказ любячаму Сэрцу Езуса Хрыста, якое вучыць нас любіць.

184. Менавіта таму, што евангельскае ўміласціўленне мае такое моцнае сацыяльнае значэнне, нашыя ўчынкі любові, служэння і паяднання, каб па-сапраўднаму быць кампенсацыяй, маюць патрэбу ў тым, каб Хрыстус іх натхняў, матываваў і дапамагаў іх рабіць. Святы Ян Павел II таксама казаў, што «для пабудовы цывілізацыі любові» сённяшняму чалавецтву неабходна Сэрца Хрыста [197]. Хрысціянскае ўміласціўленне нельга разумець толькі як сукупнасць знешніх спраў, неабходных, а часам і вартых захаплення. Патрэбна «містыка», душа, сэнс, якія нададуць дзеянню моц, размах, нястомную творчасць. Патрэбна жыццё, агонь і святло, якія паходзяць з Сэрца Хрыста.

*Загаіць параненыя сэрцы*

185. З іншага боку, толькі знешняга ўміласціўлення недастаткова ні для свету, ні для Сэрца Хрыста. Калі кожны чалавек задумаецца над уласнымі грахамі і іх наступствамі для іншых, то зразумее, што кампенсацыя за шкоду, учыненую гэтаму свету, таксама мае на ўвазе жаданне загаіць параненыя сэрцы, дзе была нанесена самая вялікая шкода, самая балючая рана.

186. Дух уміласціўлення «заахвочвае нас спадзявацца, што кожная рана можа загаіцца, нават глыбокая. Поўная кампенсацыя шкоды часам здаецца немагчымай, калі маёмасць або блізкія канчаткова страчаны, або калі некаторыя сітуацыі сталі незваротнымі. Але намер кампенсаваць і жаданне зрабіць штосьці канкрэтнае ў гэтым накірунку – істотныя ўмовы для працэсу прымірэння і вяртання супакою ў сэрца» [198].

*Прыгажосць просьбы аб прабачэнні*

187. Недастаткова добрага намеру, патрэбны духоўны дынамізм жадання, які выкліча знешнія наступствы ў выглядзе ўчынкаў. Карацей кажучы, «уміласціўленне, каб быць хрысціянскім і закрануць сэрца пакрыўджанага чалавека, а не застацца простым актам камутатыўнай справядлівасці, прадугледжвае дзве патрабавальныя паставы: прызнанне віны і просьбу аб прабачэнні [...]. Менавіта з сумленнага прызнання крыўды, учыненай брату, і з глыбокага і шчырага ўсведамлення, што была паранена любоў, нараджаецца жаданне выправіць шкоду» [199].

188. Не трэба думаць, што прызнанне ўласнага граху перад іншымі з’яўляецца чымсьці

прыніжальным або шкодным для чалавечай годнасці. Наадварот, азначае спыненне хлусні самому сабе, прызнанне сваёй уласнай гісторыі такой, якая яна ёсць, пазначаная грахом, асабліва калі мы прычынілі шкоду нашым братам: «Абвінавачванне сябе – частка хрысціянскай мудрасці. […] Гэта падабаецца Пану, бо Пан прымае скрушанае сэрца» [200].

189. Да гэтага духу ўміласціўлення належыць звычай прасіць у братоў прабачэння, які сведчыць аб вялікай высакароднасці, нягледзячы на нашую чалавечую слабасць. Просьба аб прабачэнні – спосаб аздараўлення адносінаў, таму што «яна ўзнаўляе дыялог і дэманструе жаданне аднавіць сувязь братэрскай міласэрнасці […], кранае сэрца брата, суцяшае і натхняе прыняць прабачэнне. І нават, калі непапраўнае немагчыма цалкам выправіць, заўсёды можна адрадзіць любоў і зрабіць рану зноснай» [201].

190. Сэрца, здольнае да пакаяння, можа ўзрастаць у братэрстве і салідарнасці, бо, «хто не плача, той збочвае, унутрана старэе, а хто дасягае больш простай і асабістай малітвы, якая складаецца з адарацыі і захаплення Богам, той сталее. Менш лучыцца з сабой, а больш з Хрыстом, і становіцца ўбогім духам. Адчувае сябе бліжэй да бедных, якіх Бог асабліва ўмілаваў» [202]. У выніку ўзнікае сапраўдны дух уміласціўлення, бо «той, хто мае скруху ў сэрцы, адчувае сябе большым братам для ўсіх грэшнікаў свету, большым братам без паказвання сваёй перавагі або рэзкага асуджэння, але з жаданнем любіць і выпраўляць шкоду [203]. Гэтая салідарнасць, народжаная скрухай, робіць магчымым прымірэнне. Чалавек, які здольны да пакаяння, «замест таго, каб гневацца ці абурацца злом, якое здзяйсняюць яго браты, плача з прычыны іх грахоў. Не спакушаецца. Адбываецца своеасаблівы пераварот, калі натуральная схільнасць быць паблажлівым да сябе і няўмольным да іншых пермяняецца, і дзякуючы ласцы Божай чалавек становіцца патрабавальным да сябе і міласэрным да іншых» [204].

## УМІЛАСЦІЎЛЕННЕ: ПАШЫРЭННЕ СЭРЦА ХРЫСТА

191. Існуе яшчэ адзін дадатковы спосаб разумення ўміласціўлення, які дазваляе змясціць яе ў яшчэ больш непасрэдную сувязь з Сэрцам Хрыста, не выключаючы з гэтага ўміласціўлення канкрэтнага абавязацельства на карысць нашых братоў, пра якое было сказана раней.

192. У іншым месцы я сцвярджаў, што Бог «хацеў абмежаваць самога сябе», а «многія рэчы, якія мы лічылі злом, небяспекай або крыніцай цярпення, на самой справе з’яўляюцца часткай болю нараджэння, які абуджае нас супрацоўнічаць са Стварыцелем» [205]. Нашае супрацоўніцтва можа дазволіць Божай сіле і любові распаўсюдзіцца ў асабістым жыцці і ў свеце, тады як адмова ці абыякавасць могуць стаць перашкодай. Некаторыя біблійныя выразы метафарычна кажуць пра гэта, напрыклад, калі Пан патрабуе: «Калі здзейсніш навяртанне, Ізраэль, [...] вярніся да Мяне» (Ер 4, 1). Або калі перад тварам непрыняцця свайго народа кажа: «Узварухнулася ўва Мне сэрца Маё і распаліўся жаль Мой» (Ос 11, 8).

193. Хоць нельга казаць пра новыя цярпенні ўслаўленага Хрыста, «Пасхальная таямніца Хрыста [...] і ўсё, чым ёсць Хрыстус, і ўсё, што Ён зрабіў і выцерпеў дзеля людзей, удзельнічае ў Божай вечнасці, ахоплівае ўсе часы і пастаянна прысутнічае ў іх» [206]. Такім чынам, можна сказаць, што Ён сам згадзіўся абмежаваць экспансіўную хвалу свайго ўваскрасення, стрымаць распаўсюджванне сваёй велізарнай і гарачай любові, каб пакінуць месца для нашага свабоднага супрацоўніцтва з Яго Сэрцам. Гэта настолькі рэальна, што нашая адмова спыняе гэты імпульс ахвярнасці гэтак жа, як давер і адданасць адкрываюць прастору, прапануюць бесперашкодны канал для вылівання Ягонай любові. Наша непрыняцце або абыякавасць абмяжоўваюць дзеянне Ягонай моцы і плённасць любові ў нас. Калі Ён не знаходзіць ува мне даверу і адкрытасці, Ягоная любоў пазбаўлена – бо Ён сам гэтага пажадаў – свайго працягу, унікальнага і непаўторнага, у маім жыцці і ў свеце, дзе Ён кліча мяне сведчыць пра Ягоную прысутнасць. І гэта вынікае не са слабасці Пана, але з бясконцай свабоды, парадаксальнай сілы і дасканалай любові да кожнага з нас. Калі Божая ўсемагутнасць аб'яўляецца ў слабасці нашай чалавечай свабоды, «толькі вера можа распазнаць яе» [207].

194. Святая Маргарыта Марыя апавядае, што ў адным з аб'яўленняў Хрыстус казаў пра Сэрца, якое палае любоўю да нас, што «не мае магчымасці больш стрымліваць у сабе полымя гэтай гарачай любові, хоча выліць яе праз цябе і аб'явіць людзям» [208]. Паколькі Пан, які можа ўсё, у сваёй боскай свабодзе захацеў мець патрэбу ў нас, уміласціўленне належыць разумець як знішчэнне перашкодаў, якія мы ставім перад пашырэннем любові Хрыста ў свеце, бо нам нестае даверу, удзячнасці і самаахвярнасці.

*Ахвяраванне дзеля любові*

195. Лепшаму разважанню над гэтай таямніцай чарговы раз спрыяе светлая духоўнасць св. Тэрэзы ад Дзіцятка Езус. Яна ведала, што некаторыя людзі развілі крайнюю форму ўміласціўлення, гатоўнасць аддаць сябе ў ахвяру за іншых, якая заключалася ў тым, каб ахвяраваць сябе ў якасці своеасаблівага «громаадводу», каб здзейснілася Божая справядлівасць: «Я думала пра душы, якія прапануюць сябе ў якасці ахвяраў Божай справядлівасці, каб адхіліць пакаранне ад іншых, усклаўшы яго на сябе» [209]. Але, якой бы велікадушнай ні здавалася гэтая ахвяра, Тэрэза не была асабліва перакананая: «Я не мела ніякага жадання скласці яе» [210]. Падобны акцэнт на Божую справядлівасць у канчатковым выніку вёў да меркавання, што ахвяра Хрыста была няпоўнай або толькі часткова эфектыўнай, або што Яго міласэрнасць не была дастаткова моцнай.

196. Сваёй духоўнай інтуіцыяй св. Тэрэза ад Дзіцятка Езус адкрыла, што ёсць іншы спосаб ахвяравання сябе, дзе не трэба задавальняць Божую справядлівасць, а толькі дазволіць, каб бясконцая любоў Пана распаўсюджвалася без перашкодаў: «О, Божа мой! Няўжо любоў Твая, пагарджаная, застанецца замкнёнай у Сэрцы? Я думаю, што калі б Ты знайшоў душы, якія аддадуцца Тваёй любові ў якасці ахвяр усеспалення, [Твой агонь] паглынуў бы іх

імгненна. Мне здаецца, Ты быў бы шчаслівы не стрымліваць у Сабе хвалі бясконцай пяшчоты» [211].

197. Не трэба нічога дадаваць да адзінай адкупленчай ахвяры Хрыста, але праўда ў тым, што нашая свабодная адмова не дазваляе Сэрцу Хрыста распасціраць на ўвесь свет свае «хвалі бясконцай пяшчоты». І так адбываецца таму, што Пан сам хоча паважаць гэтую магчымасць адмаўлення. Больш, чым Божая справядлівасць, менавіта гэта хвалюе сэрца св. Тэрэзы ад Дзіцятка Езус, бо справядлівасць яна разумее толькі ў святле любові. Мы ўбачылі, што яна праз міласэрнасць ушаноўвала ўсе боскія дасканаласці, і такім чынам бачыла іх перамененымі, ззяючымі любоўю. Па яе словах, «нават Справядлівасць (магчыма, нават больш, чым усе іншыя) падаецца мне апранутай у любоў» [212].

198. Так нараджаецца яе Акт ахвяравання сябе – не Божай справядлівасці, а міласэрнай Любові: «Ахвярую сябе як ахвяру ўсеспалення Тваёй міласэрнай Любові і малю, каб Ты паглынаў мяне няспынна, уліваючы ў маю душу патокі бясконцай пяшчоты, схаваныя ў Табе, каб такім чынам, мой Божа, я магла стаць мучаніцай Тваёй любові!» [213]. Варта адзначыць, што маецца на ўвазе не толькі даверлівы дазвол Сэрцу Хрыста пашыраць прыгажосць сваёй любові ў нашым сэрцы, але і пра тое, каб праз нашае жыццё любоў дасягала іншых людзей і перамяняла свет: «У Сэрцы Касцёла, маёй Маці, я буду Любоўю!.. (…) Так мая мара здзейсніцца!!!» [214]. Гэтыя два аспекты непарыўна звязаны.

199. Пан прыняў яе ахвяру. Мы бачым, што праз некаторы час св. Тэрэза сама выказала моцную любоў да іншых і пацвердзіла, што яна паходзіць з Сэрца Хрыста, якое працягваецца праз яе. Яна сказала сваёй сястры Леані: «Я люблю цябе ў тысячу разоў пяшчотней, чым любяць адна адну звычайныя сёстры, бо магу любіць цябе Сэрцам нашага нябеснага Абранніка» [215]. Крыху пазней яна пісала Морысу Бельеру: «Як бы я хацела даць табе зразумець пяшчоту Сэрца Езуса і тое, чаго Ён чакае ад цябе!» [216].

*Цэласнасць і гармонія*

200. Сёстры і браты, я прапаную развіваць такую форму ўміласціўлення, якое, у рэшце рэшт, ахвяруе Сэрцу Хрыста новую магчымасць распаўсюджвання полымя Ягонай пяшчоты ў свеце. Сапраўды, калі ўміласціўленне прадугледжвае жаданне кампенсаваць знявагі, усяляк нанесеныя спрадвечнай Любові: праз нядбайнасць або праз цяжкую крыўду [217], – найбольш прыдатны спосаб заключаецца ў тым, каб нашая любоў ахвяравала Пану любую магчымасць для пашырэння ў нас і ў свеце ўзамен за тыя выпадкі, калі Ягоную любоў адкінулі або адмовіліся ад яе. Гэта адбываецца, калі мы выходзім за рамкі простага «суцяшэння» Хрыста, пра якое ішла гаворка ў папярэднім раздзеле, і чынім акты братэрскай любові, якімі лечым раны Касцёла і свету. Так мы даём гаючай моцы Сэрца Хрыста новыя шляхі выявіць сябе.

201. Адрачэнні і пакуты, якія спадарожнічаюць актам любові да бліжняга, яднаюць нас з Мукай Хрыста, а мы, церпячы з Хрыстом, калі «крыжуем сваё цела гэтай таямніцай крыжа, пра якую кажа Апостал, атрымаем яшчэ багацейшыя плёны паяднання і ўміласціўлення для нас і для іншых» [218]. Толькі Хрыстус збаўляе нас сваёй ахвярай на крыжы, толькі Ён адкупляе нас, бо ёсць «адзін Бог і адзін пасрэднік паміж Богам і людзьмі – Чалавек Езус Хрыстус, які аддаў сябе самога на водкуп за ўсіх» (1 Цім 2, 5-6). Уміласціўленне, якое мы ахвяруем, – гэта наш добраахвотны ўдзел у Яго збаўчай любові і адзінай ахвяры. Такім чынам, мы дапаўняем у сваім целе «недахоп пакутаў Хрыста за Ягонае цела, якім ёсць Касцёл» (Клс 1, 24), і сам Хрыстус праз нас працягвае наступствы свайго поўнага аддання з любові.

202. Часта мы церпім з-за свайго параненага «эга», але менавіта пакора Сэрца Хрыста паказвае нам шлях да ўпакорвання сябе. Бог хацеў прыйсці да нас, прынізіўшы сябе, зрабіўшы сябе малым. Ужо Стары Запавет праз розныя метафары паказвае Бога, які ўваходзіць у гісторыю і дапускае, што народ адкідае Яго. Хрыстовая любоў уплецена ў штодзённае жыццё ўмілаванага Ім народу. Ён чакае ўзаемнасці, як жабрак, быццам просіць дазволу паказаць сваю хвалу. З іншага боку, «хіба толькі аднойчы Пан Езус сам выказаўся пра сваё сэрца. І падкрэсліў тую адзіную рысу: “ціхі і пакорны”. Нібы хацеў сказаць, што толькі гэтым шляхам хоча здабыць чалавека» [219]. Праз словы: «Навучыцеся ад Мяне, бо Я ціхі і пакорны сэрцам» (Мц 11, 29) Хрыстус паказаў, што «Яму патрэбна нашая малазначнасць, нашае прыніжэнне, каб абвясціць Сябе» [220].

203. У тым, што было сказана, важна падкрэсліць некалькі неад’емных аспектаў, паколькі гэтыя акты любові да бліжніх, уключна з усімі адрачэннямі, вырачэннем сябе, пакутамі і намаганнямі, выконваюць сваю функцыю, калі сілкуюцца любоўю Хрыста. Ён дазваляе нам любіць так, як Ён палюбіў, і тады сам любіць і служыць праз нас. Ён прыніжае сябе, каб паказаць сваю любоў праз нашыя ўчынкі, але нават у самых нязначных актах міласэрнасці Ягонае Сэрца ўслаўляецца і паказвае ўсю сваю веліч. Калі чалавечае сэрца з поўным даверам прымае любоў Хрыста і дазваляе яе агню ахапіць жыццё, можа тады любіць іншых, як Хрыстус, у пакоры і блізкасці да ўсіх. Так Хрыстус спаталяе сваю смагу і хвалебна распаўсюджвае ў нас і праз нас полымя сваёй гарачай пяшчоты. Заўважым жа цудоўную гармонію, якая існуе ва ўсім гэтым.

204. Нарэшце, каб зразумець гэтае набажэнства ва ўсім яго багацці, трэба дадаць, вяртаючыся да таго, што мы сказалі пра яго трынітарнае вымярэнне, што ўміласціўленне Хрыста ў Яго чалавечнасці прыносіцца Айцу праз дзейнасць Дух Святога ў нас. Таму нашае ўміласціўленне Сэрцу Хрыста, у канчатковым выніку, скіравана да Айца, якому прыемна бачыць нас з’яднанымі з Хрыстом, калі мы ахвяруем сябе праз Яго, з Ім і ў Ім.

*Зрабіць так, каб свет закахаўся*

205. Хрысціянскае пасланне прывабнае, калі яго перажываюць і выказваюць ва ўсёй паўнаце, калі яно не з'яўляецца звычайнымі ўцёкамі ў рэлігійныя пачуцці або нагодай для раскошных цырымоній. Хіба сапраўдным быў бы культ Хрыста, калі б мы задавальняліся індывідуальнымі адносінамі з Ім без зацікаўленасці ў дапамозе бліжнім, каб яны менш пакутвалі і жылі лепш? Ці магло б спадабацца Сэрцу, якое так палюбіла, каб мы абмежаваліся асабістым рэлігійным перажываннем без ніякіх наступстваў у братэрскіх і сацыяльных адносінах? Будзем шчырымі і прымем Божае Слова ва ўсёй яго паўнаце. Але па той жа прычыне мы сцвярджаем, што гаворка не ідзе пра паляпшэнне жыцця грамадства, пазбаўленага рэлігійнага сэнсу, бо гэта ў канчатковым выніку азначала б жадаць і шукаць для чалавека меншага, чым Бог хоча яму даць. Таму мы павінны завяршыць гэты раздзел напамінам пра місійнае вымярэнне нашай любові да Сэрца Хрыста.

206. Святы Ян Павел II казаў не толькі пра сацыяльнае вымярэнне набажэнства да Сэрца Хрыста, але і пра «ўміласціўленне, якое з'яўляецца апостальскім супрацоўніцтвам дзеля збаўлення свету» [221]. Такім жа чынам прысвячэнне Сэрцу Хрыста «трэба суаднесці з місійнай дзейнасцю самога Касцёла, таму што яно адказвае на прагненне Сэрца Езуса пашырыць ва ўсім свеце поўную адданнасць справе Валадарства праз членаў Свайго Цела, каб усё больш яднаць Касцёл у акце прынясення ахвяры Айцу і ў свядомасці таго, што ён існуе для іншых» [222]. У выніку, праз хрысціянаў «любоў будзе ўлівацца ў сэрцы людзей, каб расло цела Хрыста, якім ёсць Касцёл, і будавалася грамадства справядлівасці, супакою і братэрства» [223].

207. Полымя любові Сэрца Хрыста пашыраецца таксама праз місійную справу Касцёла, які абвяшчае любоў Бога, аб'яўленую ў Хрысце. Святы Вінцэнт дэ Поль вельмі добра акрэсліў гэта, запрашаючы сваіх вучняў прасіць у Пана «аб сэрцы, якое прымушае нас ісці куды заўгодна, аб сэрцы Сына Божага, сэрцы нашага Пана, якое дае нам ісці так, як Ён пайшоў бы [...], Ён пасылае нас, як іх [апосталаў], несці Ягоны агонь паўсюль» [224].

208. Святы Павел VI, звяртаючыся да кангрэгацый, якія распаўсюджваюць набажэнства да Найсвяцейшага Сэрца, нагадаў, што «пастырская руплівасць і місійны запал разгарацца тады, калі і святары, і вернікі ў сваім імкненні павялічваць хвалу Божую, кантэмплюючы прыклад вечнай любові Хрыста, скіруюць свае намаганні на тое, каб падзяліцца з іншымі невычэрпнымі скарбамі Хрыста» [225]. У святле Найсвяцейшага Сэрца місія становіцца справай любові, а найбольшая рызыка місіі ў тым, што ў ёй шмат гаворыцца і шмат робіцца, але не ўдаецца прывесці да радаснай сустрэчы з любоўю Хрыста, якая абдымае і збаўляе.

209. Місія як выпраменьванне любові Сэрца Хрыста патрабуе місіянераў, якія самі закаханыя ў Хрыста і захопленыя Ім і якія не могуць не дзяліцца гэтай любоўю, якая змяніла іх жыццё. Такім місіянерам крыўдна марнаваць час на абмеркаванне другасных пытанняў або навязванне праўдаў і нормаў, бо яны найбольш турбуюцца аб тым, як падзяліцца сваім досведам. Перш за ўсё ім хочацца, каб іншыя маглі ўспрыняць дабрыню і прыгажосць

Умілаванага праз іх недасканалыя высілкі. Хіба не так бывае з кожным закаханым? Варта ўзяць за прыклад тыя словы, якімі спрабаваў выказаць гэтую логіку закаханы Дантэ Аліг’еры:

*«Io dico che, pensando al suo valore*

*amor si dolce si mi si fa sentire,*

*che s’io allora non perdessi ardire*

*farei parlando innamorar la gente»*[226].

210. Гаварыць пра Хрыста сведчаннем ці словам так, каб іншыя не мусілі прыкладаць вялікіх намаганняў, каб палюбіць Яго, – вось самае вялікае жаданне місіянера душ. У гэтай дынаміцы любові няма празелітызму: словы закаханай асобы не трывожаць, не змушаюць, не абавязваюць, а толькі схіляюць слухачоў задумацца, як такая любоў магчымая. З найвялікшай павагай да свабоды і годнасці іншага, закаханы проста спадзяецца, што яму дазволяць распавесці пра сяброўства, якім напоўнена ягонае жыццё.

211. Хрыстус просіць цябе не саромецца сяброўства з Ім, памятаючы пра разважлівасць і павагу. Просіць адважыцца сказаць іншым, якім дабром для цябе сталася сустрэча з Ім: «Так кожнага, хто вызнае Мяне перад людзьмі, і Я прызнаю перад Айцом Маім, які ў нябёсах» (Мц 10, 32). Але для сэрца, якое любіць, гэта не абавязак, а нястрымная патрэба: «Гора мне, калі я не абвяшчаю Евангелля!» (1 Кар 9, 16); «У сэрцы маім быў, як палаючы агонь, у касцях маіх: я стараўся яго ўтрымаць, але не мог» (Ер 20, 9).

*У камуніі служэння*

212. Гэтую місію абвяшчэння Хрыста нельга разглядаць як нешта паміж Ім і мною. Чалавек жыве ў еднасці са сваёй супольнасцю і з Касцёлам. Калі мы аддаляемся ад супольнасці, аддаляемся і ад Езуса. Калі не будзем памятаць і клапаціцца пра гэта, нашае сяброўства з Езусам астыне. Нельга пра гэта забываць. Любоў да братоў і сясцёр са сваёй супольнасці – законнай, парафіяльнай, дыяцэзіяльнай і г. д. – своеасабліае паліва, якое сілкуе нашае сяброўства з Езусам. Акты любові да братоў у супольнасці могуць быць найлепшым, а часам і адзіным спосабам паказаць іншым нашую любоў да Езуса Хрыста. Сам Пан сказаў: «Па гэтым усе пазнаюць, што вы Мае вучні, калі будзеце мець любоў адзін да аднаго» (Ян 13, 35).

213. Гэтая любоў становіцца служэннем у супольнасці. Я не стамляюся паўтараць, што Езус выказаўся вельмі ясна: «Тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі» (Мц 25, 40). Ён прапануе, каб і ты знаходзіў Яго там, у кожным браце і кожнай сястры, асабліва ў самых бедных, пагарджаных і пакінутых у грамадстве. Якая прыгожая

сустрэча!

214. Такім чынам, калі мы прысвячаем сябе дапамозе людзям, то ніякім чынам не забываемся пра Езуса. Наадварот, мы знаходзім Яго па-іншаму. І калі мы стараемся падняць і аздаравіць кагосьці, Езус побач з намі. Насамрэч, варта памятаць, што, пасылаючы вучняў на місію, «Пан дапамагаў ім» (Мк 16, 20). Ён ёсць, працуе, змагаецца і разам з намі робіць дабро. Таямнічым чынам Ягоная любоў выяўляецца праз нашае служэнне, Ён сам гаворыць са светам той мовай, якая часам не мае словаў.

215. Ён пасылае цябе пашыраць дабро і заклікае ў душы. Ён дае пакліканне да служэння, пакліканне чыніць дабро, магчыма, як лекар, маці, настаўнік, святар. Дзе б ты не апынуўся, можаш пачуць, што Ён кліча цябе і пасылае спаўняць гэтую місію на зямлі. Ён сам кажа: «Я пасылаю вас» (Лк 10, 3). У гэтым таксама праяўляецца сяброўства з Ім. Таму, каб гэтае сяброўства пасталела, дазволь Яму паслаць цябе на місію ў свет і выканай яе з даверам, шчодрасцю, свабодай і без страху. Калі ты замкнешся ў сваіх выгодах, яны не дадуць табе бяспекі: заўсёды будуць з'яўляцца трывогі, смутак і туга. Той, хто не выконвае сваю місію на зямлі, не знаходзіць шчасця і расчароўваецца. Дык лепш дазволь сябе паслаць, дазволь весці туды, куды Ён хоча. Не забывай, што Ён ідзе поруч з табою. Ён не дасць табе сарвацца ў бездань і не пакіне ў самоце спадзявацца на ўласныя сілы. Будзе цябе падбадзёрваць і суправаджаць. Ён даў абяцанне і выканае яго: «Я з вамі ва ўсе дні, аж да сканчэння веку» (Мц 28, 20).

216. У пэным сэнсе, трэба быць місіянерам, як Апосталы Езуса і першыя вучні, якія выйшлі абвяшчаць любоў Бога, выйшлі, каб сказаць, што Хрыстус жывы і што Яго варта ведаць. Святая Тэрэза ад Дзіцятка Езус успрымала місію неад'емнай часткай свайго ахвяравання міласэрнай Любові: «Я хацела напаіць майго Умілаванага і ў той жа час адчувала, што і мяне спальвае прага душ» [227]. Гэта і твая місія. Кожны выконвае яе па-свойму; ты ўбачыш, якім чынам можаш быць місіянерам. Езус заслугоўвае на гэта. Калі ты адважышся, Ён дасць святло, будзе суправаджаць і ўмацоўваць, і ты атрымаеш каштоўны вопыт, які прынясе шмат карысці. Няважна, ці ўбачыш ты калі-небудзь вынікі, пакінь гэта Пану, які працуе ў таямніцы сэрцаў, але працягвай жыць радасцю, якая нараджаецца з нашых намаганняў перадаваць любоў Хрыста іншым.

## ЗАКАНЧЭННЕ

217. Змест гэтага дакумента дапамагае зразумець, што навучанне сацыяльных энцыклік *Laudato si'* і *Fratelli tutti* не адарванае ад нашага спаткання з любоўю Езуса Хрыста, бо, чэрпаючы з гэтай любові, мы становімся здольнымі ствараць братэрскія сувязі, прызнаваць годнасць кожнага чалавека і разам клапаціцца пра наш агульны дом.

218. Сёння ўсё купляецца, за ўсё трэба плаціць, і нават здаецца, што само пачуццё годнасці залежыць ад рэчаў, якія можна набыць сілай грошай. Нас увесь час прымушаюць толькі назапашваць, спажываць і адцягваць увагу, мы знаходзімся ў палоне зневажальнай сістэмы, якая не дазваляе зазірнуць далей за нашыя надзённыя і дробныя патрэбы. Любоў Хрыста знаходзіцца па-за межамі гэтага ганебнага механізма, і толькі Ён можа вызваліць нас ад гэтай ліхаманкі, дзе ўжо няма месца бескарыслівай любові. Ён здольны даць гэтай зямлі сэрца і нанава адкрыць любоў там, дзе, як нам здаецца, здольнасць любіць канчаткова памерла.

219. Касцёл таксама мае патрэбу ў тым, каб не замяняць любоў Хрыста састарэлымі структурамі, дакучлівымі ідэямі з іншых часоў, пакланеннем уласнаму менталітэту, рознага роду фанатызмам, бо ў выніку гэта ўсё зойме месца той бескарыслівай Божай любові, якая вызваляе, ажыўляе, весяліць сэрца і жывіць супольнасці. З раны ў боку Хрыста цячэ тая рака, якая ніколі не вычэрпваецца, не праміnae, няспынна дае сябе тым, хто хоча любіць. Толькі Ягоная любоў можа зрабіць магчымым новае чалавецтва.

220. Прашу Пана Езуса Хрыста, каб з Яго Найсвяцейшага Сэрца цяклі рэкі жывой вады для ўсіх нас, каб гаіць раны, якія мы сабе наносім, умацоўваць нашую здольнасць любіць і служыць, натхняць нас вучыцца ісці разам у кірунку справядлівага, салідарнага і братэрскага свету. І ўсё гэта аж да часу, калі мы разам будзем радасна святкаваць на гасціне Нябеснага Валадарства. Там будзе ўваскрослы Хрыстус, які гарманізуе ўсе нашыя адрозненні святлом, якое няспынна ззяе з Яго адкрытага Сэрца. Няхай Ён будзе благаслаўлёны навекі.

Дадзена ў Рыме, у св. Пятра, 24 кастрычніка 2024 г., у дванаццаты год майго Пантыфікату.

ФРАНЦІШАК

---

[1] Большая частка разважанняў у гэтым першым раздзеле была натхнёна неапублікаванымі творамі а. Дыега Фарэса SJ. Няхай Пан дасць яму ўдзел у сваёй святой хвале.

[2] Пар. Гамер, *Iliada*, 21, 441.

[3] Пар. *тамсама*, 10, 244.

[4] Пар. Платон, *Timeo* 65 c-d; 70.

[5] *Гамілія на ранішняй св. Імшы ў Доме св. Марты*, 14 кастрычніка 2016: *L'Osservatore*

*Romano*, 15 кастрычніка 2016, 8.

[6] Св. Ян Павел ІІ, *Анёл Панскі*, 2 ліпеня 2000: *L'Osservatore Romano*, 3-4 ліпеня 2000, 4.

[7] Той жа, *Катэхеза*, 8 чэрвеня 1994: *L'Osservatore Romano*, 9 чэрвеня 1994, 5.

[8] Ф. Дастаеўскі, *Бесы*.

[9] Рамана Гуардзіні, *Il mondo religioso di Dostojevskij*, Brescia 1980, 236.

[10] Карл Ранер, *Alcune tesi per una teologia della devozione al cuore di Gesù, in Teologia del Cuore di Cristo*, Roma 1995, 60.

[11] *Тамсама*, 61.

[12] Byung-Chul Han, *Heideggers Herz. Zum Begriff der Stimmung bei Martin Heidegger*, München 1996, 39.

[13] *Тамсама*, 60; пар. 176.

[14] Пар. той жа, *Eros in agonia*, Milano 2019.

[15] Пар. Марцін Хайдэгер, *La poesia di Hölderlin*, Milano 1988, 144.

[16] Пар. Мішэль дэ Сэрто, *Lo spazio del desiderio. Gli «Esercizi spirituali» di Loyola, in Il parlare angelico: figure per una poetica della lingua. Secoli XVI e XVII*, Firenze 1989, 95-110.

[17] *Itinerarium mentis in Deum*, VII, 6: Святы Банавентура*, Itinerario della mente in Dio. Riconduzione delle Arti alla Teologia*, Roma 1995, 93.

[18] Той жа, *Proemium in I Sent*., q. 3: *Opera Omnia, Quaracchi* 1882, vol. 1, 13.

[19] Св. Джон Генры Ньюман, *Meditazioni e Preghiere*, Milano 2002, 106.

[20] Паст. канст. *Gaudium et spes*, 82.

[21] *Тамсама*, 10.

[22] *Тамсама*, 14.

[23] Пар. Дыкастэрыя Веравучэння, Дэкларацыя *Dignitas infinita* (2 красавіка 2024), 8.

[24] Паст. канст. *Gaudium et spes*, 26.

[25] Св. Ян Павел II, *Анёл Панскі*, 28 чэрвеня 1998*: L'Osservatore Romano*, 30 чэрвеня-1 ліпеня 1998, 7.

[26] Энц. *Laudato si'* (24 мая 2015), 83.

[27] *Гамілія на ранішняй св. Імшы ў Доме св. Марты*, 7 чэрвеня 2013: *L'Osservatore Romano*, 8 чэрвеня 2013, 8.

[28] Пій XII, Энц. *Haurietis Aquas* (15 мая 1956), I: AAS 48 (1956), 316.

[29] Пій VI, Канст. *Auctorem fidei* (28 жніўня 1794), 63: DH, 2663.

[30] Леон XIII, Энц. *Annum Sacrum* (25 мая 1899): ASS 31 (1898-99), 649.

[31] *Тамсама*: «Inest in Sacro Corde symbolum atque expressa imago infinitae Iesu Christi caritatis».

[32] *Анёл Панскі*, 9 чэрвеня 2013: *L'Osservatore Romano*, 10-11 чэрвеня 2013, 8.

[33] Такім чынам, мы можам зразумець, чаму Касцёл забараняў змяшчаць на алтары выявы Найсвяцейшага Сэрца Езуса ці Марыі (пар. *Risposta della Congregazione dei Riti al Rev. Charles Lecoq, P.S.S.*, 5 красавіка 1879: *Decreta authentica Congregationis Sacrorum Rituum ex actis ejusdem collecta*, vol. III, 107-108, n. 3492). Па-за літургіяй, у прыватнай пабожнасці, можна выкарыстоўваць сімвалізм сэрца як дыдактычны сродак, эстэтычную фігуру або эмблему, якая заахвочвае да разважанняў аб любові Хрыста, але ёсць рызыка прыняць сэрца як прадмет пакланення, або духоўны дыялог, адарваны ад асобы Хрыста. 31 сакавіка 1887 г. Кангрэгацыя дала яшчэ адзін падобны адказ (*тамсама*, 187, n. 3673).

[34] Трыдэнцкі сабор, Sess. XXV, Decr. *Mandat Sancta Synodus* (3 снежня 1563): DH, 1823.

[35] V Генеральная канферэнцыя епіскапату Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна, *Documento di Aparecida* (29 чэрвеня 2007), n. 259.

[36] Энц. *Haurietis Aquas* (15 мая 1956), I: AAS 48 (1956), 323-324.

[37] *Ліст* 261, 3: PG 32, 972.

[38] *In Io. homil.* 63, 2: PG 59, 350.

[39] *De fide ad Gratianum*, II, 7, 56: PL 16, 594 (ed. 1880).

[40] *Enarr. in Ps*. 87, 3: PL 37, 1111.

[41] Пар. *De fide orth*. 3, 6.20: PG 94, 1006.1081.

[42] Olegario González de Cardedal, *La entraña del cristianismo*, Salamanca 2010, 70-71.

[43] *Анёл Панскі*, 1 чэрвеня 2008: *L'Osservatore Romano*, 2-3 чэрвеня 2008, 1.

[44] Пій XII, Энц. *Haurietis Aquas* (15 мая 1956), II: AAS 48 (1956), 327-328.

[45] *Тамсама*, 28: AAS 48 (1956), 343-344.

[46] Бэнэдыкт XVI, *Анёл Панскі*, 1 чэрвеня 2008: *L'Osservatore Romano*, 2-3 чэрвеня 2008, p. 1.

[47] Vigilio, Канст. *Inter innumeras sollicitudines* (14 мая 553): DH, 420.

[48] Эфескі сабор, *Anatemi di Cirillo di Alessandria*, 8: DH, 259.

[49] Другі Канстанцінопальскі сабор, Sess. VIII (2 чэрвеня 553), Can. 9: DH, 431.

[50] Св. Ян ад Крыжа, *Cantico spirituale* A, Strofa 22, 4: Opere, Roma 1979, 919.

[51] *Тамсама*, Strofa 12, 8: *Opere*, cit., 881.

[52] Тамсама, Strofa 12,1: 878.

[53] «У нас адзін Бог Айцец, ад якога паходзіць усё і мы існуём для Яго» (1 Кар 8, 6). «Богу ж і Айцу нашаму хвала на векі вечныя. Амэн» (Флп 4, 20). «Благаслаўлёны Бог і Айцец Пана нашага Езуса Хрыста, Айцец міласэрнасці і Бог усякага суцяшэння» (2 Кар 1, 3).

[54] Ап. ліст *Tertio millennio adveniente* (10 лістапада 1994), 49: AAS 87 (1995), 35.

[55] *Ad Rom.*, 7: PG 5, 694.

[56] «Але каб свет ведаў, што Я люблю Айца» (Ян 14, 31). « Я і Айцец – адно» (Ян 10, 30). «Я ў Айцу і Айцец ува Мне» (Ян 14, 10).

[57] «Іду на Айца» (*pros ton Patéra*: Ян 16, 28). «Я ж іду да Цябе» (*pros se*: Ян 17,11).

[58] *«Eis ton kolpon tou Patrós».*

[59] *Adv. Haer.*, III, 18, 1: PG 7, 932.

[60] *In Joh.*, II, 2: PG 14, 110.

[61] *Анёл Панскі*, 23 чэрвеня 2002: *L'Osservatore Romano*, 24-25 чэрвеня 2002, 1.

[62] Св. Ян Павел II, *Messaggio nel centenario della consacrazione del genere umano al Cuore dТамсамano di Gesù*, Varsavia, 11 чэрвеня 1999, Solennità del Sacro Cuore di Gesù: *L'Osservatore Romano*, 12 чэрвеня 1999, 5.

[63] Той жа, *Анёл Панскі*, 8 чэрвеня 1986, 4: *L'Osservatore Romano,* 9-10 чэрвеня 1986, 5.

[64] *Гамілія*, Visita al Policlinico Gemelli e alla Facoltà di Medicina dell'Università Cattolica del Sacro Cuore, 27 чэрвеня 2014: *L'Osservatore Romano*, 29 чэрвеня 2014, 7.

[65] *Эф* 1, 5.7; 2, 18; 3, 12.

[66] *Эф* 2, 5.6; 4, 15.

[67] *Эф* 1, 3.4.6.7.11.13.15; 2, 10.13.21.22; 3 ,6.11.21.

[68] *Messaggio nel centenario della consacrazione del genere umano al Cuore dТамсамano di Gesù*, Varsavia, 11 чэрвеня 1999, Solennità del Sacro Cuore di Gesù: *L'Osservatore Romano*, 12 чэрвеня 1999, 5.

[69] «Паколькі ў Найсвяцейшым Сэрцы ёсць сімвал і выразны вобраз бясконцай любові Езуса Хрыста, якая заахвочвае нас любіць адзін аднаго, належным і правільным з'яўляецца прысвячэнне сябе Яго Найсвяцейшаму Сэрцу – гэта акт, які з'яўляецца нічым іншым, як ахвяраваннем і звязваннем сябе з Езусам Хрыстом, бо якая б пашана, пашана і любоў не аддавалася гэтаму Божаму Сэрцу, рэальна і праўдзіва яна аддаецца самому Хрысту (…) І цяпер, сёння, вось яшчэ адзін благаслаўлёны і нябесны знак прапануецца нам – Найсвяцейшае Сэрца Езуса, з крыжом, які ўзвышаецца над ім і зззяе асляпляльным бляскам сярод полымя любові. У гэтым Найсвяцейшым Сэрцы мы павінны скласці ўсе нашы надзеі, і прасіць Яго з даверам аб збаўленні людзей» (Энц. *Annum Sacrum* [25 мая 1899]: ASS 31 [1898-99], 649; 651).

[70] «Хіба сума ўсёй рэлігіі і, адсюль, узор больш дасканалага жыцця, змешчаны ў гэтым найбольш спрыяльным знаку і ў форме пабожнасці, якая з яго вынікае, паколькі ён вядзе розумы людзей да глыбокага пазнання Хрыста нашага Пана, і больш эфектыўна заахвочвае іх сэрцы да большай любові да Яго і да большага наследавання?» (Энц. *Miserentissimus Redemptor* [8 мая1928]: AAS 20 (1928), 167.

[71] «Бо абсалютна ясна, што гэтае набажэнства, калі разглядаць яго сапраўдную прыроду, з'яўляецца найвыдатнейшым актам рэлігіі, паколькі патрабуе поўнай і абсалютнай рашучасці аддацца і прысвяціць сябе любові Боскага Адкупіцеля, чыё параненае сэрца – жывы знак і сімвал той любові (…) У ёй мы можам сузіраць не толькі сімвал, але і нібы сінтэз усёй таямніцы нашага адкуплення (…) Хрыстус выразна і неаднаразова ўказваў на сваё сэрца як на сімвал, праз які людзі распазнаюць і прымаюць Яго любоў, і ў той жа час стварыў яго як знак і задатак міласэрнасці і ласкі для патрэбаў Касцёла ў наш час» (Энц. *Haurietis Aquas* [15 мая 1956], Proemio; III; IV: AAS 48 (1956), 311; 336; 340).

[72] *Катэхеза*, 8 чэрвеня 1994, 2: *L'Osservatore Romano*, 9 чэрвеня 1994, 5.

[73] *Анёл Панскі*, 1 чэрвеня 2008: *L'Osservatore Romano*, 2-3 чэрвеня 2008, 1.

[74] Энц. *Haurietis Aquas* (15 мая 1956), IV: AAS 48 (1956), 344.

[75] Пар. *тамсама*: AAS 48 (1956), 336.

[76] «Значэнне прыватных аб'яўленняў прынцыпова адрозніваецца ад адзінага публічнага Аб'яўлення: гэтае апошняе патрабуе нашай веры; […]. Прыватнае аб'яўленне […] гэта дапамога, якую мы атрымліваем, але не маем абавязку карыстацца ім» (Бэнэдыкт XVI, Ап. адг. *Verbum Domini* [30 верасня 2010], 14: AAS 102 [2010], 696).

[77] Энц. *Haurietis Aquas* (15 мая 1956), IV: AAS 48 (1956), 340.

[78] *Тамсама*: AAS 48 (1956), 344.

[79] *Тамсама*.

[80] Ап. адг. *C'est la confiance* (15 кастрычніка 2023), 20.

[81] Св. Тэрэза ад Дзіцятка Езус, Ms A, 83vº: *Opere complete*, Roma 1997, 209.

[82] Св. Марыя Фаўстына Кавальская, *Дзённік,* Мінск 2014, 47.

[83] Пар. *Mišna Sukkâ* IV, 5. 9.

[84] *Lettera al Reverendo Padre Peter-Hans Kolvenbach, Preposito generale della Compagnia di Gesù*, Paray-le-Monial (Francia), 5 кастрычніка 1986: *L'Osservatore Romano,* 7 кастрычніка 1986, IX.

[85] *Atti dei Martiri di Lione*, in Eusebio di Cesarea, Hist. Eccles., V, 1, 22: PG 20, 418.

[86] Rufinus, V, 1, 22: *GCS, Eusebius* II, 1, p. 411, 13s.

[87] S. Giustino, Dial. 135: PG 6,787.

[88] Novaziano, *De Trinitate,* 29: PL 3, 944. Пар. S. Gregorio di Elvira, *Tractatus Origenis de libris Ss. Scripturarum*, 20, Paris 1900, 210.

[89] Св. Амброзій, *Expl. Ps.* I, 33: PL 14, 983-984.

[90] Пар. *Tract. in Joann*. 61, 6: PL 35,1801.

[91] *Epist. ad Rufinum* 3, 4.3: PL 22, 334.

[92] *Sermones in Cant.*61, 4: PL183, 1072.

[93] Пар. *Expositio altera super Cantica Canticorum*, c. 1: PL 180, 487.

[94] Вільгельм з Сан-Цьеры, *De natura et dignitate amoris*, 1: PL 184, 379.

[95] Той жа, *Meditativae Orationes* 8, 6: PL 180, 230.

[96] Св. Бонавэнтура, *Lignum vitae. De mysterio passionis, 30: Opuscoli Spirituali*, 3, Roma 1992 (*Sancti Bonaventurae Opera*, XIII), 245.

[97] *Тамсама*, 47.

[98] Св. Гертруда з Хельфты, *Legatus divinae pietatis*, IV, 4, 4: SCh, 255, 66.

[99] Leone Dehon, *Directoire spirituel des prêtres du Sacré Cœur de Jésus*, Turnhout 1936, II, cap. VII, n. 141.

[100] Св. Кацярына Сіенская, *Dialogo della divina provvidenza*, LXXV: Fiorilli M. – Caramella S. (ed.), Bari 1928, 144.

[101] Пар., напр., *Анёл Панскі* Walz, *De veneratione divini cordis Iesu in Ordine Praedicatorum*, Roma 1937.

[102] Rafael García Herreros, *Vida de San Juan Eudes*, Bogotá 1943, 42.

[103] *Lettera a S. Giovanna Francesca di Chantal*, 24 красавіка 1610: *Opere complete di Francesco di Sales*, vol. 8/2: Lettere 1605-1610, Roma 2021, 686.

[104] *Sermone per la II Dom. di Quaresima*, 20 лютага 1622.

[105] *Lettera a S. Giovanna Francesca di Chantal nella Solennità dell'Ascensione del 1612*: San Francesco di Sales, *Tutte le lettere,* vol. II (1611-1618). Roma 1967, 183, lett. n. 781.

[106] *Lettera a Maria Amata di Blonay*, 18 лютага 1618: тамсама, 1056, lett. n. 140.

[107] *Lettera a S. Giovanna Francesca di Chantal*: тамсама, 610, lett. n. 552.

[108] *Lettera a S. Giovanna Francesca di Chantal, verso il 25 febbraio 1610*: тамсама, 654, lett. n. 573.

[109] *Entretien* XIV, *De la simplicité et prudence religieuse.*

[110] *Lettera a S. Giovanna Francesca di Chantal, 10 чэрвеня 1611*: San Francesco di Sales, *Tutte le lettere*, vol. II (1611-1618), Roma 1967, 56, lett. n. 69.

[111] Св. Маргарыта Марыя Алякок, *Autobiografia*, n. 53, Roma 1983, 131.

[112] *Тамсама*.

[113] *Тамсама*, 134.

[114] Пар. Дыкастэрыя Веравучэння, *Norme per procedere nel discernimento di presunti fenomeni soprannaturali*, 17 мая 2024, I, A, 12.

[115] Св. Маргарыта Марыя Алякок, *Autobiografia*, n. 92, Roma 1983, 180.

[116] *Lettera a Suor de la Barge,* 22 кастрычніка 1689: *Vita e opere di Santa Margherita Maria Alacoque*, vol. II, Roma 1985, 301.

[117] *Autobiografia*, n. 53, цыт. твор, 132.

[118] *Тамсама*, n. 55, цыт. твор, 134.

[119] Св. Клод дэ ля Каламб'ер, *Discorso sulla confidenza in Dio: Discorsi sacri su N.S. Gesù Cristo, su Maria Vergine Santissima, sui Santi, sui Novissimi*, ecc., vol. III, Torino 1913, 484-485.

[120] Той жа, *Ritiro a Londra*, 1-8 лютага 1677.

[121] Той жа, *Esercizi spirituali a Lione*, кастрычнік-лістапад 1674.

[122] Пар. Св. Шарль дэ Фуко, *Lettre à Madame de Bondy*, 27 красавіка 1897: in *Fonds Charles de Foucauld – Archives Diocésaines Viviers*.

[123] Той жа, *Lettera a Madame de Bondy*, 28 красавіка 1901: *C. de Foucalud, Lettere a M.me de Bondy*. Dalla Trappa a Tamanrasset, Roma 1968, 73. Пар. *Lettera a Madame de Bondy*, 5 красавіка 1909: «Дзякуючы табе я пазнаў адарацыю Найсвяцейшага Сакрамэнту, благаслаўленні і Найсвяцейшае Сэрца!»: тамсама, 154.

[124] *Lettera a Madame de Bondy*, 7 красавіка 1890: *C. de Foucauld,* цыт. твор, 29.

[125] *Lettera a Don Huvelin*, 27 чэрвеня 1892: *C. de Foucauld – Don Huvelin, Corrispondenza inedita*, Torino-Leumann 1965, 30.

[126] Св. Шарль дэ Фуко, *Meditazioni sull'Antico Testamento (1896-1897)*, XXX, 1-21: *C. de Foucalud, Chi può resistere a Dio? Meditazioni sulla Sacra Scrittura (1896-1898),* Roma 1983, 77-78.

[127] Той жа, *Lettera a Don Huvelin,* 16 мая 1900: *C. de Foucauld – Don Huvelin, Corrispondenza inedita*, Torino-Leumann 1965, 132-133.

[128] Той жа, *Diario,* 17 мая 1906: *Opere spirituali,* Roma 1983, 346.

[129] Св. Тэрэза ад Дзіцятка Езус, *Lettera 67 a sua zia Madame Guérin,* 18 лістапада 1888: *Opere complete,* Città del Vaticano 1997, 354.

[130] Той жа, *Lettera 122 a Celina*, 14 кастрычніка 1890: *Opere complete*, 421.

[131] Той жа, *Poesie 23, "Al Sacro Cuore di Gesù",* чэрвень-кастрычнік 1895: *Opere complete*, 667-668.

[132] Той жа, *Lettera 247, al Reverendo Maurice Bellière,* 21 чэрвеня 1897: *Opere complete*, 587.

[133] Той жа, *Ultimi colloqui. Quaderno giallo*, 11 ліпеня 1897: *Opere complete,* 1014-1015.

[134] Той жа, *Lettera 197, a Suor Maria del Sacro Cuore,* 17 верасня 1896: Opere complete, 537-538. *Гэта не азначае, што Тэрэза не прыносіла ў ахвяру цярпенняў і смуткаў, каб далучыцца да цярпенняў Хрыста, але, у рэшце рэшт, яна клапацілася аб тым, каб не надаць гэтым ахвярам значэння, якога яны не мелі.*

[135] Той жа, *Lettera 142, a Celina*, 6 ліпеня 1893: *Opere complete,* 451.

[136] Той жа, *Lettera 191, a Leonia,* 12 ліпеня 1896: *Opere complete*, 528.

[137] Той жа, *Lettera 226, al P. Roulland*, 9 мая 1897: *Opere complete*, 573.

[138] Той жа, *Lettera 258 al Reverendo Maurice Bellière*, 18 ліпеня 1897: *Opere complete*, 598.

[139] Пар. Св. Ігнацый Лаёла, *Esercizi Spirituali*, n. 104, Roma 1984, 110.

[140] *Тамсама*, n. 297, cit., 211.

[141] Пар. *Lettera a S. Ignazio*, 23 gennaio 1541.

[142] *De Vita P. Ignatii et Societatis Iesu initiis*, c. 8, 96, Bilbao-Santander 2021, 147.

[143] Пар. Св. Ігнацый Лаёла, *Esercizi Spirituali*, 54, Roma 1984, 80.

[144] Пар. *тамсама*, 230.

[145] XXIII Генеральная Кангрэгацыя Таварыства Езуса, Decreto 46, 1: *Institutum Societatis Iesu*, 2, Firenze 1893, 511.

[146] «*In Lui solo… la speranza*», Milano 1983, 180-181.

[147] *Lettera al Preposito Generale della Compagnia di Gesù*, Paray-le-Monial, 5 кастрычніка 1986.

[148] *Conferenze ai Preti della Missione*, 132 (13 жніўня 1655), *"La povertà"*: Св. Вінцэнт дэ Поль, *Opere,* vol. 10, Roma 2008, 208.

[149] *Conferenze alle Figlie della Carità*, 89 (9 снежня 1657), "*Mortificazione, corrispondenza, pasti, uscite"* (*Regole comuni*, artt. 24-27): цыт. твор, vol. 9, 807.

[150] S. Daniele Comboni, *Scritti,* 3324: *Daniele Comboni, Gli scritti,* Bologna 1991, 998.

[151] Пар. *Гамілія падчас кананізацыі*, 18 мая 2003: *L'Osservatore Romano*, 19-20 мая 2003, 6.

[152] Энц. *Dives in misericordia* (30 лістапада 1980), 13: AAS 72 (1980), 1219.

[153] Катэхеза, 20 чэрвеня 1979: *L'Osservatore Romano*, 22 чэрвеня 1979, p. 1.

[154] Missionari Comboniani del Cuore di Gesù, *Regola di Vita, Costituzioni e Direttorio Generale*, Roma 1988, 3.

[155] Religiose del Sacro Cuore di Gesù (Società del Sacro Cuore), *Costituzioni del 1982*, 7.

[156] Энц. *Miserentissimus Redemptor* (8 мая 1928): AAS 20 (1928), 174.

[157] Калі практыкуецца цнота веры, скіраваная да Хрыста, душа мае доступ не толькі да ідэі, якую трэба памятаць, але і да рэальнасці Яго боскага жыцця (Пар. S. Tommaso d'Aquino, *Summa Theologiæ*, II-II, q. 1, a. 2, ad 2; q. 4, a. 1).

[158] Пій XI, Энц. *Miserentissimus Redemptor* (8 мая 1928): AAS 20 (1928), 174.

[159] *Гамілія падчас св. Імшы Хрызма*, 28 сакавіка 2024: *L'Osservatore Romano*, 28 сакавіка 2024, p. 2.

[160] Пар. Св. Ігнацый Лаёла, *Esercizi Spirituali*, 203, Roma 1984, 160.

[161] *Гамілія падчас св. Імшы Хрызма*, 28 сакавіка 2024: *L'Osservatore Romano*, 28 сакавіка 2024, p. 2.

[162] Св. Маргарыта Марыя Алякок, *Autobiografia,* n. 55, Roma 1983, 134.

[163]Той жа, *Lettera 133,* 10: *Scritti autobiografici,* Roma 1984, 182-183.

[164] Той жа, *Autobiografia,* n. 92, цыт. твор, 180.

[165] Энц. *Annum Sacrum* (25 мая 1899): ASS 31 (1898-99), 649.

[166] Giuliano, *Ep. XLIX ad Arsacium Pontificem Galatiae*, Mainz 1828, 90-91.

[167] *Тамсама*.

[168] Дыкастэрыя Веравучэння, Дэкл. *Dignitas infinita* (2 красавіка 2024), 19: *L'Osservatore Romano*, 8 красавіка 2024.

[169] Пар. Бэнэдыкт XVI, *Lettera al Preposito Generale della Compagnia di Gesù in occasione del 50° anniversario dell'Enciclica Haurietis Aquas* (15 мая 2006): AAS 98 (2006), 461.

[170] *In Num. homil.* 12, 1: PG 12, 657.

[171] *Epist. 29*, 24: PL 16, 1060.

[172] *Adv. Arium* 1, 8: PL 8, 1044.

[173] *Tract. in Joannem* 32, 4: PL 35, 1643.

[174] *In Ev. S. Joannis*, cap. VII, lectio 5.

[175] Пій XII, Энц. *Haurietis Aquas* (15 мая 1956), II: AAS 48 (1956), 321.

[176] Св. Ян Павел II, Энц. *Redemptoris Mater* (25 сакавіка 1987), 38: AAS 79 (1987), 411.

[177] Другі Ватыканскі Сабор, Дагм. канст. *Lumen gentium*, 62.

[178] *Тамсама*, 60.

[179] *Sermones super Cant.*, XX, 4: PL 183, 869.

[180] *Introduzione alla vita devota*, p. III, c. XXXV: *Opere complete di Francesco di Sales,* vol. 3: *Filotea. Introduzione alla vita devota*, Roma 2009, 220-221.

[181] *Sermone per la XVII Domenica dopo Pentecoste.*

[182] *Gesù, la sua Passione, Ritiro fatto a Nazaret*, 5-15 лістапада 1987: Шарль дэ Фуко, *La vita nascosta. Ritiri in Terra Santa (1897-1900)*, Roma 1974, 72.

[183] Пасля 19 сакавіка 1902 года ўсе яго лісты маюць загаловак *Jesus Caritas*, аддзеленымі сэрцам, увенчаным крыжам.

[184] *Lettera a Don Huvelin*, 15 ліпеня 1904: *Opere spirituali*, Roma 1983, 633.

[185] *Lettera a Dom Martin*, 25 студзеня 1903, Шарль дэ Фуко, *«Cette chère dernière place». Lettres à mes frères de la Trappe*, Paris 2012, 311.

[186] Цытата з René Voillaume, *Les fraternités du Père de Foucauld*, Paris, 1946, 173.

[187] *Meditazioni dei santi Vangeli sui passi relativi a quindici virtù*, Nazaret 1897-1898, *Carità* 77 ( Mt 20,28): Шарль дэ Фуко, *Meditazioni sui passi dei vangeli relativi a Dio solo, fede, speranza, carità (1897-1898)*, Roma 1973, 325.

[188] *Тамсама*, *Carità* 90 ( Mt 27,30): *Op.* cit., 338.

[189] H. Huvelin, *Quelques directeurs d’âmes au XVII siècle*, Paris 1911, 97.

[190] Пар. *Conferenze alle Figlie della Carità*, 85 (11 лістапада 1657), *“Servizio ai malati, cura della propria salute”* (*Regole comuni,* artt. 12-16): San Vincenzo de’ Paoli, *Opere,* vol. 9, Roma

2008, 757.

[191] *Costituzioni e Statuti della Congregazione della Missione*, Roma 1984, 110.

[192] *Lettera al Preposito Generale della Compagnia di Gesù* (Paray-le-Monial, 5 кастрычніка 1986): *L'Osservatore Romano*, 6 кастрычніка 1986, 7.

[193] Св. Ян Павел II, Ап. адг. *Reconciliatio et Paenitentia* (2 снежня 1984), 16: AAS 77 (1985), 215.

[194] Пар. той жа, Энц. *Sollicitudo rei socialis* (30 снежня 1987), 36: AAS 80 (1988), 561-562.

[195] Той жа, Энц. *Centesimus annus* (1 мая 1991), 41: AAS 83 (1991), 844-845.

[196] Пар. *Catechismo della Chiesa Cattolica*, n. 1888.

[197] Пар. Катэхеза, 8 чэрвеня 1994, 2: *L'Osservatore Romano,* 9 чэрвеня 1994,  5.

[198] *Discorso ai partecipanti al colloquio internazionale "Réparer l'irréparable", nel 350° delle apparizioni di Gesù a Paray-le-Monial*, 4 мая 2024: *L'Osservatore Romano,* 4 мая 2024, 12.

[199] *Тамсама*.

[200] *Гамілія на ранішняй св. Імшы ў Доме св. Марты,* 6 сакавіка 2018: *L'Osservatore Romano*, 5-6 сакавіка 2018, 8.

[201] *Discorso ai partecipanti al Colloquio internazionale "Réparer l´irréparable", nel 350° anniversario delle apparizioni di Gesù a Paray-le-Monial*, 4 мая 2024: *L'Osservatore Romano*, 4 мая 2024, 12.

[202] *Гамілія падчас св. Імшы Хрызма*, 28 сакавіка 2024: *L'Osservatore Romano*, 28 сакавіка 2024, 2.

[203] *Тамсама*.

[204] *Тамсама*.

[205] Энц. *Laudato si'* (24 мая 2015).

[206] Пар. *Catechismo della Chiesa Cattolica*, n. 1085.

[207] *Тамсама*, n. 268.

[208] *Autobiografia*, n. 53, Roma 1983, 131.

[209] Св. Тэрэза ад Дзіцятка Езуса, *Ms A, 84r°: Opere complete*, Roma 1997, 209-210.

[210] *Тамсама*: цыт. твор, 210.

[211] *Тамсама*.

[212] Той жа, *Ms A, 83v°:* цыт. твор, 209; Пар. *Lettera 226 a padre Adolfo Roulland*, 9 мая 1897: *Op*. cit., 572.

[213] Той жа, *Offerta di me stessa come Vittima d'Olocausto all'Amore Misericordioso del Buon Dio, 2r°-2v°: Op*. cit., 943.

[214] Той жа, *Ms B, 3v°:* цыт. твор, 223.

[215] Той жа, *Lettera 186, a Leonia*, 11 красавіка 1896: цыт. твор, 521.

[216] Той жа. *Lettera 258, al Reverendo Maurice Bellière*, 18 ліпеня 1897, 2r°: *Op*. cit., 598.

[217] Пар. Пій XI, Энц. *Miserentissimus Redemptor* (8 мая 1928): AAS 20 (1928), 169.

[218] *Тамсама*.

[219] Св. Ян Павел II, Катэхеза, 20 чэрвеня 1979: *L'Osservatore Romano*, 22 чэрвеня 1979, 1.

[220] *Гамілія на ранішняй св. Імшы ў Доме св. Марты*, 27 чэрвеня 2014: *L'Osservatore Romano*, 28 чэрвеня 2014, 8.

[221] *Messaggio nel centenario della consacrazione del genere umano al Cuore divino di Gesù*, Varsavia, 11 чэрвеня 1999, *Solennità del Sacro Cuore di Gesù: L'Osservatore Romano*, 12 чэрвеня 1999, 5.

[222] *Тамсама*.

[223] *Lettera all'Arcivescovo di Lione in occasione del pellegrinaggio a Paray-le-Monial, per il centenario della consacrazione del genere umano al Cuore divino di Gesù,* 4 чэрвеня 1999: *L'Osservatore Romano,* 12 чэрвеня 1999, 4.

[224] *Conferenze ai Preti della Missione*, 135 (22 жніўня 1655), *"Ripetizione dell'Orazione": San Vincenzo de' Paoli, Opere*, vol. 10, Roma 2008, 237-238.

[225] Ап. ліст *Diserti interpretes* (25 мая 1965), 4: *Enchiridion della Vita Consacrata,* Bologna-Milano 2001, n. 3809.

[226] *Vita Nova*, XIX, 5-6:*“Я заяўляю, што, калі думаю пра яе каштоўнасць, каханне, такое салодкае, прымушае мяне адчуваць, што, калі б мая мужнасць не падвяла мяне, я б выступіў і прымусіў усіх закахацца”.*

[227] *Ms A, 45v°: Opere complete*, Roma 1997, 146.

Copyright © Dicastero per la Comunicazione - Libreria Editrice Vaticana